# ДЗЕЛЯ МІРУ І ДАБРА



**ПАВАЖАНЫЯ СУАЙЧЫННІКІ!**

Ад усёй душы віншую вас з 70-й гадавінай Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

У гэты свяшчэнны дзень мы напоўнены пачуццём асаблівай удзячнасці да воінаў-вызваліцеляў і працаўнікоў тылу, якія адстаялі свабоду і незалежнасць нашай Радзімы ў жорсткай барацьбе з нацызмам. Свята 9 мая непарыўна звязана са слаўным пакаленнем пераможцаў, якія, не шкадуючы свайго жыцця, выратавалі свет ад карычневай чумы, абаранілі Айчыну, а пасля самааддана паднялі краіну з руін і попелу. Подзвіг савецкага народа на вякі застанецца ў памяці ўсяго чалавецтва.

Сёння мы таксама смуткуем аб бязмерных ахвярах вайны. Нас аб'ядноўвае горыч страт, што закранулі практычна кожную сям'ю. За Вялікую Перамогу заплачана мільёнамі жыццяў, бясконцымі нягодамі і стратамі. Беларусы заўсёды будуць з удзячнасцю ўспамінаць тых, хто прайшоў суровыя выпрабаванні, змагаючыся з фашызмам на фронце і ў партызанскіх атрадах у імя міру і дабра.

Бяспрыкладны гераізм, праяўлены старэйшым пакаленнем у гады ваеннага ліхалецця, будзе і надалей служыць маральным арыенцірам для нашай моладзі. Гэта Перамога дала нам магчымасць спакойна жыць і працаваць дзеля роднай Айчыны.

Светлая памяць тым, хто не дажыў да гэтага светлага дня і загінуў на палях баёў. Нізкі паклон ветэранам за вашу стойкасць, мужнасць і гераізм у барацьбе з фашызмам.

Жадаю ўсім моцнага здароўя, дабрабыту і доўгіх гадоў жыцця.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# Такая Перамога ёсць не ў кожнага народа


Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

8 МАЯ 2015 г. ПЯТНІЦА № 85 (27943) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**ВЯСНА. МАЙ. ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ. 70 ГАДОЎ, ЯК НЯМА ВАЙНЫ.** Свята, якое не мае ўзросту, якое заўсёды актуальнае і заўсёды мае адзінае і зразумелае прачытанне на нашай зямлі. Так ёсць сёння. Так будзе заўтра. Так павінна быць заўжды. Каб не паўтарылася. Каб той жах так і застаўся гісторыяй.

Так будзе, пакуль будуць жыць Памяць, Павага і Удзячнасць пакаленню Пераможцаў. Што ў Беларусі гэта менавіта так, ведае ўвесь свет. Замежныя госці здалёку і зблізку, прылятаючы ў Нацыянальны аэрапорт «Мінск» і накіроўваючыся па трасе ў нашу сталіцу, адразу бачаць таму сведчанне — велічны Курган Славы, які сёлета да юбілею Вялікай Перамогі з дапамогай Федэрацыі прафсаюзаў рэканструявалі. Цяпер адзін з сімвалаў нашай краіны сапраўды ўражвае прыездных грандыёзнасцю, мазаікай, арыгінальнай падсветкай.

А мы на іх здзіўленне проста адкажам: «А як жа інакш?» Гэта наша гарантыя, што на зямлю ў маі будуць сыпацца толькі цёплыя дажджы і пялёсткі вясновых кветак.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 08.05.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 14260,00 | ▲ |
| Еўра | 16220,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 284,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 695,10 | ▲ |


ISSN 1990 - 763X

# НЕАСПРЭЧНАЯ ІСЦІНА НАЗАЎЖДЫ

## У нашай гісторыі не было больш яркай і вялікай падзеі, чым перамога над фашызмам

**Пра гэта заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на ўрачыстым сходзе, прысвечаным 70-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.**


Фота БЕЛТА.

«Увесь свет у неаплатным даўгу перад подзвігам савецкага народа, які заплаціў за Перамогу неймаверна высокую цану — жыцці трыццаці мільёнаў чалавек. Тых, хто загінуў або памёр ад ран, хто закатаваны ў фашысцкіх засценках і лагерах, хто зажыва спалены, як у Хатыні, або расстраляны карнікамі, хто памёр ад голаду і холаду ў блакадным Ленінградзе або ад непасільнай працы ў глыбокім тыле», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт нагадаў, што дзякуючы мужнасці і гераізму савецкага салдата пад еўрапейскіх народаў завяршылася Другая сусветная вайна, якая доўжылася амаль шэсць гадоў, краіны Еўропы атрымалі свабоду і незалежнасць, магчымасць самастойна вызначаць свой шлях развіцця.

Аляксандр Лукашэнка аддаў даніну павагі і выказаў словы ўдзячнасці ў адрас тых, хто ваяваў на баку саюзнікаў — краін антыгітлераўскай кааліцыі, актывістаў антыфашысцкага Супраціўлення. «Яны ўнеслі свой уклад у барацьбу з фашызмам. Другі фронт, адкрыты ў 1944 годзе, сур'ёзна дапамог дабіць ворага ў яго логаве. Але гістарычная праўда ў тым, што вядучую і асноўную ролю ў агульнай антыфашысцкай барацьбе адыграў Савецкі Саюз. Працягласць савецка-германскага фронту ў чатыры разы пераўзыходзіла ўсе разам узятыя заходнія франты», — адзначыў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы таксама падкрэсліў, што Беларусь першая прыняла на сябе страшны ўдар ворага, але не здалася, а стала жывым шчытом на шляху агрэсара. Яшчэ да адкрыцця Другога фронту пад кантролем партызан ужо знаходзілася 60% захопленай фашыстамі тэрыторыі Беларусі, а амаль 38 тысяч квадратных кіламетраў былі цалкам свабоднымі ад праціўніка, што можна па памерах параўнаць з тэрыторыяй Нідэрландаў або Бельгіі. У той жа час у радах Чырвонай Арміі змагалася больш за 1,3 млн ураджэнцаў Беларусі. Сярод іх — больш за дзвесце генералаў і адміралаў. Высокага звання Героя Савецкага Саюза ўдастоены чатыры з паловай сотні суайчыннікаў.

«Мы ніколі не здрадзім памяці мільёнаў людзей — салдат і мірных жыхароў, якія загінулі ад рук нацыстаў. Ніхто не забыты і нішто не забыта! — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Мы не забыліся, што ў Беларусі загінуў кожны трэці. Была знішчана большая частка нашых нацыянальных багаццяў, разбурана больш за 200 гарадоў і больш за 9 тысяч вёсак. На тэрыторыі Беларусі фашысты стварылі 260 лагераў смерці і 170 гета. Толькі адзін размешчаны пад Мінскам канцлагер Трасцянец забраў жыцці больш як 200 тысяч савецкіх людзей і грамадзян Еўропы».

Паводле слоў Прэзідэнта, святкаванне 70-годдзя Перамогі — гэта момант ісціны. «У гэтыя дні, аглядаючыся на мінулае, мы ацэньваем і сучаснае. Перамога патрабуе ад нас адзінства, з'яднанасці наследнікаў савецкага народа. Але праз дзесяцігоддзі сярод нас, кіраўнікоў і палітыкаў, з'явіліся так званыя бухгалтары, якія мараць падзяліць Перамогу па ўдзельнай вазе нацыянальнасцей. Ужо нават спрачаюцца: які працэнт у Перамозе рускай, украінскай, казахскай, грузінскай, узбекскай крыві», — канстатаваў беларускі лідар.

«Гэта інсінуацыі, і адказ на іх просты: нацызм знішчылі не рускія і беларусы, не ўкраінцы і грузіны, не казахі і ўзбекі. Вялікую Перамогу падарыў нам вялікі савецкі народ!» — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Паміраючы ў Брэсцкай крэпасці і Ленінградзе, змагаючыся пад Масквой, Сталінградам, на Курскай дузе і Дняпры, вызваляючы Беларусь і Заходнюю Еўропу, штурмуючы Берлін, савецкія салдаты не думалі пра нацыянальнасць. «Яны былі адзіныя, узнімаючы Сцяг Перамогі. Значыць, і Перамога была адзіная і будзе заўсёды непадзельнай!» — упэўнены кіраўнік дзяржавы.

«Мы заўсёды павінны помніць: Перамога — гэта святое! І дакранацца да яе можна толькі чыстымі рукамі і з чыстай душой, — падкрэсліў беларускі лідар. — Гісторыю трэба шанаваць, паважаць, рабіць высновы, атрымліваць урокі. Яе нельга прыстасоўваць да сучаснасці з мэтай рэйтынгаў, апраўдання памылак і праліказ ў палітыцы».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў ліхія 90-я гады мінулага стагоддзя на постсавецкай прасторы значна аслабілі ўвагу да Перамогі і перамоўжцаў, дазволілі аддаць забыццю подзвіг савецкага народа. «Адны гэта рабілі з прычыны «страты памяці і разважлівасці». Іншыя, каб не пакрыўдзіць сучасную Германію, не агучвалі такія паняцці, як нацызм, фашызм і генацыд, што прысутнічалі ў гады Другой сусветнай вайны», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«У нашых краінах, якія ўтварыліся на папялішчы Савецкага Саюза, з'явілася палітычная шпана, якая вырашыла перапісаць старонкі гісторыі і Вялікай Айчыннай вайны пад дыктоўку заходніх рэвізіяністаў і мясцовых нацыяналістаў», — заявіў Прэзідэнт Беларусі. Сучасную моладзь спрабуюць пераканаць у тым, што не фашысты развязалі тую страшную вайну, а Савецкі Саюз, называюць герояў Супраціўлення і партызан бандытамі, а памагатых нацыстаў і паліцаяў — патрыётамі. «Гэтыя так званыя патрыёты палілі людзей і іх дамы цэлымі вёскамі і гарадамі, гвалтавалі жанчын, забівалі дзяцей і старых», — заўважыў беларускі лідар.

«Ніхто не мае права забывацца на суровую праўду той вайны! Тым больш — чарніць светлае імя воінавызваліцеля і вялікія сімвалы, глуміцца з помнікаў і воінскіх пахаванняў. Гісторыю трэба ведаць, а яе ўрокі — памятаць. Хто гэтага не робіць, той асуджае сябе на паўтарэнне самых трагічных памылак», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Гаворачы пра Беларусь, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў краіне нікому не дазволілі фальсіфікаваць гісторыю Вялікай Айчыннай вайны. «Мы з хваляваннем і беражліва ставімся да яе, таму што гэтая вайна стала для беларускага народа небывалай праверкай на трываласць. Нельга забывацца, што тыя, хто чэрніць Вялікую Перамогу, спрабуюць адабраць у нас пачуццё нацыянальнага гонару, чалавечую годнасць і ўпэўненасць у будучыні», — сказаў Прэзідэнт.

«Праз 70 гадоў пасля Другой сусветнай вайны ў Еўропе зноў запахла гарам. І самае жудаснае, аб чым і думаць не маглі пераможцы, а таксама мільёны забітых, закатаваных у фашысцкіх засценках, спаленых у канцлагерах, што мы, іх наследнікі, будзем страляць адзін у аднаго, брат пойдзе на брата і будзе яго знішчаць! Але гэта здарылася, здарылася на зямлі, палітай крывёю пераможцаў, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Жудасны «падарунак» загінулым і жывым! Страшны боль для ветэранаў!»

«Беларусь ужо нямала зрабіла для таго, каб на ўкраінскую зямлю прыйшоў мір. І мы гатовы зрабіць для гэтага яшчэ больш — усё, што спатрэбіцца, каб спыніць гэтую вайну. Калі мы, славяне, самі не дамовімся, самі не вырашым, што нам рабіць, то ніхто іншы нам не дапаможа», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў Прэзідэнта, тысячагадовая гісторыя навечна з'яднала тры родныя народы: беларусаў, рускіх і ўкраінцаў. «Трагічныя падзеі ў нашых братоў — гэта наш боль», — падкрэсліў беларускі лідар.

Гаворачы пра Дзень Перамогі, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што правядзенне парадаў і іншых святочных мерапрыемстваў — добрая традыцыя і ветэраны гэта цэняць. «Але, па вялікім рахунку, мы аказаліся дрэннымі наследнікамі тых, хто перамог у той вайне. Мы не выратавалі, не ўтрымалі тую краіну, якую яны абаранялі і, больш за тое, развязалі на гэтай славянскай зямлі недаравальную нам вайну. І чым раней мы гэта ўсвядомім і зробім усё неабходнае, каб яе спыніць і пакаяцца, пакуль яшчэ жывыя не толькі ветэраны, але і ўдзельнікі вайны, тым лепш будзе для нашага пакалення», — сказаў Прэзідэнт.

«Для нашага народа галоўнымі нацыянальнымі каштоўнасцямі з'яўляюцца мір, незалежнасць, грамадская згода і стабільнасць. У нас няма ворагаў. Мы ніколі нікому не пагражалі і ніколі не будзем гэтага рабіць. Але сваю незалежнасць, мір на нашай зямлі мы гатовы абараняць і адстойваць у любых умовах. У Беларусі хопіць палітычнай волі, сіл і сродкаў, каб рашуча спыніць любыя спробы ўмяшання ў яе ўнутраныя справы», — заявіў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка са шкадаваннем канстатаваў, што некаторыя краіны і сёння дазваляюць сабе ўмешвацца ва ўнутраныя справы суверэнных дзяржаў, а палітыка націску і эканамічнага шантажу даўно стала штодзённасцю. «Больш за тое, уладныя людзі падбухторваюць да ваенных канфліктаў у розных кропках зямнога шара. Зброя становіцца аргументам у адстойванні эканамічных інтарэсаў асобных звышдзяржаў. Узрастае іх ваенная актыўнасць, праводзяцца манёўры і вучэнні, нарошчваюцца ўзбраенні, назапашваецца ваенны патэнцыял каля нашых граніц», — адзначыў Прэзідэнт. «Усё гэта не садзейнічае ўмацаванню міру, выклікае новыя пагрозы і дэстабілізуе становішча», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў Беларусі паважаюць права кожнай дзяржавы выбіраць уласны шлях развіцця і маюць права чакаць у адказ павагі да шляху, які выбраў беларускі народ.

«У нашай гісторыі не было больш яркай і вялікай падзеі, чым перамога над фашызмам. І пакуль людзі помняць гэта і ганарацца подзвігам пакалення, якое адстаяла незалежнасць нашай Радзімы, выратавала свет ад фашызму, мы ў бяспецы», — рэзюмаваў беларускі лідар.

**Паводле БЕЛТА.**

**10 мая — Дзень Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь**

# ДУХОЎНЫЯ І МАРАЛЬНЫЯ СІМВАЛЫ

**Дарагія суайчыннікі!**

Сардэчна віншую вас з Днём Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь.

Нашы нацыянальныя сімвалы ўвасабляюць суверэнітэт краіны, яе найбагацейшую гісторыю і традыцыі. Адлюстроўваюць духоўныя і маральныя рысы беларускага народа.

Вечная каштоўнасць Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга праяўляюцца ў самыя адказныя моманты жыцця грамадства, аб'ядноўваючы беларусаў, забяспечваючы сувязь і пераемнасць пакаленняў.

Ставячыся з пашанай да дзяржаўнай сімволікі, мы аддаём даніну павагі неацэнным заваяванням нашых продкаў, якія на палях бітваў і ў мірнай працы адстаялі права годна жыць і працаваць на сваёй зямлі.

У гэты знамянальны дзень жадаю вам моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту і поспехаў у прафесійнай дзейнасці на карысць роднай Беларусі.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# Кіраўнікам сілавых структур прысвоены новыя званні

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 7 мая прыняў рашэнне аб прысваенні чарговых воінскіх і спецыяльных званняў кіраўнікам сілавых ведамстваў, паведаміла прэс-служба кіраўніка дзяржавы.**

Званні «Генерал-лейтэнант» прысвоены міністру абароны Андрэю Раўкову і старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Валерыю Вакульчыку; «Генерал-лейтэнант міліцыі» — міністру ўнутраных спраў Ігару Шуневічу; «Генерал-лейтэнант унутранай службы» — міністру па надзвычайных сітуацыях Уладзіміру Вашчанку; «Дзяржаўны саветнік юстыцыі першага класа» — Генеральнаму пракурору Рэспублікі Беларусь Аляксандру Канюку.

# Нефармальны саміт СНД у Маскве

**Нефармальны саміт лідараў краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў, якія ўдзельнічаюць ва ўрачыстасцях з нагоды юбілею Перамогі, пройдзе 8 мая ў Маскве па ініцыятыве прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.**

Свой удзел у мерапрыемстве пацвердзілі прэзідэнты Беларусі Аляксандр Лукашэнка, Казахстана Нурсултан Назарбаеў, Кыргызстана Алмазбек Атамбаеў і Таджыкістана Эмамалі Рахмон.

Лідары падвядуць вынікі маштабнай сумеснай работы па рэалізацыі плана па падрыхтоўцы і святкаванні 70-й гадавіны Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, зацверджанага кіраўнікамі дзяржаў СНД 14 лютага 2014 года. Таксама будзе абмяркоўвацца рэалізацыя мер, намечаных у рамках абвешчанага ў 2015 годзе ў Садружнасці Года ветэранаў.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 8 мая прыме ўдзел у пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета.

Кіраўнік нашай краіны таксама ўскладзе вянок да магілы Невядомага салдата ля сцен Крамля.

# Урачыстыя падарункі

## Прэзідэнт уручыў высокія дзяржаўныя ўзнагароды заслужаным людзям краіны

**Уручэнне прымеркавана да знамянальнай даты — 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, гэта надае цырымоніі асаблівую ўрачыстасць і глыбокі сэнс. «Выключныя дасягненні нашых грамадзян, поспехі дзяржавы і само існаванне суверэннай Беларусі былі б немагчымы без гэтай вялікай і лёсавызначальнай падзеі», — падкрэсліў Прэзідэнт.**

Дзяржаўных узнагарод былі ўдастоены прадстаўнікі ветэранскіх арганізацый з усёй рэспублікі. «Некаторыя з вас самі прайшлі вогненнымі вёрстамі вайны або аддалі многія гады актыўнай працоўнай дзейнасці мірнаму будаўніцтву роднай Беларусі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Вы і сёння ў страі. Немагчыма пераацаніць ваш уклад у патрыятычнае выхаванне грамадзян, перш за ўсё нашай моладзі. Бо на працягу многіх гадоў вы дзеліцеся сваім бясцэнным жыццёвым вопытам з моладдзю. На вашым прыкладзе выхавана не адно пакаленне беларусаў».

Дзяржаўных узнагарод удастоена вялікая група ваеннаслужачых. «Дзень Перамогі — асаблівае свята для ваенных. Тыя, хто выбірае кар'еру ў радах Узброеных Сіл, прадаўжаючы традыцыі салдат-пераможцаў Вялікай Айчыннай вайны», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка і выказаў ім удзячнасць за высокі прафесіяналізм.

Дзяржаўнымі ўзнагародамі сёння таксама адзначаны прадстаўнікі іншых сфер дзейнасці.

«Беларусы змаглі выстаяць і перамагчы толькі таму, што верылі ў Перамогу і жылі марай аб мірнай і шчаслівай будучыні сваёй Радзімы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён заклікаў наследнікаў і нашчадкаў пераможцаў ажыццявіць іх мару — умацаваць Беларусь, зрабіць яе больш моцнай, утульнай і прыгожай.

Напрыканцы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў усіх узнагароджаных з надыходзячым святам, пажадаўшы ім шчасця і дабрабыту.

■ Медыяпрастора

# НА СУСВЕТНЫМ ІНФАРМАЦЫЙНЫМ ПОЛІ

**Учора ў сталіцы завяршылася XIX Міжнародная спецыялізаваная выстава «СМІ ў Беларусі». Найлепшыя прадстаўнікі айчыннай медыясферы змаглі сябе на ёй прадставіць, а самыя-самыя — атрымаць узнагароды.**

Учора, на закрыцці выставы, якое было прымеркавана да прафесійнага свята супрацоўнікаў тэлебачання і радыё, **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ** уручыла некаторым з іх знакі «Выдатнік тэлебачання і радыё». Сярод першых, хто атрымаў такую ўзнагароду, — загадчык кафедры тэлебачання і радыёвяшчання Інстытута журналістыкі БДУ Вячаслаў Булацкі, першы намеснік старшыні Белтэлерадыёкампаніі Аляксандр Саламаха і іншыя.

— Мы працуем у адкрытай інфармацыйнай прасторы. Беларусь, можна сказаць, прымае ў сябе ўвесь свет. Таму важна разумець, што трэба рабіць, каб умацоўваць нацыянальную інфармпрастору, — адзначыла Лілія Ананіч. — На беларускім медыйным полі прысутнічаюць і замежныя тэлеканалы, таму хацелася б усвядоміць, наколькі яны запатрабаваны і якім чынам гэта можа паўплываць на нацыянальны кантэнт. Важна, выкарыстоўваючы кантакты, магчымасці, прывабліваць замежныя тэлеканалы для таго, каб партнёры рабіліся партнёрамі па развіцці нацыянальнай інфармацыйнай прасторы. Акрамя таго, з іх дапамогай трэба прасоўваць інфармацыю пра Беларусь у сусветны кантэнт.

Лілія Ананіч дадала, што згодна з новым законам аб СМІ адбудуцца змяненні па распаўсюджванні замежных тэлепраграм у Беларусі. Гэта ўводзіцца для таго, каб устанавіць на тэлевізійным рынку зразумелыя правілы функцыянавання і напаўнення нацыянальнай інфармацыйнай прасторы.

Увогуле ж, па стане на 1 мая 2015 года ў Беларусі зарэгістравана 1573 друкаваныя СМІ, з іх 426, або 27%, — дзяржаўныя. Выходзіць 101 тэлепраграма: 41 дзяржаўнай формы ўласнасці, астатнія — прыватнай. Са 172 радыёпраграм на долю дзяржаўных прыпадае 148. У краіне працуе 9 інфармацыйных агенцтваў, з іх 2 дзяржаўныя і 7 — прыватнай формы ўласнасці.

Акрамя таго, на тэрыторыі краіны распаўсюджваецца звыш 4 тысяч замежных друкаваных СМІ, больш за 80% з якіх — расійскія. Таксама ў Беларусі прысутнічаюць газеты і часопісы з Украіны, ЗША, Вялікабрытаніі, Казахстана, Германіі, Францыі, Італіі, Нідэрландаў, Літвы, Латвіі, Польшчы, Фінляндыі. Выдадзены дазволы на распаўсюджванне на тэрыторыі Беларусі 193 замежных тэлепраграм, 104 з іх былі прадстаўлены ў межах «СМІ ў Беларусі».

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

## Мікалай ЧУРЫЛАЎ:

# «Вы знаходзіцеся бліжэй да ісціны»


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Адзін з гасцей выставы «СМІ ў Беларусі» — гэта доктар сацыялагічных навук Мікалай Чурылаў з Украіны. На радзіме ён з'яўляецца генеральным дырэктарам кампаній «TNS-Украина» і Цэнтра сацыяльных і маркетынгавых даследаванняў. Мяркуецца, што пад яго кіраўніцтвам у нашай краіне сёлета пройдуць передвыбарныя сацыялагічныя даследаванні. Карэспандэнт «Звязды» задала спецыялісту некалькі пытанняў.**

***— Замежныя калегі-журналісты часта называюць беларускае палітычнае жыццё спакойным, без скандалаў, боек, якія дазволілі б «зрабіць карцінку»...***

— Бойка ніколі не была сімвалам дэмакратызму. Наадварот, спакой у палітыцы (калі адсутнічае падман і абвінавачванні, калі няма «мардабою» на экране) — вось паказчык дэмакратычнасці. Тое, што адбываецца ў палітычнай сферы маёй краіны, асабіста мне, як чалавеку і як сацыёлагу, не імпануе.

***— Чаму менавіта вам, украінскай кампаніі, плануецца даверыць правядзенне перадвыбарных даследаванняў у Беларусі?***

— Мы маем вялікі вопыт: з 1997 года, першымі на тэрыторыі былога Савецкага Саюза, сталі праводзіць даследаванні экзітполаў (апытанне выбаршчыкаў, пасля выхаду з участкаў галасавання. — **Аўт.**). Правялі больш за 40 экзіт-полаў не толькі на Украіне, але і ў Беларусі (у 2010 годзе), Грузіі, Малдове. Наша кампанія досыць аўтарытэтная, нас запрашаюць, бо ведаюць, што мы працуем аб'ектыўна і чыста.

***— Што ўяўляюць з сябе гэтыя даследаванні?***

— Яны будуць накіраваны на выбарчую кампанію, але датычыцца шырокага спектра пытанняў. Будзем ладзіць масавае апытанне, выяўляць сацыяльна-псіхалагічны стан насельніцтва, рэакцыю на тыя або іншыя дзеянні кіраўніцтва, ацэньваць агульную сітуацыю ў краіне. Мы пастараемся спрагназаваць вынік прэзідэнцкіх выбараў, якія маюць адбыцца восенню. У канцы мая — пачатку чэрвеня плануем правесці першае даследаванне, у верасні — другое, у лістападзе — трэцяе. І літаральна за тыдзень да выбараў — яшчэ адно. А таксама экзіт-пол у дзень выбараў.

***— Як уплывае інфармацыя, якая трапляе ў медыя, на меркаванні выбаршчыкаў?***

— Той, хто кажа, што некаторую інфармацыю лепш не ведаць, не надта разумее, што ён кажа. Любыя звесткі, станоўчыя ці адмоўныя, з'яўляюцца добрай з'явай. Бо яны дазваляюць чалавеку арыентавацца і нармальна адчуваць сябе ў гэтым свеце. Людзей не трэба карміць толькі станоўчымі фактамі, яны павінны ведаць усе нюансы.

***— Як вы ацэньваеце працу беларускіх СМІ?***

— Калі я параўноўваю навіны аб падзеях у маёй краіне, якія ідуць на расійскіх тэлеканалах і на ўкраінскіх, бачу, што гэта, як кажуць у Адэсе, дзве вялікія розніцы. Аднак ісціна павінна знаходзіцца дзесьці пасярэдзіне. Калі я пачынаю ўважліва адсочваць беларускія тэле- і радыёперадачы, бачу, што вы знаходзіцеся хаця і не ў самай сярэдзіне, але бліжэй да яе, чым украінцы і расіяне. Вы працуеце досыць прафесійна, аб'ектыўна. Верагодна, арыентуецеся на свайго лідара, Прэзідэнта Лукашэнку. У апошні час мне вельмі імпануе яго пазіцыя. Зразумела, у такой сітуацыі немагчыма быць зусім незалежным, але ён праяўляе максімум тактоўнасці і вытрымкі ў адносінах да ўкраінскіх падзей.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

# «ФОТА БЕЛАРУСІ» СТАНЕ ШТОГАДОВЫМ

**Пра гэта паведаміла міністр інфармацыі Беларусі Лілія АНАНІЧ на ўрачыстай цырымоніі ўзнагароджвання пераможцаў новага нацыянальнага конкурсу для фатографаў.**

«Фотаконкурс сёлета першы. Але я вас запэўніваю, што ён стане штогадовым, — адзначыла Лілія Ананіч. — Мы заўсёды на выставе «СМІ ў Беларусі» будзем падводзіць вынікі, узнагароджваць найлепшых. А пасля фотавыстава будзе вандраваць па розных кутках Беларусі і паказваць, што ў нас выдатная краіна, што мы ёй ганарымся і гатовы ўмацоўваць, беражліва захоўваць і перадаваць будучым пакаленням».

У краіне працуе вялікая армія фотажурналістаў, якія шчыруюць у раённых, абласных, рэспубліканскіх СМІ. «Хацелася б, каб мы бачылі гэтых людзей, каб дапамагалі іх прафесійнаму росту, каб мэтры дзяліліся сваім майстэрствам з моладдзю, ствараючы якасны прадукт. Мэта ў нас адна — садзейнічаць развіццю нацыянальнай інфармацыйнай прасторы», — дадала міністр.


Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

**Гран-пры «Фатограф года» атрымаў фотакарэспандэнт газеты «СБ. Беларусь сегодня» Аляксандр Ружачка. Таксама ён пераможца ў намінацыях «Партрэт сучасніка» (партрэт дырэктара Нацыянальнага мастацкага музея Уладзіміра Пракапцова) і «Прэс-фота Беларусі» (здымак «Дзень Перамогі»).**

■ Хакей. Чэмпіянат свету

# БЕЛАРУСЫ АБЫГРАЛІ ЗБОРНУЮ ЗША

Напярэдадні свята Вялікай Перамогі прыемная навіна прыйшла з чэшскай Астравы. Наша хакейная зборная ў бліскучым стылі перайграла каманду ЗША. Беларусы нечакана для ўсіх даволі ўпэўнена разабраліся з амерыканцамі — лік 5:2 на нашу карысць. Шайбы ў нашых забівалі Аляксей Калюжны (двойчы), Артур Гаўрус, Арцём Волкаў і Аляксандр Кітараў. Увогуле, гэта першая перамога на ўзроўні дарослай зборнай беларусаў над амерыканцамі ў гісторыі айчыннага хакея.



Між іншым, зборная ЗША перад гэтым матчам абыграла дзеючых чэмпіёнаў свету расіян (4:2), для аматараў якой, як і саміх хакеістаў, гэта стала непрыемным сюрпрызам. Пасля перамогі над камандай Даніі ў аўторак і чатырох матчаў увогуле зборная Беларусі з дзесяццю ачкамі ўзначаліла групу B.

■ Будзь у курсе!

## ПАСЛЯ САЛЮТА ТРАНСПАРТ ПРАЦУЕ ДА 1.30

**9 мая ў сталіцы ў сувязі з правядзеннем мерапрыемстваў, прысвечаных 70-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, цягам усяго дня будуць уносіцца змяненні ў працу гарадскога пасажырскага транспарту.**

Падчас ускладання вянкоў да манумента на плошчы Перамогі з 7.00 і прыкладна да 10.00 будуць зменены трасы наступных маршрутаў: №№ 100, 115Э, 300Э, 57. А з 7.00 да 8.30 — №№1, 69. Для цягнікоў першай лініі метрапалітэна з 8.30 д 9.30 будзе выключана выкананне прыпынку на станцыі «Плошча Перамогі».

У сувязі з правядзеннем парада войск Мінскага гарнізона і спартыўна-маладзёжнага шэсця «Нашы перамогі — табе, Беларусь!» з праходжаннем тэхнікі па праспекце Машэрава каля абеліска «Мінск — горад-герой» з 8.30 і прыкладна да 13.00 будуць зменены трасы наступных аўтобусных маршрутаў: №№ 1, 69, 119С, 73, 91, 163. Увечары тут жа падчас правядзення святочнага салюта трасы гэтых жа маршрутаў (а яшчэ №№ 29, 44, 136) зноў будуць зменены — прыкладна з 21.30 і да заканчэння мерапрыемства.

9 мая праца шэрагу маршрутаў гарадскога пасажырскага транспарту будзе падоўжана з захаваннем вячэрніх інтэрвалаў руху да 1.30. Гаворка пра аўтобусныя: №№ 1, 9Д, 17, 18, 24, 29, 42, 43Д, 73, 74С, 75, 99, 112С, 115С, 147, 149, 159, 921; тралейбусныя: №№ 6, 16, 20, 25, 27, 29, 37, 40, 53, 60; трамвайныя: №№ 3, 6. Да гэтага ж часу — да 1.30 — будзе працаваць і Мінскі метрапалітэн. Інтэрвал руху цягнікоў на першай і другой лініях у перыяд з 20.00 да 24.00 складзе тры хвіліны, пасля 24.00 — 12 хвілін. У дзяржаўным прадпрыемстве «Мінсктранс» звярнулі ўвагу, што найбліжэйшымі прыпыначнымі пунктамі грамадскага транспарту, размешчанымі ў раёне месцаў правядзення масавых мерапрыемстваў, з'яўляюцца: станцыі метро «Няміга» і «Фрунзенская», «Рэспубліканскі цэнтр тэніса» па праспекце Пераможцаў і вуліцы Сапёраў, «Ціміразева» па аднайменнай вуліцы.

## У РАСКЛАДЗЕ — ДАДАТКОВЫЯ ЦЯГНІКІ

**Больш за 30 дадатковых цягнікоў курсіруюць па Беларускай чыгунцы ў дні майскіх свят.**

У перыяд з 30 красавіка па 11 мая прызначаны дадатковыя цягнікі міжрэгіянальных ліній, якія звязваюць сталіцу з абласнымі цэнтрамі, а таксама з Полацкам і Пінскам. У тым ліку на 8 мая — па маршрутах Мінск — Пінск і Мінск — Гомель — Мінск. Як адзначылі ў прэс-цэнтры, у міжнародных зносінах Беларуская чыгунка таксама дадаткова прызначае цягнікі. Напрыклад №252/209 Брэст — Масква (адпраўленнем з Брэста 9 і 11 мая, з Масквы — 10 і 12 мая адправедна).

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Надвор'е

# УДЗЕНЬ ПАЦЯПЛЕЕ, АДНАК УНАЧЫ ЗАМАРАЗКІ ДА МІНУС 3

## А ў сераду сіноптыкі прагназуюць амаль лета, калі прыгрэе аж да 26-29 цяпла

**Сёння ва ўсходніх раёнах краіны на надвор'е будзе яшчэ ўплываць атмасферны фронт, таму там пройдуць кароткачасовыя дажджы. Пра гэта паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

На астатняй тэрыторыі — без дажджоў. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад плюс 12 градусаў па ўсходзе, да 19 цяпла — у заходніх раёнах краіны. **У Дзень Перамогі, 9 мая, чакаецца павялічэнне атмасфернага ціску і паляпшэнне надвор'я.** Пераважна без ападкаў, толькі ў крайніх усходніх раёнах яшчэ магчымы непрацяглыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы на суботу знізіцца да 2-7 цяпла, па ўсходзе — плюс 9 градусаў, аднак на большай частцы краіны на глебе і месцамі ў паветры магчымы замаразкі ад 0 да мінус 3 градусаў. Удзень чакаецца сонечна і каля 15-20 цяпла, а па паўднёвым захадзе — да плюс 22 градусаў.

Даволі камфортнае надвор'е чакаецца і ў нядзелю, калі ападкаў практычна не будзе, толькі ўдзень на захадзе краіны прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы на нядзелю складзе ад 2 да 7 цяпла, але на глебе і месцамі ў паветры ізноў замаразкі да мінус 3 градусаў. Удзень — 17-23 цяпла.

Ужо ў панядзелак на тэрыторыю краіны завітае чарговы атмасферны фронт з боку Заходняй Еўропы. Таму ўначы на захадзе Беларусі, а ўдзень месцамі чакаюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Уначы на панядзелак будзе 5-12 цяпла і ніякіх замаразкаў. Удзень чакаецца плюс 15-22 градусы.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, ужо бліжэй да сярэдзіны наступнага тыдня з боку Заходняй Еўропы да нас завітае амаль лета. Стане сапраўды сонечна, бо кароткачасовыя дажджы прагназуюцца толькі месцамі. Тэмпература паветра ўначы складзе 5-12 цяпла, удзень у аўторак — плюс 17-22, па Брэсцкай і Гомельскай абласцях — да 23-25 цяпла. А днём у сераду ўвогуле будзе плюс 20-26 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ**



# ВЯРТАННЕ ПАМЯЦІ



**У аграгарадку Дрычын Пухавіцкага раёна ўшанавалі памяць загінулых воінаў Вялікай Айчыннай вайны. У адной магіле тут доўгія гады ляжаць два партызаны і трыццаць дзевяць ваеннапалонных.**

Помнік на брацкай магіле знаходзіцца ў невялікім гаі на краі мястэчка. У пасляваенны час побач з гаем была школа, вучні якой даглядалі месца пахавання. Час ішоў, і мемарыял пакрысе прыйшоў у заняпад.

Рэстаўраваць помнік прапанавала Беларуская натарыяльная палата. «Сродкі былі сабраны і накіраваны натарыусамі краіны для таго, каб акультурыць помнік. Я думаю, што гэта не апошняя наша акцыя — 3 ліпеня мы, магчыма, яшчэ папрацуем над азначаным мемарыялам», — заўважыла **старшыня Натарыяльнай палаты Наталля БАРЫСЕНКА**. Таксама яна адзначыла, што цяпер праводзяцца акцыі па бясплатнай натарыяльнай кансультацыі для ветэранаў.

**Сяргей НІКАНОВІЧ.**
**Фота аўтара.**



# КВЕТКІ — ВЕТЭРАНАМ

**У гэтыя цудоўныя вясновыя дні, залітыя яркім ласкавым сонцам, уся краіна рыхтуецца да вялікага свята — 70-годдзя Перамогі над фашысцкімі захопнікамі. У гарадах і вёсках людзі наводзяць парадак ля помнікаў землякам, якія загінулі на фронце і ў партызанскіх атрадах. Высаджваюць кветкі на брацкіх магілах вайскоўцаў, што вызвалялі іх населеныя пункты. Наведваюць з падарункамі ветэранаў вайны, якіх, на жаль, засталося ўжо зусім нямнога... Гэта яны — галоўныя героі надыходзячага свята, гэта ў іх гонар будуць гучаць песні, маршы, салюты...**

А між іншым, на гарадскіх і вясковых могілках па ўсёй Беларусі ёсць сотні і тысячы магіл удзельнікаў мінулай вайны, якія пайшлі з жыцця трыццаць, сорак, пяцьдзясят гадоў таму... І часта ўжо няма каму даглядаць гэтыя магілы, няма каму прынесці сюды хаця б адну кветачку на свята: жонкі і мужы тых, хто пахаваны тут, таксама пайшлі з жыцця, а дзеці і ўнукі раз'ехаліся па белым свеце... Вось і маюць такія магілы з абеліскам пад чырвонай зорачкай непрыбраны, сірочы выгляд...

Пра гэта падумалі члены сямейнага клуба «Вера. Надзея. Любоў» з вёскі Язна Мёрскага раёна Віцебскай вобласці. Шэсць гадоў існуе ён пры мясцовым Доме культуры, шмат цікавых і карысных спраў на яго рахунку. І вось цяпер актывісткі клуба: Саламея Сіняўская, Ева Астроўская, Галіна Пучкоўская, Ася Берберы — прыйшлі на могілкі вёскі Язна і вёскі Каралеўскія і прыбралі магілы сваіх землякоў — удзельнікаў вайны, тых, да каго ўжо даўно не наведваліся родныя. Вырвалі быллё, сабралі галлё і лісце, пафарбавалі і пачысцілі помнікі, пасадзілі на магілах нарцысы і цюльпаны... Акцыю, якой жанчыны далі назву «Кветкі — ветэранам», ахвотна падтрымалі аднавяскоўцы.

**Па ўсёй Беларусі ёсць сотні і тысячы магіл удзельнікаў мінулай вайны, якія пайшлі з жыцця трыццаць, сорак, пяцьдзясят гадоў таму... І часта ўжо няма каму даглядаць гэтыя магілы, няма каму прынесці сюды хаця б адну кветачку на свята.**

А колькі такіх непрыбраных магіл франтавікоў і партызан яшчэ чакаюць нашай увагі! Добра, каб пра іх успомнілі ў кожнай вёсцы, у кожным райцэнтры. Дзе знайсці інфармацыю пра землякоў, удзельнікаў вайны, пра якіх ужо новае пакаленне вяскоўцаў і не ведае? Там, дзе знайшлі яе язненскія жанчыны — у кнізе «Памяць» свайго раёна...

**Тамара БУНТА.**

# Пераможны май у маёй біяграфіі

**Напярэдадні Дня Перамогі мы пацікавіліся ў розных людзей, што для іх асабіста, а таксама для іх сям'і азначае гэтае свята.**

**Віктар ВАЛЮШЫЦКІ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы:**

— Для мяне свята Перамогі — адзін з самых важных дзён у годзе, і падчас сваёй дэпутацкай дзейнасці імкнуся прывіваць павагу да яго з боку маладога пакалення. Вось і не так даўно на навукова-практычнай канферэнцыі ў Брэсце, арганізаванай грамадскім аб'яднаннем «Белая Русь», у сваім выступленні я зрабіў акцэнт на тым, што пра вайну патрэбна казаць заўсёды. Гэта памяць, мы не павінны яе губляць.

На вайне загінуў — прапаў без вестак — мой дзядзька. Бабуля атрымала «пахаванку» акурат 9 мая 1945 года... Мой бацька таксама быў прызваны ў армію ў 1945 годзе і праслужыў там да 1950, аднак непасрэдна ў баявых дзеяннях ён удзел не прымаў.

**Віктар РУСАК, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы:**

— Я нарадзіўся праз 10 гадоў пасля гэтай страшнай вайны і якраз у маі. Дзень Перамогі — гэта вельмі светлае свята. Памятаю настрой падчас святкавання яго ў звычайных людзей і ветэранаў — тады, у 60-я, яны былі яшчэ адносна маладымі. Ветэранамі былі настаўнікі маёй школы, мой дзед таксама ваяваў. Відаць, гэта паўплывала на мой выбар надзець пагоны...

**Барыс ГЕРСТЭН, журналіст АНТ, адзін з аўтараў праектаў «Вызваленая Еўропа», «Гарады-героі», «Зваротны адлік»:**

— Гэтае свята для мяне і светлае, і сумнае адначасова. На вайне пабывалі мае і бацька, і маці. Бацька быў прызваны на фронт 22 чэрвеня 1941, ён прайшоў усю вайну. Падчас яе загінула першая яго сям'я. Маці маю ён сустрэў ужо на фронце. Яна была ўрачом, яе баявое хрышчэнне прайшло на Курскай дузе.

Як журналіст, я сустракаўся з рознымі людзьмі: з ветэранамі, былымі ваеннапалоннымі, вязнямі канцэнтрацыйных лагераў... Заўважыў, што свята адзначаюць сотні тысяч і мільёны людзей, але ў кожнага з іх сваё ўспрыманне гэтага дня.

**Віталь ЧЭХ, старшыня Беражноўскага сельскага выканаўчага камітэта (Столінскі раён):**

— На вайне быў мой дзед, які памёр ужо ў мірны час. Для мяне Дзень Перамогі — гэта і сямейнае, і афіцыйнае свята адначасова. У нашым сельсавеце штогод у гэты дзень праходзяць мітынгі з удзелам прадстаўнікоў Праваслаўнай царквы, вяскоўцаў. На іх мы звычайна прыходзім усёй сям'ёй.

У нас у сельсавеце засталося толькі два ветэраны, і, натуральна, мы стараемся ім усяляк дапамагаць. Але, як гавораць самі пажылыя людзі, зараз для іх галоўнае — здароўе, усё астатняе яны маюць...

**Падрыхтавала Надзея ЮШКЕВІЧ.**

# Па месцах баявой славы

## прайшлі бібліятэкары з Калінінградскай вобласці ў Чавускім раёне

**Запрашэнне далучыцца да раённай эстафеты памяці ў гонар 70-годдзя Перамогі над фашысцка-нямецкімі захопнікамі яны атрымалі ад сваіх чавускіх калег. Супрацоўнікі Зеленаградскай гарадской бібліятэкі прыехалі разам з дзесяццю выхаванцамі «Цэнтра дапамогі дзецям, якія засталіся без апекі бацькоў «Наш дом». Сяброўскія сувязі паміж бібліятэкамі ўзніклі яшчэ летась, калі па прапанове расіян быў праведзены тэлемост. Яго ініцыяваў чытач Зеленаградскай бібліятэкі — ветэран Вялікай Айчыннай вайны Васіль Чарноў, які прымаў удзел у вызваленні Чавускага раёна.**

— За час нашага знаёмства мы змаглі шмат чаго даведацца адно пра аднаго, а сёлета нарэшце і пазнаёміцца асабіста, — падзялілася ўражаннямі ад сустрэчы **дырэктар Чавускай бібліятэчнай сеткі Алена МАКСІМОВІЧ.** — Мы арганізавалі для гасцей экскурсію па тых месцах, дзе ваяваў Васіль Чарноў. Яны былі настолькі ўсхваляваны, што некаторыя нават плакалі. У такія моманты асабліва адчуваеш, як важна данесці да моладзі праўду пра тую вайну.

Падчас эстафеты расіяне прынялі ўдзел у прэзентацыі кнігі Васіля Чарнова «Доўг» і паглядзелі прысвечаны яму фільм «Служу Савецкаму Саюзу». Яны таксама пабывалі на Буйніцкім полі пад Магілёвам, каб асабіста адчуць гераізм абаронцаў, якія ў першыя дні вайны сталі прыкладам мужнасці і непакорлівасці савецкага народа.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# «Гэты дзень мы набліжалі як маглі...»

**Пад такой назвай у гэтыя перадсвяточныя дні Нацыянальная акадэмія навук і Міністэрства абароны праводзяць Міжнародную навукова-практычную канферэнцыю, прымеркаваную да 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і заканчэння Другой сусветнай вайны.**

У абмеркаванні такіх важных праблем, як сучасныя падыходы да асвятлення гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, уклад беларускага народа ў разгром германскіх акупантаў на франтах вайны і іншых, удзельнічаюць каля 500 чалавек. Сярод іх — вядучыя вучоныя, гісторыкі і архівісты з Беларусі, Расіі, Азербайджана, Казахстана, Германіі, Украіны, Таджыкістана, Узбекістана, прадстаўнікі дыпламатычных місій, сілавых ведамстваў, студэнты і курсанты вышэйшых грамадзянскіх і ваенных навучальных устаноў, грамадскія дзеячы.

**«Сёння ў Беларусі даследавана прыкладна 30% архіўных матэрыялаў».**

— Праведзенне падобных навукова-практычных канферэнцый сумесна з Міністэрствам абароны становіцца традыцыяй, — падкрэсліў **старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзімір ГУСАКОЎ.** — Даследаваць ваенную тэматыку без ваенных навукоўцаў немагчыма. Мы імкнёмся дамагчыся аб'ектыўнасці, праўдзівасці гэтых даследаванняў, таму і прыцягваем як мага большую колькасць вучоных, у тым ліку ваенных. Навукоўцы і зараз выяўляюць новыя факты, падзеі, подзвігі. Нягледзячы на тое, што тэма вайны вывучаецца даўно, існуе яшчэ шмат невядомых старонак, нявывучаных архіваў. Сёння ў Беларусі даследавана прыкладна 30% архіўных матэрыялаў, яшчэ 70% трэба будзе вывучыць.

Супрацоўнікі Акадэміі навук са зброяй у руках змагаліся з ворагам на франтах Вялікай Айчыннай вайны, абаранялі краіну ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у шэрагах партызанаў і падпольшчыкаў. Уклад у Перамогу над ворагам унеслі каля 100 членаў Акадэміі навук. Гэта народны прэзідэнт установы, які ў свой час яе ўзначальваў, Мікалай Барысевіч яшчэ юнаком стаў партызанам-падрыўніком і ўдзельнічаў у штурме Берліна.

— Чым далей у мінулае сыходзіць светлы дзень 9 мая 1945 года, тым больш выразна паўстае перад намі веліч Перамогі савецкага народа, — зазначыў **міністр абароны Беларусі генерал-маёр Андрэй РАЎКОЎ**, які выступіў з дакладам аб геапалітычных выніках Вялікай Айчыннай вайны і ўкладзе беларускага народа ў Перамогу. — Маштаб і значэнне гэтай грандыёзнай падзеі немагчыма перабольшыць: чалавецтва было выратавана ад знявалення, а незлічоная мноства людзей і цэлыя народы — ад фізічнага знішчэння і духоўнай смерці. Чым далей сыходзяць у гісторыю ваенныя гады, тым больш намаганняў патрабуецца для абароны гістарычнай праўды ад уплыву палітычнай кан'юнктуры. Дзесяцігоддзі, якія прайшлі з дня Вялікай Перамогі, паказалі, якую неацэнную ролю адыграла пакаленне пераможцаў у лёсе чалавецтва, у зберажэнні духоўнасці і выратаванні ад знішчэння цэлых народаў.

**Вераніка КАНЮТА.**

■ Пошук

# ЭКІПАЖ ЛЯЦІЦЬ У ВЕЧНАСЦЬ...

**Усё сваё шчаслівае і спакойнае дзяцінства 70-х я правяла ў вёсцы маёй бабулі Агаф'і Сямёнаўны Барадзіной, на высокім беразе чыстай ракі Арэсы. І называлася яна сугучна — Падарэссе. Мірнае неба і жыццё мы ўспрымалі як данасць, не задумваючыся над іх цаной... Тады ж упершыню я пачула гісторыю пра тое, што над нашымі лясамі падчас вайны было збіта некалькі савецкіх самалётаў. І што хтосьці з мясцовых нават знаходзіў дакументы на імя Аляксандра Катаева. Гэтае імя было вядома ўсім жыхарам Падарэсся. Але тады мне і ў галаву не прыходзіла, што, пражыўшы амаль палову свайго жыцця, я сама пачну шукаць сляды маладога лётчыка.**

...Чэрвень 1941 года. Нашу краіну пачалі бамбіць у 4 раніцы самай кароткай летняй ноччу. 28 чэрвеня савецкія войскі пакінулі сталіцу Беларусі — Мінск. У гэты ж дзень з аэрадрома Горкі, што пад Магілёвам, падымаюцца некалькі звенняў савецкіх бамбардзіроўшчыкаў і ляцяць у паўднёва-заходнім кірунку — выконваць баявое заданне па знішчэнні нямецкай танкавай калоны, якая рухаецца па шашы Слуцк — Мінск. Нашы самалёты пралятаюць над вёскамі, яны амаль каля цэлі, але раптам з-за аблокаў вынырваюць варожыя «люфтвафэ». Пачынаецца бой. Многія нашы самалёты згараюць у небе разам з экіпажамі. Савецкія бамбардзіроўшчыкі не маюць такой хуткасці, яны цяжэйшыя, у іх бомбы, і таму ім даводзіцца паварочваць назад. Але нямецкія асы не збіраюцца адпускаць іх жывымі, пачынаецца праследаванне. Разумеючы, што ад пагоні не ўцячы, адзін з нашых бамбардзіроўшчыкаў ссоўваецца направа ад вёскі, скідвае на поле бомбы, каб аблегчыць самалёт, пасля гэтага паварочвае і ідзе на немца лоб у лоб. Другі савецкі экіпаж вырашае падтрымаць баявых таварышаў.

**Паліцаяў у вёсцы Падарэссе было двое — Мікалай Кімпель і Міхаіл Свірыда. А неўзабаве жыхары вёскі ўбачылі на паліцаі Свірыдзе незвычайную скураную куртку з лётнымі крылцамі...**

Бой ідзе над лесам, каля вёскі Падарэссе Старадарожскага раёна. Жыхары вёскі, як па камандзе, высыпаюць на вуліцу. Усе напружана глядзяць і чакаюць. Адзін з савецкіх самалётаў загараецца ў першыя хвіліны. Праз нейкі час снарад прабівае бензабак другога... Некалькі хвілін — і ўсё заканчваецца...

Паводле ўспамінаў відавочцаў, у першыя дні вайны, а менавіта 28 чэрвеня 1941 года, у Старадарожскім раёне над лесам, паміж вёскамі Залужжа і Падарэссе, у адзін і той жа дзень і час былі збіты 2 савецкія самалёты. Адзін упаў за вёскай Залужжа, другі — у лесе каля вёскі Падарэссе. Абодва экіпажы загінулі.

Дзякуючы вялікай пошукавай рабоце, праведзенай у 1967—1969 гг. заслужаным настаўнікам БССР школы вёскі Залужжа Міхаілам Андрэевічам Санько, самалёт і імёны экіпажа, які ўпаў каля вёскі Залужжа, былі адноўлены. Мясцовыя жыхары знайшлі і прывезлі ў вёску целы загінулых лётчыкаў, пахавалі іх на мясцовых могілках. А таксама знайшлі дакументы і фотаздымак аднаго з іх і пасля вайны перадалі ў школу. Фотаздымак і даныя дакументаў апублікавалі ў г. Калінін (Расія) у газеце «Калининская правда» 12 снежня 1967 г. У выніку былі апазнаныя лётчык С.В. Поснікаў і стралок-радыст А.М.Зайцаў, паміж школай і сваякамі завязалася перапіска, якая захоўваецца ў музеі і да гэтага часу. У 1968—1972 гг. у вёску Залужжа прыязджалі жонкі і сыны загінулых лётчыкаў. Вось так, дзякуючы неабыякавасці простага вясковага настаўніка Міхаіла Санько быў знойдзены і адноўлены ўвесь экіпаж хуткаснага бамбардзіроўшчыка СБ-16 у складзе камандзіра звяна Поснікава Серафіма Васільевіча, 1913 года нараджэння (ураджэнец вёскі Кірэвічы Бежыцкага раёна Калінінскай вобласці), штурмана Фаміных Пятра Філіпавіча, 1914 года нараджэння (вёска Хмялёўка Піжанскага раёна Дуброўскага сельсавета Кіраўскай вобласці) і стралка-радыста Зайцава Аляксандра Міхайлавіча, 1921 года нараджэння (вёска Валагуды Анежскага раёна Архангельскай вобласці).



Родныя А.М. Зайцава на магіле лётчыкаў.

Усе гэтыя, ужо гістарычныя, звесткі пра першы экіпаж нам прадаставіла настаўніца матэматыкі, загадчыца школьнага музея Залужскай школы Старадарожскага раёна Валянціна Сямёнаўна Казлова — яшчэ адзін неабыякавы чалавек, які прыняў эстафету ад настаўніка Санько. Валянціна Сямёнаўна аказала нам вялікую дапамогу і па пошуку другога экіпажа.

* * *

...Такім чынам, самалёты вылецелі на баявое заданне па знішчэнні нямецкай калоны і ў выніку бою над лесам два было збіта.

Другому экіпажу, які ўпаў каля вёскі Падарэссе, не пашанцавала — ён застаўся невядомым. Знайшлі яго не вельмі добрыя людзі, якія забралі і дакументы лётчыкаў, і нават адзенне... Па ўспамінах старажылаў, адзін з лётчыкаў быў яшчэ жывы. У яго ад моцнага ўдару аб зямлю пры падзенні былі вельмі пашкоджаны ногі: ніжнія косці зайшлі ў верхнія тазасцегнавыя, суставы каленяў выскачылі... Пры якіх абставінах памёр паранены лётчык, застаецца таямніцай... Але дапамогі яму не аказалі.

З размовы з Адамам Ігнацьевічам Колтунам, які нарадзіўся ў вёсцы Падарэссе: *«Я бачыў, як над лесам праляцела адно звяно самалётаў. І другое — паміж нашай і суседняй вёскай у напрамку горада Слуцка. І праз некаторы час яны ляцелі назад, дакладна па тым жа маршруце, але за імі ўжо была пагоня... І на вачах у мяне і ўсёй вуліцы над лесам нашы самалёты былі збіты адзін за другім, у адзін і той жа час».*

Паводле ўспамінаў былога жыхара вёскі Падарэссе Уладзіміра Фаміча Казачка: *«Праз некаторы час пасля падзення самалёта я і мой брат з бацькам касілі траву — у заліўной западзіне, каля Лявонава поля. Тут з лесу выйшаў наш аднавясковец Якаў Майлычка і сказаў, што побач, у лесе, ляжыць самалёт. Мы тут жа кінулі нашу касьбу і пабеглі. Збіты самалёт ляжаў ў кірунку да вёскі Шапчыцы, але лётчыкаў там ужо не было. З цікавасці мы сталі збіраць нейкія дробныя трубкі, я з іх потым рабіў запальніцы. Зямля вакол самалёта была як узараная, мусіць, яе пасеклі асколкі... А пазней той жа Якаў Майлычка распавядаў, што знайшоў самалёт раней — па гуку выстралу. Пачакаўшы нейкі час, ён падышоў. Адзін з лётчыкаў быў увесь пабіты асколкамі і ляжаў у абломках самалёта нежывы. А ў другога ад удару былі моцна пераламаны ногі. Але на той момант ён ужо быў застрэлены...»*

Пахаваў загінулых (ужо значна пазней) Васіль Сямёнавіч Казачонак — дзесьці ў лесе пад бярозай. Пасля вайны месца гэтага апазнаць не змог. Паводле яго слоў, «недалёка ад самалёта». Дачка Васіля Сямёнавіча — Ганна Васільеўна — узгадвала: «Бацька казаў: *«Як разбіраць самалёт, дык усе, а як хаваць лётчыкаў — дык ніхто не хацеў...»* І тады ён *пайшоў і пахаваў... Пасля вайны, гадоў праз 15, да яго прыязджаў нейкі мужчына і яны туды хадзілі. Але бацька месца пахавання не пазнаў, толькі здзівіўся, як за гэты час бярозкі выцягнуліся...»*

Праз некалькі тыдняў пасля падзення, тым жа летам 1941 года, маладыя дзяўчаты, збіраючы ягады ў лесе, узлезлі на крылы самалёта, які разваліўся на дзве часткі, і знайшлі ў кабіне абгарэлы планшэт з запісам «Катаеў Аляксандр, станцыя Орша». Былі там і лічбы, мабыць, нумар часці, але дзяўчаткі іх не запомнілі... А потым дакументы ў іх забраў паліцай.




Помнік экіпажу самалёта.

Паліцаяў у вёсцы Падарэссе было двое — Мікалай Кімпель і Міхаіл Свірыда. А неўзабаве жыхары вёскі ўбачылі на паліцаі Свірыдзе незвычайную скураную куртку з лётнымі крылцамі...

* * *

...Пасля вайны, у 1968 годзе, той жа настаўнік з вёскі Залужжа Міхаіл Санько адпраўляў запыты на КОтаева (пісаў прозвішча праз О — КОТАЕВ), у тым ліку і ў Міністэрства абароны — адказ быў адмоўны.

**Другому экіпажу, які ўпаў каля вёскі Падарэссе, не пашанцавала — ён застаўся невядомым. Знайшлі яго не вельмі добрыя людзі, якія забралі і дакументы лётчыкаў, і нават адзенне...**

У выніку аб'явы, дадзенай мной і настаўніцай С.В. Казловай у старадарожскай газеце, жыхары вёскі Падарэссе (сям'я Евы Фамінічны Маслючэнка) прынеслі алюмініевую спінку ад сядзення пілота таго самага зніклага экіпажа. І алюмініевую трубу. Яшчэ ёсць зробленыя з ашалёўкі самалёта печка-«буржуйка», вядро і кружка... Прывозілі з Магілёўскай вобласці дачку адной з жанчын, якія знайшлі ў 1941 годзе планшэт з ініцыяламі, — Тамару Міхайлаўну Свірыду, спрабавалі вызначыць месца падзення самалёта. Вялікую дапамогу сваімі ўспамінамі аказалі нам сведкі падзей таго часу, жыхары вёскі Падарэссе Уладзімір Фаміч Казачок, які асабіста бачыў упаўшы самалёт і намаляваў на карце месца падзення, яго сястра Ева Фамінічна Малючэнка, Адам Ігнатавіч Колтун, які назіраў паветраны бой над лесам у 1941-м, і многія іншыя... Вялізную колькасць запытаў напісалі мы ў розныя інстанцыі (у тым ліку сумесна з газетай «Звязда»). Двойчы звярталіся ў Старадарожскі ваенкамат з запытам на раскопкі рэштак самалёта і экіпажа. І незлічоную колькасць разоў мы з групай аднадумцаў выязджалі ў лясы Старадарожскага раёна для пошукаў хоць нейкіх слядоў.

Пасля аб'явы ў мясцовай газеце патэлефанавалі жыхары вёскі Крываносы Русаковіч Рыгор Паўлавіч і яго сын Андрэй, паведамілі пра падбіты каля іх вёскі нямецкі самалёт. Месца падзення і знаходжанне рэштак пацвердзіла і паказала Алена Цімафееўна Назарава. Патэлефанаваў таксама жыхар суседняга Слуцкага раёна — Міхаіл Іванавіч Сыцько, які паведаміў пра магілу ваеннага часу капітана Цвятаева, якая знаходзіцца ў лесе, побач з яго роднай вёскай Гутніца, і якую яны дагледзялі разам з настаўніцай. Вось колькі неабыякавых людзей адгукнулася — вялікі ўсім дзякуй!

І нарэшце — удача! Мы з Валянцінай Сямёнаўнай Казловай знаходзім у Кіраўскай вобласці чалавека з імем Аляксандр Васільевіч Катаеў, 1918 года нараджэння, малодшага лейтэнанта, старшага лётчыка, які прапаў без вестак на Заходнім фронце, у першыя дні вайны. Даём аб'яву ў мясцовай газеце «Нива» і пры дапамозе такіх жа энтузіястаў — настаўніцы школы пасёлка Косіна — знаходзім сваякоў Аляксандра Катаева!..

Шмат тайнаў яшчэ захоўвае вайна. Але мы, унукі і праўнукі тых, хто выпакутаваў гэтую найцяжэйшую для нашай Радзімы Перамогу, не маем права забывацца на мінулае, здраджваць сваім героям.

Таму пошукі месца пахавання загінулых лётчыкаў і звестак пра іх працягваюцца...

**Ларыса КАРАСІНА**

■ Неасабісты суб'ектыў

# ГЕНЕТЫЧНЫ КОД



## Што ратуе нас ад бяспамяцтва

СЯРОД празрыстай ранішняй цішыні, звонкай і халаднаватай, з-за воблакаў раптам разнёсся глухі гул, які з кожнай секундай нарастаў. Яшчэ не паспела ні пра што падумаць, а сэрца ўжо трапятала ў грудзях спалоханым зайцам. Гэта было на адзін кароткі міг, калі ўсю істоту ахапіў самы сапраўдны жах, калі хацелася бегчы стрымгалоў з цікага вясковага агарода, шукаць якое схованішча... Праз адзін газы няўлоўны міг мы ўсе адно аднаму ўсміхнуліся, хтосьці спакойна вымавіў: «Самалёты на рэпетыцыю парада паляцелі». Зноў пачалі капаць, раўняць, сеяць, раз-пораз разгінаючыся, каб паслухаць, як пакуль яшчэ нясмела распяваецца ў вербалозах салавей...

Ужо ўвечары нехта з маладзейшых, з пакалення «ўнукаў», раптам сказаў: «А як самалёт загуў, было страшнавата, праўда?» І мы пачалі доўга і сур'ёзна гаварыць пра тое, чаму на гэтай зямлі нават тыя, чые бацькі ведаюць вайну толькі па падручніках гісторыі, халадзеюць душой, калі нечакана нізка праляціць самалёт, чаму ўздрыгваюць, чуючы нямецкую мову, чаму, чарговы (каторы ўжо!) раз гледзячы «Лёс» ці «У бой ідуць адны старыя», употай глытаюць слёзы. «У нас ужо такі генетычны код запісаны», — сказала раптам пляменніца, якая нядаўна скончыла медуніверсітэт. І спрачацца з ёю ніхто не стаў.

ЯНА, гэта маладая жанчынка, якая гадуе маленькага сына, здаецца, на падсвядомым узроўні ўгадала тое, што, магчыма, праз гады пацвердзяць і навукоўцы. Вайна, апошняя страшная вайна, уелася ў нашы гены, упляласа ў нашы ДНК, і яна ўжо нікуды не дзенецца, яна будзе перадавацца з крывёю, з малаком маці наступным пакаленням. Інакш як патлумачыць гэтыя сны, якія прыходзяць не часта, але з года ў год, адны і тыя ж. Калі ўцякаеш па жытнёвым полі за гумнамі ў роднай вёсцы ад танкаў з белымі крыжамі, а табе ў спіну ляціць кулямётная чарга, і ты павольна падаеш на зямлю тварам да перавернутага неба. Можа, нам перадаў іх у спадчыну бацька як самы страшны свой дзіцячы ўспамін: ён бачыў, як фашысцкія танкі набліжаліся да вёскі, і стрымгалоў уцякаў ад іх, і баяўся, адчайна баяўся, што вось зараз хтосьці выстраліць у спіну. А нашай маме было ў пачатку вайны два гады, і яна запомніла толькі гул самалётаў, ад якіх яны хаваліся ў беразе Усы, калі фашысты ў першыя дні бамбілі Станькава. Ці не таму яе дзеці і ўнукі здрыгануліся праз больш чым семдзесят гадоў, калі занадта нізка праляцеў ваенны самалёт?

І падобныя гісторыі і адчуванні — у кожнага беларускага роду. Сама зямля дагэтуль перадае свой боль і ўспаміны. За тры гады тут было столькі людскога гора, столькі слёз і пакут, столькі пажарышчаў і смерцяў, што ўся гэта жудасная энергія, стогны, праклёны, галашэнні, якія нesліся да неба, не маглі проста знікнуць у нікуды, хай сабе і праз семдзесят гадоў. Мы нібы накрытыя купалам гэтай энергіі, гэтых успамінаў.

ЦЯЖКА? Несумненна. Лягчэй было б жыць там, дзе няма такога страшнага ведання: вось тут людзей стралялі, тут — вешалі, тут — палілі жывымі. Лягчэй хадзіць па гарадах, дзе захаваліся цэлыя кварталы сівога сярэднявечча, а не па сучасных копіях гэтых кварталаў, бо мінулая вайна змяла арыгіналы да звання. Лягчэй там, дзе бабуля расказвае пра мінулую вайну як пра вельмі цяжкі час, бо не хапала прадуктаў, а не пра тое, як загортвала ў прасцінку і закопвала косці расстралянага і спаленага мужа...

Але гэты купал, пад якім апынуліся мы і нашы нашчадкі, — не толькі цяжар, але і надзейная ахова ад бяспамяцтва. Так, у нашым генетычным кодзе тая страшная вайна — яго неад'емная частка. Але такія ж самыя важныя складнікі ў ім — і ўсведамленне Перамогі, і разуменне і веданне, што яна для нас — не проста свята, а Свята Жыцця. У самым простым і літаральным сэнсе, без патэтыкі і гучных слоўаў.

МЫ наогул унікальнае пакаленне беларусаў. Менавіта мы першыя можам сказаць, што вайна на нашай зямлі была аж у мінулым тысячагоддзі. Запісаць бы гэта ў памяць, у гены далёкіх нашчадкаў і ў падручнікі гісторыі яшчэ на наступную тысячу гадоў.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ**

# ДЗЕВЯЦЬ ТЫСЯЧ ПЕРАРВАНЫХ ГІСТОРЫЙ

## Чаму сучасным даследчыкам складана знайсці звесткі пра спаленыя вёскі?

**«Праз нашу вёску ішоў карны атрад. Немцы хацелі сысці, але сустрэлі сем яўрэяў, якія жылі ў вёсцы і хаваліся ў лесе. Карнікі іх расстралялі і вярнуліся ў паселішча пад выглядам праверкі дакументаў астатніх жыхароў. А насамрэч сабралі ўсіх людзей у калгаснай стайні, замкнулі і спалілі жыўцом», — успамінае Зінаіда Леванец, якой было восем, калі фашысты спалілі яе родную вёску Скірмантава Дзяржынскага раёна. Гэты дзень яна запомніла на ўсё жыццё. Тады цудам удалося выратавацца пяцярым: Зіне з мамай, якія былі ў суседняй вёсцы; брату і суседскай дзяўчынцы, якія пасвілі кароў і, схаваўшыся ў бульбе, на свае вочы бачылі ўсю трагедыю; і яшчэ аднаму жыхару, якога пасля забралі ў Германію. У пажарышчы загінула родная і дзве стрыечныя Зініны сястры, а таксама бацька — інвалід грамадзянскай вайны...**

Падобныя сведчанні не горш за дакументы могуць расказаць пра нашу гісторыю. Аднак сведкаў тых падзей з кожным годам застаецца ўсё менш, а пытанняў у даследчыкаў яшчэ шмат... Праліць святло на цёмныя старонкі гісторыі спаленых вёсак узяліся беларускія архівісты. З 2010 года вучоныя вядуць даследчую працу, і на «круглым стале», прысвечаным 70-годдзю Перамогі, у Нацыянальным архіве Беларусі яны прадставілі некаторыя найбольш значныя яе вынікі.

Так, супрацоўнікі Нацыянальнага архіва падрыхтавалі электронную базу даных па спаленых вёсках, у якую ўвайшло 9060 назваў знішчаных фашыстамі беларускіх паселішчаў.

— Лічба ў 9060 вёсак — не канчатковая, бо ёсць дакументы, якія патрабуюць удакладнення, — адзначыў **галоўны архівіст Нацыянальнага архіва Беларусі Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ.** — Справа ў тым, што калі мы ўзяліся за стварэнне базы, у аснову паклалі матэрыялы ўліку 1969 года. Часткова гэтыя матэрыялы былі апублікаваныя ў 1984 годзе, а ў 1995-м выйшаў дапоўнены варыянт гэтай кнігі. Цікава, што тады прыводзілася лічба знішчаных у Беларусі вёсак — 9200. Аднак адтуль зніклі словы «цалкам» і «часткова знішчаныя». Калі мы сталі працаваць з дакументамі, выявілася, што больш за 1000 вёсак былі знішчаныя без жыхароў, а некаторых населеных пунктаў увогуле няма ў спісах, як і матэрыялаў уліку райвыканкамаў па іх. Сталі высвятляць, у чым справа, і аказалася, што спісы 1969 года складзены не на падставе архіўных дакументаў, а шляхам апытанняў жыхароў паселішчаў, якія спалілі. З таго часу многія вёскі проста зніклі з зямлі за пасляваенны перыяд.

Распавядаючы пра блытаніну ў дакументацыі, Вячаслаў Селяменеў прывёў прыклад Полацкага раёна, дзе ў вайну фашысты цалкам знішчылі Васільеўскі сельсавет. Паводле дакументаў, там было дзевяць вёсак, але іх немагчыма знайсці ні ў даведніках сучасных населеных пунктаў, ні ў кнізе «Памяць». Складанасць становішча заключаецца ў тым, што па большасці раёнаў не захавалася даваенных спісаў населеных пунктаў, і цяпер гісторыкам няма з чым параўноўваць.

— Сутыкнуліся мы і з шэрагам метадычных праблем, — прадоўжыў галоўны архівіст. — Не ўдалося знайсці, якімі крытэрыямі кіраваліся пры складанні базы ў 1969 годзе. Атрымалася, што ў некаторых раёнах у спісы былі ўключаны нават вёскі, дзе быў знішчаны адзін дом. У іншых раёнах у спісы ўключалі вёскі, дзе была спалена большасць хат. Не было распрацавана метадычных прынцыпаў, што лічыць часткова спаленай вёскай.

Даследчыкі з Нацыянальнага архіва пры складанні базы вырашылі лічыць такімі вёскі, дзе знішчана не менш як 25% жылфонду ці 20 і больш дамоў. Адсюль і атрымалася лічба ў 9060 вёсак. Таксама ў матэрыялах ранейшага ўліку няма азначэння паняццяў паселішчаў, знішчаных з большай, меншай часткай насельніцтва ці без насельніцтва. Сёння архівісты прапануюць падзяліць населеныя пункты на знішчаныя з большай часткай насельніцтва і тыя, у якіх загінула да 50% жыхароў.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Праз наяўнасць падобных пытанняў навукоўцы пакуль што не могуць прывесці дакладныя лічбы. Яны сабралі інфармацыю для аналітыкі, але застаецца вызначыць метадычныя крытэрыі занясення паселішчаў у базу. Бо за 70 пасляваенных гадоў не з'явілася ніводнага даследавання па гэтай тэме. Нявырашаным застаецца і пытанне, ці ўключаць у базу вёскі, знішчаныя не падчас карных акцый, а ў час наступальных ці вызваленчых аперацый.

Шмат цікавых дакументаў па тэматыцы знішчаных паселішчаў па ўсім былым Саюзе захоўваецца ў крымінальных справах на замежных ваеннапалонных, асуджаных за ваенныя злачынствы. Дзякуючы гэтым спісам і пратаколам падрыхтавалі зборнік, дзе ўпершыню карныя аперацыі прадстаўлены з двух бакоў: паводле дакументаў фашыстаў і партызанаў.

Апроч базы даных, Нацыянальны архіў падрыхтаваў тры выданні, прысвечаныя трагедыі беларускіх вёсак. Летась у серыі «Архіў. Гісторыя. Памяць» выйшлі два зборнікі: «Хатынь. Трагедыя і памяць», пра самую вядомую спаленую вёску і гісторыю ўзвядзення мемарыяльнага комплексу, і «Хатынскі некропаль», які расказвае пра спаленыя і аднаўленыя пасля вайны паселішчы. Чарговы зборнік серыі, прэзентацыя якога адбылася падчас «круглага стала», называецца «Хатынскія Дрэвы жыцця». Ён прысвечаны 433 беларускім вёскам, памяць якіх увекавечана на сімвалічных «Дрэвах жыцця» мемарыяла. У зборнік увайшло больш за 350 дакументаў з Нацыянальнага архіва Беларусі, Цэнтральнага архіва КДБ Беларусі, Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці і Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі. Гэта данясенні, дзённікі баявых дзеянняў партызанскіх фарміраванняў, даведкі, акты, пратаколы допытаў жыхароў спаленых вёсак, якія выжылі, сведак, карнікаў і інш. У другім блоку зборніка — ілюстраваным — публікуюцца фотаздымкі Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь», помнікаў, узведзеных на месцах спаленых населеных пунктаў, і іншыя матэрыялы.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**

# АДНАВІЦЬ КАРЦІНУ ВАЙНЫ

## Беларускія гісторыкі публікуюць засакрэчаныя раней спісы палонных і дакументы франтоў

**Даследчыкі лічаць, што праз кожныя 20-30 гадоў любая тэма бачыцца зусім па-іншаму. Таму не дзіўна, што падзеі Вялікай Айчыннай вайны, пра якія, здавалася б, ужо столькі напісана, і сёння цікавяць навукоўцаў. За ўвесь час Інстытут гісторыі НАН Беларусі падрыхтаваў каля 11,5 тысячы публікацый, прысвечаных барацьбе з фашысцкімі захопнікамі, аднак некаторыя старонкі гісторыі толькі сёння становяцца вядомымі.**

### Сляды сапраўдных падпольшчыкаў

**Загадчык аддзела ваеннай гісторыі і міжнародных адносін Інстытута гісторыі Аляксей ЛІТВІН** расказвае, што ў Дзяржаўным архіве Расійскай Федэрацыі (Масква) знаходзяцца ўнікальныя дакументы — фотаздымкі надпісаў савецкіх палонных на сценах фашысцкіх турмаў. Некалі гэтыя надпісы цікавілі супрацоўнікаў Народнага камісарыята ўнутраных спраў СССР толькі з аднаго боку: раптам хтосьці з тых людзей быў завербаваны немцамі і пакінуты на акупаванай тэрыторыі. Усім адпаведным органам прадпісвалася з Масквыназіраць за «падазроным» чалавекам і правяраць, ці не фашысцкі ён агент. Шукалі нават тых, хто па надпісах лічыўся расстраляным.

— Звесткі былі доўгі час засакрэчаны, — кажа Аляксей Міхайлавіч. — Цяпер, калі інфармацыя даступная, мы змаглі даследаваць спісы гэтых людзей, зрабілі некалькі публікацый па Гомельскай і Кобрынскай турмах. Высветлілася, што шмат з тых, хто пакінуў свае надпісы ў Гомелі, былі сапраўднымі падпольшчыкамі. Але пра іх ніхто дагэтуль не ведаў. Больш за тое, пасля нашых публікацый мне з Алматы даслаў ліст сын аднаго з такіх людзей. Ён спецыяльны карэспандэнт «Известий» па Казахстане, 70 гадоў шукаў бацьку. Дзякаваў, што нарэшце ўдалося даведацца, як склаўся бацькаў лёс.

У маскоўскім архіве такая інфармацыя ёсць па дзесяці беларускіх турмах (акрамя згаданых гарадоў, гэта Мінск, Магілёў, Віцебск, Орша, Пінск, Стоўбцы, Ліда, Нясвіж). Хаця месцаў зняволення ў нашай краіне было нашмат болей. У гады акупацыі на нашай тэрыторыі было больш за 70 турмаў.

### Ацаніць чалавечыя страты

У Цэнтральным навуковым архіве НАН сёння захоўваецца справа, дзе прадстаўлены, бадай, першыя медыка-крыміналістычныя даследаванні таго ўрону, які нанеслі нямецкія захопнікі беларускаму насельніцтву. **Кіраўнік архіва Марына ГЛЕБ** распавядае, што адразу пасля вайны была створана надзвычайная ўрачэбная камісія:

— Медыкі бралі справаздачы аб фашысцкіх карных акцыях, складзеныя самімі гітлераўцамі, дзе з педантычнасцю і цынізмам апісвалася, як знішчаліся гета, расстрэльваліся ваеннапалонныя. На падставе гэтых дакументаў нашы ўрачы даследавалі месцы масавых забойстваў, наносілі іх на карту, рабілі падрабязны крыміналістычны аналіз знойдзеных там чалавечых астанкаў.

Ужо тады, у 1945 годзе, медыкі спрабавалі вызначыць, колькі беларусаў загінула. Па самых першых падліках, страты ацэньваліся ў мільён трыста тысяч чалавек. Сучасныя даследчыкі мяркуюць, што з улікам ускосных страт вайна забрала жыцці ад 2,5 да 3 мільёнаў жыхароў нашай краіны. **Акадэмік-сакратар аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Аляксандр КАВАЛЕНЯ** прызнаецца, што слабое месца ваеннай гістарыяграфіі — гэта статыстыка:

— На тэрыторыі Беларусі загінула прыкладна 810 тысяч ваеннапалонных. Аднак дакладную лічбу забітых салдат і афіцэраў мы ніколі не даведаемся. Калі ў Англіі і Штатах спісы тых, хто загінуў, публікаваліся штотыдзень, то ў нас гэтага, з многіх прычын, не рабілася. Нават сёння мы знаходзім невядомыя раней месцы пахавання партызанаў.

### Важныя вызваленчыя аперацыі

За апошнія гады беларускія даследчыкі разам з расійскімі калегамі выдалі некалькі значных прац. Так, сумесна з Інстытутам усеагульнай гісторыі Расійскай акадэміі навук падрыхтавалі праект «1941 год. Краіна ў агні». А летась, з дапамогай Інстытута ваеннай гісторыі Ваеннай акадэміі Генеральнага штаба Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі, прэзентавалі кнігу «Вызваленне Беларусі. 1943—1944». Там падабраны дакументы (многія з іх публікуюцца ўпершыню) Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, ваенных саветаў франтоў, дырэктывы і загады Генеральнага штаба Чырвонай Арміі, якія літаральна па днях распісваюць, што адбывалася на нашай тэрыторыі. Акрамя шырока вядомай аперацыі «Баграціён», навукоўцы расказваюць і пра іншыя: Чарнігаўска-Прыпяцкую, Гомельскую, Гомельска-Рэчыцкую, Мазырска-Калінкавіцкую, Рагачоўскую (усе былі праведзены Цэнтральным фронтам пад камандаваннем Ракасоўскага) і некалькі аперацый Заходняга фронту.

— Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне — агульная. У вызваленні толькі нашай краіны, акрамя саміх беларусаў, удзельнічала 60 тысяч армян, прыкладна столькі ж казахаў. Таму пры даследаванні ваенных гадоў мы супрацоўнічаем з іншымі дзяржавамі СНД, каб аднавіць карціну баявых дзеянняў цалкам, — адзначае Аляксей Міхайлавіч.

Сёлета, дарэчы, з 17 па 27 чэрвеня ў рамках гэтага супрацоўніцтва ў Мінску пройдзе чарговая школа маладых гісторыкаў краін СНД, прысвечаная праблемам Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў.

### Нанова вучыць гісторыю

Сёння актыўна вядзецца будаўніцтва мемарыяльнага комплексу «Трасцянец». У паўночнай частцы былога канцлагера пракладваюць дарожкі, усталёўваюць электраасвятленне і інфармацыйныя шыльды, прыводзяць у парадак рэшткі падмуркаў будынкаў, дзе ў 1942—1944 гадах знаходзілася нямецкае кіраўніцтва. Як паведаміў **загадчык аддзела археалогіі сярэдніх вякоў і новага часу Інстытута гісторыі НАН Вадзім КОШМАН,** рэканструкцыя пакуль закранула толькі перыферыю лагера: адміністрацыйныя і вытворчыя памяшканні. Самі баракі былі крыху ў іншым баку (у перспектыве гэтую тэрыторыю таксама плануюць уладкаваць).

**Ужо тады, у 1945 годзе, медыкі спрабавалі вызначыць, колькі беларусаў загінула. Па самых першых падліках, страты ацэньваліся ў мільён трыста тысяч чалавек.**

Самыя вялікія ахвяры лагера — ва ўрочышчах Шашкоўка, дзе з восені 1943-га існавала печ-крэматорый, і Благаўшчына. У апошнім з 1941 года расстрэльваліся яўрэі, прывезеныя з 8 краін Еўропы. Лічыцца, што ў гэтым месцы было забіта да 150 тысяч чалавек.

— Ведаеце, што мяне найбольш уразіла за амаль двухгадовы перыяд знаходжання на аб'ектах? Стаўленне людзей, — прызнаецца Вадзім Іванавіч. — У Шашкоўцы, дзе загінула каля 50 тысяч чалавек, сёння праводзяць пікнікі і страляюць з пнеўматыкі па інфармацыйных шчытах. А Благаўшчына стала месцам актыўнай працы «чорных капальнікаў», якія руйнуюць могілкі, спадзеючыся знайсці там залатыя зубы і ўпрыгожанні... Трэба працаваць з людзьмі, нанова вучыць іх шанаваць гісторыю.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

# НОВЫ АДРАС ДЛЯ ПАРТНЁРСТВА

**Ляньюньган — найбуйнейшы марскі порт Кітая. У горадзе, насельніцтва якога складае пяць мільёнаў чалавек, размешчана Зона супрацоўніцтва паміж усходняй, цэнтральнай і заходняй часткамі краіны. Урад Кітая заявіў, што Ляньюньган — адкрыты прыморскі горад.**


Фота БЕЛТА.

Пра прыярытэты яго месцазнаходжання задумаліся яшчэ камуністычныя лідары 1920—1930 гадоў, якія разумелі, што як толькі возьмуць у свае рукі ўладу, давядзецца наладжваць разбураную вайной эканоміку. Але імклівае развіццё горада і порта стала асабліва заўважным у апошнія гады.

— Наш горад набывае ўсе рысы найбуйнейшага мегаполіса, — адзначыла на сустрэчы з беларускімі журналістамі спадарыня **Тэн Вэнь, член пастаяннага камітэта парткама Ляньюньгана.** — У нас сыходзяцца марская і чыгуначная інфраструктуры. Грузы, атрыманыя з Паўднёвай Карэі і Японіі, а таксама з іншых краін па моры, могуць далей перавозіцца па чыгунцы ў Цэнтральную Азію і Еўропу. Гістарычна наш горад быў самым зручным выхадам Вялікага шаўковага шляху да мора. Таму і цяпер усе стратэгічныя міжнародныя праекты, у тым ліку і эканамічны пояс новага Шаўковага шляху, звязаны з Ляньюньганам. Бо што сёння важна для гандлю, поспехі якога ў значнай ступені адлюстроўваюць стан эканомікі? Паўлічыць хуткасці перамяшчэння тавараў, патанніць транспартныя выдаткі пры вырашэнні гэтай задачы. Значыць, лагістыка, разумныя інфраструктурныя рашэнні — аснова для руху наперад. Мы хацелі б бачыць Беларусь важным партнёрам у вырашэнні гэтай задачы.

Да самага актыўнага партнёрства ў галіне лагістыкі Беларусь запрашае і Кітайска-казахстанская міжнародная лагістычная кампанія Ляньюньгана. Створаная зусім нядаўна, яна ўжо можа быць узорам, паказваць вектар руху.

**Генеральны дырэктар кампаніі спадар Лю Бін** лічыць, што ўслед за Казахстанам Беларусь магла б смела заявіць пра свой намер удзельнічаць у лагістычных і транспартных праектах.

— Так, статутны фонд нашага сумеснага прадпрыемства складае 400 мільёнаў долараў. 51% капіталу — акцыі кітайскага боку. Астатняе належыць казахам. На стварэнне новых тэрміналаў, вырашэнне іншых тэхналагічных задач мы сумесна выдаткавалі 100 мільёнаў долараў. Тут ужо асноўныя інвестыцыі — за казахамі. Верагодна, на гэтым этапе беларусам не варта паўтараць праект. Спачатку трэба стварыць рух, павярнуць грузапатокі, карацей, грошы зарабіць менавіта на гэтым участку. Дык, можа, тады добра было б тэрмінова стварыць беларускае прадстаўніцтва — або ў порце Ляньюньгана, або пры нашай кампаніі. Мы ўжо пачалі цікавыя перамовы з Беларускай чыгункай. Думаю, яны паскорацца пасля сустрэчы Старшыні КНР і Прэзідэнта вашай краіны.

Варта зазначыць, што ўжо ёсць вынікі, якіх дабіваюцца сённяшнія арганізатары эканамічнага пояса Вялікага шаўковага шляху на ўчастку Ляньюньгана. Калі раней у Казахстан, еўрапейскую частку постсавецкай прасторы цягнікі з грузамі з порта Ляньюньган прыходзілі за 20 дзён, то цяпер за 13—14.

Кітай уважліва прыглядаецца да еўразійскага эканамічнага будаўніцтва. Безумоўна, і Казахстан, і Беларусь асабліва цікавяць яго ў гэтым плане.

Сёння і кітайскія палітолагі падрабязна абмяркоўваюць развіццё двухбаковых адносінаў Кітая не толькі з Беларуссю, але і з Расіяй, Казахстанам з улікам еўразійскага партнёрства гэтых краін.

**Кірыл ЛАДУЦЬКА,**
*г. Ляньюньган, Кітай.*

# СТАЎЛЕННЕ ДА ВАЙНЫ — ХАРАКТАРЫСТЫКА ДУХОЎНАСЦІ ГРАМАДСТВА

**У Кітаі парад Перамогі пройдзе ў верасні. Да 70-годдзя атрымання перамогі над японскімі мілітарыстамі. Але не застанецца незаўважаным у кітайскім грамадстве і сёлетняе 9 Мая як дзень 70-годдзя Вялікай Перамогі савецкага народа над фашызмам.**

Старшыня КНР Сі Цзіньпін прыняў запрашэнне з Расіі і возьме ўдзел у святкаваннях юбілею на Краснай плошчы ў Маскве. З пытаннем пра тое, ці ведаюць у Кітаі Вялікую Айчынную вайну, як адносяцца да памяці пра яе, наш карэспандэнт звярнуўся да розных прадстаўнікоў кітайскага грамадства. І вось што пачуў у адказ.

**Гао Ман, мастак, перакладчык, у 1980-я гады — галоўны рэдактар часопіса «Мировая литература»:**

— За многія папярэднія дзесяцігоддзі я не аднойчы бываў у гарадах Расіі і Беларусі. І ўсюды адчуваў сляды барацьбы савецкага народа з фашызмам. Трагічнае, драматычнае дыханне Вялікай Айчыннай — у тых творах, якія я перакладаў. І Святлану Алексіевіч я адкрыў як пісьменніцу праз яе кнігу пра вайну. Хаця потым пераклаў на кітайскую мову іншы яе твор. Прыемна, што ў Беларусі створана такога маштабу проза пра Вялікую Айчынную. Васіль Быкаў, Іван Шамякін, Алесь Адамовіч — вось імёны, дзякуючы якім пра яе не забудуцца не толькі беларусы.

**Чжао Хуэйжун, загадчыца аддзела Інстытута Расіі, Усходняй Еўропы і Цэнтральнай Азіі Кітайскай Акадэміі грамадскіх навук, прафесар:**

— Другая сусветная вайна перавярнула свядомасць людзей, наклала свой адбітак на падзеі наступных цяпер ужо сямі дзесяцігоддзяў. Вядома ж, у Кітаі ведаюць пра ролю Савецкага Саюза ў гэтай вайне. Мы разумеем, што зроблена вашымі народамі для знішчэння фашызму. І стараемся гэтыя веды, гэтую памяць перадаваць моладзі. Займаючыся пытаннямі міжнароднага партнёрства, я пільна ўглядаюся ў Беларусь сённяшнюю. І ведаю, як палітыка Прэзідэнта Беларусі грунтоўна базіруецца на высокамаральных каштоўнасцях гістарычнага міралюбства. Жыць у міры і згодзе народам розных краін — вось галоўны антываенны ўрок, які засвоены вашым і нашым грамадствам.

**Лю Мяо, выкладчык 2-га Пекінскага дзяржаўнага ўніверсітэта замежных моў, кіраўнік Цэнтра па вывучэнні Беларусі:**

— Гісторыя Вялікай Айчыннай вайны — адна з найважнейшых тэм, праз якія мы раскрываем студэнтам вобраз Беларусі. Пакуты, боль, перанесеныя вашым народам, і праяўленыя пры гэтым мужнасць, гераізм — высокі прыклад для ўсяго свету. І для дружалюбнага да Беларусі кітайскага народа — перш за ўсё. Мы ўсведамляем маштабы трагедыі, драмы даўніх дзесяцігоддзяў. Працуючы са студэнтамі, я часта ў расповедах пра Беларусь звяртаюся да кнігі пра спаленыя беларускія паселішчы «Я з вогненнай вёскі», якая выдадзена і ў перакладзе на кітайскую мову. Думаю, што нашы выдаўцы яшчэ не раз прапануюць гэтае горкае, з дзіўнай сілы нянавісцю апавяданне кітайскім чытачам. Такое не забываецца. Кітайцы таксама не могуць пра такое забыцца!..

**Кірыл ЛАДУЦЬКА,**
*г. Пекін, Кітай.*

■ Погляд



# САКРЭТЫ ПОСПЕХУ КІТАЙСКАЙ ЭКАНОМІКІ

**Тэмпы росту кітайскай эканомікі (больш за трыццаць гадоў яна расла па 10 працэнтаў у год і толькі ў апошнія гады стала запавольвацца) выклікаюць заслужанае захапленне ў іншых краін і зразумелае пытанне: як гэта стала магчымым? Пры тым, што падобны поспех мала каму ўдасца паўтарыць, у яго ёсць свае складнікі, якія былі выкарыстаны ўрадам КНР для хуткага і паспяховага эканамічнага росту.**

Перш за ўсё, прынцыповую ролю адыграла стаўленне кітайскага кіраўніцтва да глабалізацыі. У той час, як многія краіны яе баяліся і вынаходзілі штучныя бар'еры, эліты КНР аднесліся да глабалізацыі не толькі як да пагрозы, але і як да магчымасці. Больш за тое, у многіх прадстаўнікоў кітайскай эліты адносіны да глабалізацыі былі сапраўды аптымістычныя. З прычыны гэтага, кітайцы, пачаўшы ў канцы 1970-х гадоў першыя рэформы, па-майстэрску выкарысталі ўсе магчымасці, якія прадастаўляюцца глабалізацыяй, для развіцця сваёй эканомікі.

Акрамя таго, Кітай шмат чаму навучыўся, супрацьпастаўляючы сумны вопыт перабудовы СССР з пазітыўным вопытам мадэрнізацыі эканомікі на прыкладах Сінгапура, Японіі і Паўднёвай Карэі. Усвядоміўшы, што палітычная стабільнасць з'яўляецца адной з галоўных умоў для паспяховых эканамічных пераўтварэнняў, кіраўніцтва КНР не стала адмаўляцца ад дамінуючай ролі Камуністычнай партыі і афіцыйнай ідэалогіі, а стала праводзіць інтэнсіўныя эканамічныя рэформы, спалучаючы іх з паступовым змяненнем ідэалогіі. Замежныя інвестары хутка зразумелі, што Кітай не збіраецца распадацца па прыкладзе СССР, а Камуністычная партыя з'яўляецца надзейным гарантам захаванасці іх укладанняў у кітайскую эканоміку. А раз не будзе рэвалюцый і беспарадкаў, у Кітаі можна рабіць бізнес. І інвестыцыі ракой пацяклі ў гэтую краіну.

КНР таксама вельмі ўмела выкарыстала фактар велізарнай кітайскай дыяспары. Хуацяо (кітайскія эмігранты) назапасілі значныя капіталы і заўсёды захоўвалі піетэт перад радзімай, нават калі былі вымушаны пакінуць яе. Улады Кітая выкарыстоўвалі такое стаўленне кітайскіх эмігрантаў да сваёй краіны, паклікаўшы іх прывезці свае капіталы для мадэрнізацыі эканомікі пад гарантыі ўрада. Разлікі цалкам апраўдаліся: эмігранты, якія пражываюць у капіталістычных краінах, з энтузіязмам уклалі сотні мільярдаў долараў у камуністычны Кітай, які ніколі не пераставалі любіць, і прывялі іншых інвестараў, выкарыстоўваючы свае напрацаваныя за мяжой сувязі.

Вялікую ролю ў поспеху мадэрнізацыі эканомікі адыграла ментальнасць насельніцтва. Кітайцы, як і іх суседзі (карэйцы і японцы) маюць заслужаную рэпутацыю педантычных і зацятых працаўнікоў, якія не схільны спрачацца з кіраўніцтвам і кідаць працу, не завяршыўшы яе. Калі першыя замежныя інвестары падзяліліся сваімі захапленнямі з гэтай нагоды са сваімі калегамі, у Кітаі пачаўся сапраўдны інвестыцыйны бум.

У немалой ступені бурнаму прыцягненню інвестыцый спрыяла і танная працоўная сіла ў Кітаі ў першыя дзесяцігоддзі рэформаў. Кітайскі работнік, пра якога заходнія бізнесмены гаварылі, як аб нашмат больш працавітым і рахманым, чым у ЗША ці Еўропе, атрымліваў заработную плату ў дзясяткі разоў меншую.

Разам з замежнымі інвестыцыямі ў Кітай былі прывезены і тысячы новых тэхналогій. Адна толькі Германія за тры дзесяцігоддзі рэформаў прывезла іх у КНР больш за 16 000. Урад Кітая выкарыстоўваў фактар цікавасці прыходу інвестараў у велізарную кітайскую эканоміку, каб прымусіць іх перадаць частку тэхналогій на дзяржаўныя прадпрыемствы краіны.

Не спадзеючыся толькі на прыток замежных інвестыцый, эліты Кітая заклікалі ўласных прадпрымальнікаў актыўна развіваць эканоміку. Пры гэтым па першым часе дзяржаўныя прадпрыемствы не прыватызаваліся, што забяспечыла стабільнасць развіцця эканомікі. Нароўні з дзяржсектарам побач вырастаў новы сектар — прыватных і замежных прадпрыемстваў. І работнікі дзяржаўных прадпрыемстваў, якія атрымлівалі стабільную зарплату, сталі плацежаздольнымі кліентамі для развіцця прыватнага сектара.

Магутным фактарам росту эканомікі былі хуткія поспехі ў нарошчванні ўласных банкаўскіх капіталаў. Вялікую ролю адыграла звычка насельніцтва, якое не было распешчана матэрыяльнымі дабротамі і спрабавала забяспечыць сваю старасць і сваіх бацькоў ва ўмовах слабаразвітай на той час пенсійнай сістэмы, адкладаць у фінансавыя ўстановы да паловы свайго заробку. Улічваючы, што Кітай з'яўляецца найбуйнейшай па насельніцтве краінай свету, заробак у якой пастаянна расце з прычыны поспехаў эканомікі, неўзабаве яго банкі ўвайшлі ў лік найбуйнейшых у свеце. І цяпер ужо Кітай не залежыць ад таго, прыйдуць ці не замежныя інвестары, бо здольны фінансаваць і ўласныя патрэбы, і ўкладваць немалыя капіталы ў іншыя краіны.

Немалаважную ролю адыгралі ўкладанні ў лагістыку. Геаграфічнае становішча Кітая само па сабе з'яўляецца цудоўным для паспяховага развіцця эканомікі. Але яно таксама было значна палепшана з дапамогай будаўніцтва мноства сучасных аўтамабільных дарог і чыгунак, аэрапортаў і марскіх партоў.

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук** ■



## Извещение о проведении повторного открытого аукциона по продаже земельных участков на право заключения договора аренды

| | | |
|---|---|---|
| 1 | **Дата, время и место проведения аукциона, организатор торгов** | Аукцион состоится **22 мая 2015 г. в 11.00**, по адресу: г. Жлобин, ул. Петровского, 45 КУП «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью» |
| 2 | **Срок приема документов** | **с 9.00 до 17.00 по рабочим дням по 20 мая 2015 года** |
| 4 | **Адрес земельного участка** | Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Козлова, 2Б |
| 5 | **Кадастровый номер участка** | 321850100001002242 |
| 6 | **Площадь, га** | 0,1601 |
| 7 | **Целевое назначение** | Для строительства объекта по ремонту и обслуживанию автомобилей (земельный участок для размещения объектов по ремонту и обслуживанию автомобилей) |
| 8 | **Срок аренды** | 10 лет |
| 9 | **Характеристика территории и расположенных на участке инженерных коммуникаций; строений и сооружений; инженерно-геологические условия** | Участок свободен от застройки (инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ) |
| 10 | **Условия и ограничения** | 1. Победителю либо единственному участнику несостоявшегося аукциона в течение 10 рабочих дней с даты утверждения протокола результатов аукциона (либо признания аукциона несостоявшимся):<br>- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке);<br>- возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документов, необходимых для его проведения, формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка.<br>2. После совершения победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона действий, названных в п. 1, но не позднее 2 рабочих дней, заключить со Жлобинским районным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок со дня подписания договора аренды государственную регистрацию прав на земельный участок.<br>3. В течение двух месяцев, со дня государственной регистрации права земельного участка, получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ, разработку проекта благоустройства территории.<br>4. Приступить к занятию земельного участка в течение шести месяцев, со дня утверждения в установленном порядке проектной документации.<br>5. Снять на занимаемом земельном участке плодородный слой почвы и использовать его согласно проектной документации.<br>6. Завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией. |
| 11 | **Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории** | Подключение к общим сетям и сооружениям инженерной инфраструктуры выполняется по техническим условиям эксплуатирующих организаций с учетом нагрузок, определенных при разработке ПСД |
| 12 | **Начальная стоимость, рублей** | 13 635 063 |
| 13 | **Сумма задатка, рублей** | 1 300 000 |
| 14 | **Затраты по изготовлению землеустроительной документации, рублей** | 13 237 722 |
| 15 | **Стоимость расходов по организации и проведению аукциона (ориентировочно), рублей** | 1 000 000 |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь 26.03.2008 г. № 462.

**Организатор торгов – КУП «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью»**

**Документы принимаются по адресу: г. Жлобин, ул. Петровского, 45 (подъезд 2, 1 этаж) по 20 мая 2015 года (с 9.00 до 17.00).**

*Перечисление суммы задатка осуществляется на расчетный счет Организатора аукциона № 3012006530013 в филиале №312 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Жлобин, код МФО 151501673, УНН 490317354, сумма задатка победителя аукциона засчитывается при оплате им стоимости предмета аукциона.*

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) подает необходимые документы для участия в аукционе.

Всем желающим представляется возможность предварительно ознакомиться с документами по объекту и с объектом в натуре. Контактные телефоны: **8 (02334) 7 21 12, 7 53 01.**

Телефоны организатора аукциона: **8(02334) 3 14 08, 3 16 16.**

**Объявление о проведении предыдущего аукциона было опубликовано в газете «Звязда» № 201 (27811) от 22.10.2014 года.**

**Полный текст извещения о проведении аукциона размещен на сайте Жлобинского райисполкома gisp.gov.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ 9 июня 2015 г. по продаже объектов недвижимости в г. Пинске

| **Наименование объекта** | Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-43055 «Блок закрытых складов» | Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-43065 «Склад материалов» | Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-43066 «Склад металла с бетонной площадкой» | Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-40762 (здание лесопильного цеха) с прилегающей бетонной площадкой и инженерными коммуникациями и трансформаторной подстанцией |
|---|---|---|---|---|
| **Номер лота** | **1** | **2** | **3** | **4** |
| **Местонахождение объекта** | г. Пинск, ул. Калиновского, 11/9 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11/10 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11К | г. Пинск, ул. Калиновского, 11В |
| **Продавец объекта** | ТОРГОВОЕ УНИТАРНОЕ ПРЕДПРИЯТИЕ «ПриБут» | | | |
| **Тип помещения** | Отдельно стоящее | Отдельно стоящее | Отдельно стоящее | Отдельно стоящее |
| **Общая площадь (кв.м)** | 1315 | 62 | 4101,1 | 2458 |
| **Площадь земельного участка для обслуживания строения (га)** | 0,2629 | 0,0229 | 0,5833 | 1,2294 |
| **Начальная цена (бел. рублей)** | 1 585 800 000 | 96 000 000 | 1 168 000 000 | 3 000 468 067 |
| **Сумма задатка (бел. рублей)** | 158 580 000 | 9 600 000 | 116 800 000 | 300 046 807 |
| **Условия продажи** | Разовый платеж | Разовый платеж | Разовый платеж | Рассрочка платежа в течение 3 мес. |
| **Характеристика объекта, площадь земельного участка (кв.м), решение об отводе земельного участка** | Одноэтажный, состоит из 4-х закрытых (изолированных) складских помещений с двумя подсобными (служебными) помещениями площадью 24,4 м². По всему периметру блока имеется рампа площадью 467 м². К блоку примыкает огражденная бетонная площадка 397 м². Ввод в эксплуатацию – 1972 г. | Одноэтажный, состоит из двух складских помещений: 31,2 м² и 30,8 м², бетонного крыльца 8 м². Ввод в эксплуатацию – 1972 г. | Открытый, состоящий из огражденной ж/б панелями бетонной площадки 2087,5 м² и неогражденной бетонной площадки 1681,5 м², бетонного покрытия 331,8 м², подземного кабеля АСБ 3*50 протяженностью 28,8 м. Ввод в эксплуатацию – 1972 г. | Здание лесопильного цеха двухэтажное с административным и санитарно-бытовыми помещениями, специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева. Введено в эксплуатацию в 1983 году. |
| **Организатор аукциона** | **ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии»** | | | |

**Аукцион состоится 9 июня 2015 года в 11.00 по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11 в актовом зале.**

Перечень необходимых документов:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии».

2. *Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет ТУП «ПриБут» р/счет 3012156959005 в ОАО «Белвнешэкономбанк» в г. Пинске, код 153001226, УНП 291190544, срок внесения суммы задатка – по 8 июня 2015 г. включительно.*

3. Индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов.

4. Юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, и их подлинники, для заверения их копий организатором торгов.

5. Представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор торгов имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 3-х рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона; подписать договор купли-продажи недвижимого имущества в течение 10-ти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11, каб. 2 с 9.00 до 15.00 по рабочим дням по 8 июня 2015 года включительно, тел. 80165-37-17-06, т./ф. (80165) 37-16-66, конт. тел. 375-29-964-26-37.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА
## ОРГАНИЗАТОР: ИВАНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

| | |
|---|---|
| **Адрес земельного участка** | Витебская обл, Чашникский район, Иванский с/с, аг. Иванск, ул. Почтовая, в районе жилого дома № 15 |
| **Кадастровый номер участка** | 225180802601000194 |
| **Площадь, га** | 0,0048 |
| **Целевое назначение (назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества)** | для установки и обслуживания торгового павильона (земельный участок для размещения объектов розничной торговли) |
| **Характеристика территории и расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений и сооружений; инженерно-геологические условия*** | инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ |
| **Условия проведения аукциона** | Наличие не менее двух участников;<br>Заключение с Иванским сельским исполнительным комитетом соглашения;<br>Победителю аукциона либо в случае признания аукциона несостоявшимся, единственному участнику несостоявшегося аукциона, выразившего согласие на предоставление ему земельного участка в аренду:<br>- возместить расходы, связанные с проведением аукциона;<br>- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка;<br>- заключить с Иванским сельским исполнительным комитетом договор аренды земельного участка;<br>- обратиться в течение двух месяцев со дня заключения договора аренды земельного участка в установленном порядке за государственной регистрацией прав, ограничений (обременении) прав на него в Чашникское бюро Лепельского филиала республиканского унитарного предприятия «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;<br>- получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий два года;<br>- занять данный участок в соответствии с целью и условиями его предоставления в течение шести месяцев, со дня государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него;<br>- снять плодородный слой с площадок застройки и использовать его для благоустройства отводимого участка. |
| **Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории** | подключение к сетям и сооружениям инженерной инфраструктуры выполняется по техническим условиям эксплуатирующих организаций с учетом нагрузок, определенных при разработке ПСД |
| **Срок аренды (лет)** | 10 лет |
| **Начальная стоимость (руб.)** | 24 599 |
| **Сумма задатка (руб.)** | 2 459 |
| **Стоимость расходов по подготовке и изготовлению документации, подлежащих возмещению (руб.)** | 17 398 036 |
| **Дата и место проведения аукциона, сроки приема документов** | Аукцион **состоится 8 июня 2015 года** по адресу: аг. Иванск, Чашникский район, ул. Центральная, 4 (здание Иванского сельисполкома), кабинет председателя сельисполкома. Заявления и пакет необходимых документов предоставляются участниками с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 **по 4 июня 2015 года** включительно по адресу: аг. Иванск, Чашникский район, Витебская область, ул. Центральная, 4 (кабинет управляющего делами). |

* *Инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ.*

1. К участию в аукционе допускаются физические и юридические лица, индивидуальные предприниматели, подавшие в установленном порядке заявление на участие в аукционе, а также заверенную копию платежного поручения о внесении задатка, кроме того, в комиссию предоставляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

*Сумма задатка перечисляется на расчетный счет 3600329022037 в ЦБУ № 222 филиала № 215 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Орша, МФО 150801647, УНП 300986438, код платежа 04002, получатель – Иванский сельский исполнительный комитет.*

Оплата стоимости предмета аукциона, подлежащая возмещению Победителем, осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола аукциона.

Контактные телефоны: 8 (02133) 2 46 35, 2 46 23.

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ
## НА СТРОИТЕЛЬСТВО ОБЪЕКТА:
## «Строительство материально-комплектовочного комплекса с административными помещениями на территории производственной базы по адресу: ул. Инженерная, 17 в г. Минске»

**Филиал «Тепломонтаж» открытого акционерного общества «Спецремонт»**
информирует физических и юридических лиц о создании объекта долевого строительства.

**1. Информация о застройщике.**

ЗАСТРОЙЩИК: открытое акционерное общество «Спецремонт». 01 сентября 2010 года зарегистрировано в едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей с регистрационным номером 100115167.

27.06.2012 в Устав внесено изменение № 3, согласно которому общество имеет филиал «Тепломонтаж» открытого акционерного общества «Спецремонт».

Приказом № 88 от 22.04.2015 филиал «Тепломонтаж» ОАО «Спецремонт» выполняет функции заказчика объекта.

**Место нахождения застройщика:** Бетонный проезд, 13, 220036, г. Минск.

**Режим работы:** Понедельник–четверг 08.00–17.00, пятница 08.00–16.00, обеденный перерыв 12.10–13.00.

**2. Специальное разрешение (лицензия).**

Аттестат соответствия № 0000478-СТ на право осуществления строительства объектов первого-четвертого классов сложности, выдан Министерством архитектуры и строительства Республики Беларусь 06.10.2014 сроком по 06.10.2019.

Аттестат соответствия № 0000316-ГС на право выполнения функций генерального подрядчика, выдан Министерством архитектуры и строительства Республики Беларусь 06.10.2014 сроком по 06.10.2019.

**3. Информация о проекте.**

**Цель строительства объекта** – строительство объекта «Строительство материально-комплектовочного комплекса с административными помещениями на территории производственной базы по адресу: ул. Инженерная, 17 в г. Минске». Предметом договора является строительство нежилых помещений.

**Объект долевого строительства** – прямоугольное в плане здание с размерами в осях 33,0 м х 39,45 м, состоящее из складского блока и пристраиваемого к нему блока административно-бытовых и производственных помещений, отделенных противопожарной стеной 2 типа.

Объект обеспечен всеми видами инженерного обеспечения (теплоснабжение, электроснабжение, водоснабжение и водоотведение).

Нормативная продолжительность строительства материально-комплектовочного комплекса с административными помещениями 13 месяцев.

Планируемое начало строительства – II квартал 2015 года.

Проектно-сметная документация разработана ООО «Проект-М».

**4. Застройщиком получены:**

- Решение Минского городского исполнительного комитета № 1339 от 29.05.2014 о разрешении проведения проектно-изыскательских работ и строительство материально-комплектовочного комплекса с административными помещениями на территории базы по ул. Инженерной, 17;

- Заключение государственной экспертизы (положительное) № 149-60/15 от 27.04.2015 дочернего республиканского унитарного предприятия «Госстройэкспертиза по г. Минску»;

- свидетельство (удостоверение) № 500/973-2063 о государственной регистрации перехода прав, ограничений (обременений) прав на земельный участок (право постоянного пользования) с кадастровым номером 500000000002004686 площадью 0,4242 га РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

**5.** Материально-комплектовочный комплекс с административными помещениями запроектирован в форме прямоугольника в плане, состоящего из двух совмещенных зданий: 4-этажного здания АБК общей площадью 1 536,0 м² и складского блока площадью 916,80 м² с высотой до низа строительных конструкций 9 м.

Здание АБК – 4-этажное, без подвала и технического этажа. В здании запроектированы:

- на 1-этаже – буфет, кабинеты, бытовые помещения, кладовые, электрощитовая, тепловой пункт;
- на 2-4 этажах – административные помещения;
- на кровле здания – венткамера.

Здание склада – одноэтажное, без подвала. Наружные стены из сэндвич-панелей. Для погрузки-выгрузки предусмотрены ворота в количестве 4 штук с докшелтерами. Обслуживание склада предусмотрено электропогрузчиком, хранение продукции – паллетное.

**6. Стоимость одного квадратного метра** общей площади на день публикации декларации ориентировочно составляет 13 500 000 рублей.

**7. Сведения о благоустройстве.**

Озеленение, организация дорожных покрытий, благоустройство прилегающей территории.

После заключения договора создания объекта долевого строительства, Дольщик получает право по согласованию с Застройщиком посещать место строительства объекта недвижимости в установленное Заказчиком время, соблюдая при этом требования техники безопасности, и, в установленном порядке, знакомиться с ходом строительства.

Ознакомление дольщиков с объектом долевого строительства и дополнительной информацией для заключения договоров создания объектов долевого строительства осуществляется филиалом «Тепломонтаж» ОАО «Спецремонт» по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, Бетонный проезд, 17, кабинет № 1 (приемная), контактные телефоны 208-68-88, 8033 300-37-21.

***ОАО «Спецремонт»***

■ Народнае шоу

# ЯНЫ САПРАЎДЫ МОГУЦЬ!

## Таленавітыя ў пройгрышы не застаюцца ніколі

**Галоўная інтрыга маштабнага праекта Белтэлерадыёкампаніі — народнага шоу «Я магу» — вырашылася напрыканцы мінулага тыдня. У прамым эфіры тэлеканалаў «Беларусь 1» і «Беларусь 24» тэлегледачы змаглі ўбачыць выступленні 24 канкурсантаў, а потым прагаласаваць за сваіх фаварытаў. Пераможцам стаў танцавальны калектыў INFINITY з Віцебска. Менавіта гэтай камандзе дастаўся аўтамабіль GEELY EX7 і грашовы прыз.**



Танцавальны калектыў INFINITY стаў пераможцам «Я магу».

Найлепшага ўдзельніка шоу гледачы выбралі ў ходзе закрытага галасавання пасля прагляду творчых нумароў. Назіраць на працягу больш чым чатырох гадзін за выступленнямі кожнага змаглі і журналісты, якія разам з фіналістамі глядзелі тэлетрансляцыю і рабілі свае стаўкі. Аднак за кадрам у той вечар было не менш адкрыццяў і эмоцый, чым на экранах...

...Да пачатку выхаду шоу ў эфір застаюцца лічаныя хвіліны. Нехта настройваецца псіхалагічна, іншыя размінаюць мышцы ў шпагаце... Дух спаборніцтва сярод удзельнікаў амаль не адчуваецца: кожнага канкурсанта, які вяртаецца са сцэны, сустракаюць такімі апладысментамі, быццам усе «хварэюць» толькі за яго.

На працягу васьмі месяцаў беларусы ва ўсіх рэгіёнах краіны жылі праектам разам з удзельнікамі, падтрымлівалі лепшых сваімі галасамі ў кожным паўфінале. Таму ў фінале, карыстаючыся магчымасцю, захацелася даведацца пра эмоцыі і перажыванні ў саміх канкурсантаў. Пакуль на сцэне паказвала свой талент студыя сучаснага танца ANANKO DANCE SCHOOL з Баранавіч, вырашыла пазнаёміцца з удзельнікам Jazz City Banda.

— Настрой перад фіналам проста фантастычны! Будзем здзіўляць публіку сваім музычным нумарам, — дзеліцца Аляксандр. — Мы пакуль што не да канца ўсвядомілі, наколькі важны для нас гэты праект. Але хочацца зрабіць новы крок у творчасці, пашырыць сваю аўдыторыю.

І з музыкантам цяжка не пагадзіцца, бо шоу сапраўды дало магчымасць многім непрафесіяналам заявіць пра сябе на ўсю Беларусь і не толькі, улічваючы, што яно транслявалася яшчэ і на тэлеканале «Беларусь 24». У фінале засталіся 24 лепшыя нумары. І вось ён, вечар апошніх крокаў да перамогі! Градус інтрыгі з кожным выступленнем павышаецца.

За маёй спінай ізноў раздаюцца апладысменты. Вітаюць Лізу Панасюк з Брэста, якая толькі што зачароўвала сваім спевам у стылі ёдаль.

— Я бязмежна шчаслівая ад таго, што зноў удалося выйсці на вялікую сцэну. Безумоўна, кожны з нас спадзяецца на перамогу, але мне асабіста гэтае шоу ўжо дало пэўны вопыт і шмат эмоцый. Я атрымала карысныя парады ад журы і знайшла новых сяброў, з якімі мы і сёння падтрымліваем стасункі ў сацыяльных сетках, — дзеліцца канкурсантка.

Закрывае першую частку канцэрта мастачка Святлана Саўчук з вёскі Мельнікі Брэсцкай вобласці. Яе талент маляваць партрэты даспадобы як прафесіяналам, так і самім канкурсантам. Гэта тая самая дзяўчына, што на кастынгу намалявала партрэт спевака Тэа, а на паўфінальным спаборніцтве прадставіла публіцы партрэт тэлевядучай Святланы Бароўскай. Падчас фіналу мастачка стварыла сапраўдную інтрыгу, пакуль малявала на шасці палотнах партрэт беларускага песняра Уладзіміра Мулявіна. Самі ж удзельнікі шоу рэагуюць на з'яўленне Святланы бурна. Нехта скандзіруе «Малайчына!», чуюцца гучныя апладысменты, да яе падыходзяць з просьбай сфатаграфавацца і зычаць поспеху...



Святлана САЎЧУК і яе твор.

— Не перадаць словамі, што я адчуваю... Я была проста ў шоку, калі гледачы апладзіравалі стоячы, — дзеліцца эмоцыямі Святлана.

Дзяўчыне многія прагназавалі ў той вечар перамогу, аднак яна была не адзінай, хто здзіўляў сваім талентам. З ліку такіх нумароў і дуэтнае выступленне Аляксея Паўловіча і Ігара Задарожнага. Адзін іграў на хрустальных келіхах, а другі — на... зубах! Спытала ў маладога чалавека з Брэста, адкуль такое незвычайнае захапленне?

— Быў у маім жыцці перыяд, калі я цікавіўся, якія гукі можна «дастаць» з галавы. Паверце, раней я куды лепш іграў, чым цяпер, — усміхаецца Аляксей. — З некаторымі мы тут нават спаборнічалі, аднак не ва ўсіх зубы і пазногці вытрымліваюць...

Як прызнаўся хлопец, сваё захапленне ён ніколі не папулярызаваў, хоць займаецца гэтым ужо 16 гадоў. Яму гэты занятак крыху надакучыў ужо, але часам такое ўменне можа ўратаваць сітуацыю. Аднаго разу ў хлопца зламалася магнітола ў машыне, і Аляксей усю дарогу на трасе Брэст—Івацэвічы іграў сам сабе Шуберта, Моцарта і іншых класікаў, каб не сумна ехаць было...

**Віталь ВАРАНКО, спявак:**

**— Я прыйшоў не толькі паглядзець гэтае шоу і «пахварэць» за аднаго з таленавітых канкурсантаў — гітарыста FERGIO. Калі ехаў сюды, то сачыў анлайн за ўсім. Узровень удзельнікаў прыемна ўражвае. А калі казаць пра здымкі шоу, тут назіраецца не проста рост, а праца на сусветным узроўні.**

**Яўген ПЕРЛІН, тэлевядучы:**

**— Гэта беларускае шоу талентаў, што само па сабе цудоўна. Апошнім часам многія таленавітыя людзі сталі ездзіць на такія праекты то ў Кіеў, то ў Маскву, а чаму мы не можам зрабіць нешта такога кшталту? Я прыемна здзіўлены высокім узроўнем падрыхтоўкі канкурсантаў. Хаця ў большасці сваёй выступалі аматары, але кожны з іх працуе, як прафесіянал. Мне вельмі спадабаўся нумар Святланы Саўчук, эмацыйна ўразіў нумар Дзмітрыя Іваненкі, таму што яго пасыл пра сям'ю вельмі шчыры і актуальны для нашай рэчаіснасці. Наогул тут талент кожнага бачыш адразу.**

**Вольга ШЛЯГЕР, кіраўнік народнага шоу «Я магу»:**

**— Наша праца яшчэ не завершана. Афармляем розныя дакументы на атрыманне прыза і гэтак далей. Прыемна чуць і чытаць водгукі на праект. Ацэнка людзей з'яўляецца для нас самай важнай. Хваляванне на фінальным шоу ў мяне, безумоўна, прысутнічала, таму што калі робіш праект на працягу дзевяці месяцаў, пачынаеш ім жыць. Ганаруся і камандай, якая працавала на праекце, і ўдзельнікамі, што паказалі сябе як прафесіяналы, нягледзячы на тое, што сцэна і тэлебачанне для многіх былі ў навінку. Ці будзе працяг? Пажывём — пабачым, а цяпер зробім паўзу. Хаця ёсць пажаданні, каб быў другі сезон.**

Дарэчы, пра аўтамабілі. Галоўны прыз праекта — той самы GEELY EX7 — даставілі ў Палац спорту за некалькі гадзін да эфіру па спецыяльным зялёным калідоры ў суправаджэнні ДАІ, а падчас фінальнага шоу аўтамабіль чакаў сваіх новых гаспадароў у суседнім павільёне. Менавіта з мэтай выйграць гэты прыз і прыйшлі на праект некаторыя ўдзельнікі. Але былі і тыя, хто жадаў перамогі не толькі для сябе. Канкурсант Дзмітрый Іваненка з Маладзечна хацеў выйграць і аддаць грашовы прыз на лячэнне хворай дзяўчынкі Настассі Сарокі. З яе гісторыяй сям'я ўдзельніка пазнаёмілася ў інтэрнэце.

— У нас так заведзена: інтарэс аднаго — гэта інтарэс усёй сям'і. Наогул такія мерапрыемствы для нашага таты не ў навінку, а вось за дзяцей перажывала. Але ж сын, яму яшчэ няма трох гадоў, хутка асвоіўся і на сцэне, і за кулісамі, — кажа жонка артыста Таццяна.

Захацелася папытаць і ў мужчыны, якога запрыкмеціла сярод фіналістаў дзякуючы форме МНС, каму ён прысвеціць сваю перамогу. Аляксандр Якаўлеў — дыспетчар МНС з Віцебска. Ратаваць людзям жыццё — яго праца, а выступаць на сцэне — прызванне.

— Я выступаю апошнім нумарам. Хоць на сцэне не першы год, але кожны раз хвалююся. Радуе, што на шоу ўсё сумленна, чуеш аб'ектыўныя ацэнкі ад суддзяў, — адзначае Аляксандр Аляксандравіч. — Тут кожны выступае ў сваім жанры, і ўсім хочацца перамагчы. І калі такая ўдача выпадзе мне, то прысвячу яе маме. Неўзабаве 9 Мая, мама падчас вайны страціла ўсіх родзічаў, а летам будзе адзначаць свой 90-гадовы юбілей.

...У выніку гледачы зрабілі свой выбар на карысць танцавальнага калектыву INFINITY з Віцебска. Аднак, упэўнена, гэты вечар запомніцца кожнаму фіналісту як уласны жыццёвы трыумф на сцэне народнага шоу. Цяпер застаецца чакаць новых сустрэч з гэтымі таленавітымі беларусамі, якія даказалі, што сапраўды могуць многае.

**Алена ДРАПКО.**



Зрабіць любую прычоску пад сілу юнаму цырульніку з Гродна Эдуарду ВАСІЛЬЕВУ.

Фота Надзеі БУЖАН.




Аляксей ПАЎЛОВІЧ (справа) пасля свайго «зубнога» нумару.

## АЎТОРАК, 12 МАЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.40** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.45, 0.05** «Зона Х».
**9.10, 22.20 Серыял «След».**
**10.55, 20.00 Да 70-годдзя Перамогі. Дэтэктыў «Ваенная разведка. Заходні фронт».**



**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-3».**
**13.15** Хакей. Чэмпіянат свету. Нарвегія — Беларусь.
**15.30 Дэтэктыў «Добрае імя».**
**17.35** Беларуская часінка.
**18.40** Навіны рэгіёна.
**19.20, 0.20** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Спецыяльны рэпартаж.
**22.05** «За секунду да подзвігу». Фільм 1-ы.
**0.55** Дзень спорту.
**1.10 Серыял «Не пакідай мяне!».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.30** Тэлебарометр.
**9.05, 16.45 Дэтэктыў «Метад Фрэйда». 1-я серыя.**
**10.15** «Fitness».
**10.50 Да 70-годдзя Перамогі. Кінааповесць «Вецер вандраванняў».**
**12.20 Серыял «Косці».**
**14.05** Вышэй за дах.
**14.35, 18.55 Серыял «Інтэрны».**
**17.55 Серыял «Віртуозы» .**
**21.00** Цела чалавека.
**21.30** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**21.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Паўфінал. Матч у адказ. «Баварыя» — «Барселона».
**23.45 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**
**0.15 Серыял «Быць чалавекам».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.45, 12.15, 19.25, 23.55** Калейдаскоп.
**7.55, 18.35 «Ілюзія палявання». Серыял. 1-я серыя.**
**8.45, 19.35 «Дзяржаўная граніца». «Год сорак першы».**
**9.55, 23.05** «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
**10.20 «Стралец непрыкаяны». Трагікамедыя.**
**11.50, 23.30** «Святло далёкай зоркі». Памяці народнага мастака Беларусі Аляксандра Кішчанкі.
**12.30** «Жыццё і творчасць Макса Ларэнца». Дак. фільм.
**13.20 «Розныя лёсы». Меладрама.**
**15.05** «Розныя лёсы Таццяны Пілецкай». Дак. фільм.
**15.35** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**16.05** «Край». Сёстры Лук'яновіч.
**16.30 «Сяброў не выбіраюць». Кінараман.**
**17.40** Гала канцэрт XVIII тэлевізійнага фестывалю армейскай песні «Звязда».
**20.45** Калыханка.
**21.00** «Дыя@блог». «Пра мову».
**21.30 «Беларускі вакзал». Драма.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.00, 2.35** PRO спорт. Навіны.
**7.30** Час футбола.
**8.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Фінляндыя — Беларусь.
**10.15** Баскетбол. НБА. Плэй-оф.
**12.20** Спорт-кадр.
**12.50** Авертайм. ЧС-2015.
**13.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Канада — Аўстрыя.
**15.25** Тэніс. Турнір ВТА. Рым.
**17.10** Хакей. Чэмпіянат свету. ЗША — Славакія.
**19.25** Хакей. Чэмпіянат свету. Латвія — Францыя.
**21.15** Хакей. Чэмпіянат свету. Фінляндыя — Расія.
**23.35** Хакей. Чэмпіянат свету. Чэхія — Швейцарыя.
**1.40** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.55** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.05, 16.20** «Час пакажа».
**16.50** «Давай пажэнімся!».
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05** «Вайна машын. «Баявы «Сталінец».
**21.40 Серыял «Маладая гвардыя».**
**23.40 Серыял «Анёл або дэман».**
**0.35** «Вячэрні Ургант».
**1.10** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30 Маст. фільм «Афіцэры».**
**10.15** «Далёкія сваякі».
**10.40, 17.35** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!».
**13.50** «Верны сродак».
**14.45, 23.20 «Водблізкі». Серыял.**
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**18.30, 1.00 «Мяжа часу». Серыял.**
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Тэрыторыя памылак».
**22.00** «Глядзець усім!».
**23.00** «Аўтапанарама».

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Баявыя калясніцы Перамогі».
**9.25 Маст. фільм «Вяселле».**
**10.35 Маст. фільм «Вяртанне ў Брайдсхэд».**



**13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20, 3.25 Серыял «Дом без ахвяр».**
**14.15, 4.20 Серыял «Джамайка».**
**16.25, 0.35** Ток-шоу «Слова за слова».
**17.20 Серыял «Участковы дэтэктыў».**
**19.25 Маст. фільм «Інсайт».**
**21.05, 23.15 Серыял «Метад Лаўровай».**
**0.25** Навіны (бягучы радок). Галоўная тэма.
**1.30 Маст. фільм «Свята кахання».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.50 Маст. фільм «Дарагі мой чалавек».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.10** «Мая планета».
**18.00 Серыял «Апошні янычар».**
**18.55** «Асаблівы выпадак».
**20.55 Серыял «Крымінальная справа».**
**21.55, 23.10 Серыял «Папараць-кветка».**
**23.55** «У маі 1945-га. Вызваленне Прагі».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «Кава з малаком».
**9.00** «Сонечна. Без ападкаў».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара. Новыя серыі».**
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.15** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.15** «Справа густу».
**14.45** «Усё будзе добра!».
**15.40** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Ляснік».**
**23.10 Серыял «Другі шанц».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 14.05, 19.45, 21.00, 23.25** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.45, 19.50 Серыял «Спіраль».**
**8.20, 18.40 Серыял «Цнатлівая».**
**9.05** «Кінаблакнот».
**9.20, 13.50, 15.45, 17.00, 19.30, 20.55** «Хатняя крама».
**9.40 Серыял «Мерлін».**
**10.25, 23.30** «Хобі TV».
**10.55 Меладрама «Французскі пацалунак».**
**12.45 Серыял «Паклічце павітуху».**
**14.10 Серыял «Спас пад бярозамі».**
**16.30** «Золата маўчання».
**17.10 Серыял «Крызіс».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.15 Драма «Небяспечныя сувязі».**
**23.00 Серыял «Байкі са склепа».**

### Ваенкіно

## «ДЗЯСЯТЫ НАШ ДЭСАНТНЫ БАТАЛЬЁН»

**Вядома ж, ад пасляваеннага часу і дагэтуль ствараюцца фільмы, сюжэт якіх развіваецца падчас Вялікай Айчыннай. Тут невымоўны трагізм, батальныя сцэны, ваенная разруха, узрушальныя падзеі, забойствы, страта родных, геройства і іншае.**

Але вядома таксама, што хоць вайна ў 1945-ым і скончылася, будучыня асуджана была адчуваць водгалас і ўздзеянне мінулага.

Надышлі 25 гадоў, і стала зразумела, што безумоўнага шчасця не прыйшло, высокая мараль не стала абсалютам і мір — панацэя недаказаннае. Тады, у 1970 годзе, быў створаны фільм Андрэя Смірнова «Беларускі вакзал» — не са зброяй і геройствам савецкага народа, а пра тую самую сучаснасць, адзначаную разрывам паміж звычайнымі людзьмі, якія жылі і выхоўваліся быццам у розныя эпохі. У пранізлівай і шчырай карціне чацвёра былых франтавікоў-аднапалчан сустракаюцца ўпершыню пасля 1946 года (калі яны адзначалі дзень нараджэння свайго сябра Валянціна Мацвеева). Летам 1945-га Іван Прыходка, Мікалай Дубінскі, Віктар Харламаў, Аляксей Кірушын і Мацвееў расталіся на Беларускім вакзале і сустрэліся — праз 25 гадоў — на пахаванні апошняга.



Сёння гэта розныя людзі — слесар, дырэктар завода, бухгалтар і журналіст, але ў гледача будзе даволі часу і сітуацый, каб зразумець, што яны насамрэч падобныя. Гэта адзін «лагер», дзе адрозненне праяўляецца не ўнутры групы, а побач з маладзым пакаленнем. Ёсць (было) нешта, то бок вайна, якая, можа, і супраць волі, стварыла фон бясспрэчных ісцін. Пры сутыкненні з маладымі людзьмі ў рэстаране былыя аднапалчане выходзяць пераможцамі, але ж міліцыя становіцца на бок тых, у каго бацька з «чынам». Ганебная сучаснасць.

Класічнай стала сцэна, у якой сябры прыязджаюць да былой франтавой медсястры Раі. Жанчына бярэ гітару і спявае песню «Нам патрэбна адна перамога» («Дзясяты наш дэсантны батальён»), напісаную спецыяльна для фільма. Булат Акуджава прыдумаў тэкст і мелодыю, якую апрацаваў кампазітар Альфрэд Шнітке. Сёння песня стала класічнай і абавязковай у дзень святкавання гадавіны Вялікай Перамогі.

Спачатку фільм па сцэнарыі Уладзіміра Труніна планаваўся чорнабелым, але ў апошні момант было вырашана рабіць каляровую шырокаэкранную стужку. Была вызначана і аўдыторыя, на якую арыентаваліся стваральнікі фільма, — гэта ветэраны і ўсе тыя, хто мае дачыненне да часоў вайны. Але пасля прагляду становіцца зразумела, што гэтая карціна — ляшчэ і выклік сучаснаму (у любы год прагляду) грамадству. Таму што канстатуе: веліч подзвігу нашых дзядоў залежыць і ад нас саміх. За што яны змагаліся, калі некаторыя сёння адмаўляюць безумоўныя маральныя арыенціры? Насамрэч гэтых ісцін не так шмат, і лепш, каб выхоўвала і вучыла нас не вайна, а мы самі. У любым пакаленні.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

### ВТБ

**6.00, 4.30** «PLAY».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**8.00, 17.30, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30** Серыял «Вароніны».
**9.00, 18.00** Серыял «Два бацькі і два сыны».
**10.00, 20.00** Серыял «Анжаліка 2».
**11.00** Камедыя «Крутыя дзяўчаткі».
**13.00** Серыял «Ералаш».
**14.00** Серыял «Дочкі-маці».
**15.00, 3.00** «Давай развядзёмся!».
**16.00, 19.00** Серыял «Кахае не кахае».
**17.00** «Лаві момант».
**21.10** Камедыя «Цудоўная чацвёрка».
**23.00, 2.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.00, 4.00** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Зачараваныя».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.00, 23.00** Навіны культуры.
**10.15** «Наглядальнік».
**11.15** «Марыянеткі». Маст. фільм.
**12.55** «Шарль Кулон». Дак. фільм.
**13.00, 20.25** «Правілы жыцця».
**13.30** «Пятае вымярэнне».
**13.55, 1.40** «Чатыры танкісты і сабака». Маст. фільм.
**14.45** «Сусветныя скарбы культуры».
**15.10** «Міхаіл Булгакаў. Чорны снег». Фільм 1-ы.
**15.40** «Пяць вечароў». Маст. фільм.
**17.20, 0.50** Аляксандр Скрабін. Выбранае. Уладзімір Федасееў і БСА імя П.І. Чайкоўскага.
**18.00** «Мікалай Бурдэнка. Падзенне ўверх». Дак. фільм.
**18.30** Да юбілею Наталлі Івановай. «Барыс Пастэрнак: раскаваны голас». «Разбуджаны Богам».
**19.15** Галоўная роля.
**19.30** Штучны адбор.
**20.10** «Добрай ночы, малыя!».
**20.50** «Гульня ў бісер». «М.А. Булгакаў. «Белая Гвардыя».
**21.35** «Адлюстраваны час». Дак. серыял.
**22.05** «Натэла Таўстаногава. Люстэрка памяці». Дак. фільм.
**23.20** «Слоган». Маст. фільм.
**1.35** «Тамерлан». Дак. фільм.
**2.30** «Дом настаўніка». Дак. фільм.

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Акулы пяра». Леў Лешчанка. 1995 год.
**6.45, 7.35, 8.25, 8.55, 10.55, 11.40, 13.00, 14.45, 15.40, 16.55, 17.35, 19.00, 20.45, 21.40, 23.00, 23.25, 0.40, 2.00, 2.40, 3.55, 5.40** Музычная настальгія.
**7.00** «Бітламанія» з Д. Дзібровым. 2008 год.
**8.10** М/ф «Літары са скрыні радыста».
**8.50, 17.30, 23.20** «Прэс-экспрэс». 1994 год.
**9.30** Маст. фільм «Кааператыў «Палітбюро», або Будзе доўгім развітанне».
**11.30** М/ф «Як казакі ў хакей гулялі».
**12.00** The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. 2007 год.
**13.25** Маст. фільм «Вернасць».
**15.00, 21.00** «Мінулы час».
**16.00, 22.00, 1.00** «Народжаныя ў СССР».
**18.00** «Ялавая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім: «Гісторыя рускага рока». В. Цой «Дзеці хвілін». 3-я частка. 2008 год.
**19.20** Дак. фільм «Грамадзянін Сахараў».
**23.40** М/ф «Злосны разбівацель яек».
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1960-ы. 4-я частка. 30.05.2009 год.
**2.30** М/с «Болек і Лёлек».
**3.00** «Быў час». 2009 год.
**4.20** Маст. фільм «Аты-баты, ішлі салдаты».

### EUROSPORT

**9.30** Футбол. Еўрагалы.
**10.15** Конны спорт. Скачкі.
**10.30, 13.00, 18.30, 23.30** Веласпорт. Нацыянальны тур Італіі.
**18.45** Футбол. Чэмпіянат Еўропы для гульцоў (U-17).
**20.45** Тэніс. Рыхтуемся да «Ралан Гарос».
**21.00** Бокс. Чэмпіянат свету па версіі WBC. Самая лёгкая вага. S. Yamanaka (Японія) — G. Santillan (ЗША).
**23.00** Аўтагонкі. Мотагонкі «Загартоўка».
**2.00** Мотакрос. Чэмпіянат свету.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 17.40, 22.00, 3.10** Серыял «Былыя».
**6.45** Камедыя «Молі і Мопс».
**8.25** Камедыя «Два калядныя сабакі».
**10.45** Камедыя «Ёлкі 3».
**12.30** Камедыя «Трэнер па аднosінах».
**14.00, 14.50, 15.30** «Камедыянты (Шоу)».
**14.25, 15.15, 20.00, 21.45, 22.50, 0.40, 2.55, 5.40** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Камедыя «І не чырванее».
**18.25** Камедыя «А калі гэта каханне?».
**20.20** Дэтэктыў «Высокі бландзін у чорным чаравіку».



**23.10** Камедыя «Не злоўлены — не злодзей».
**1.15** Камедыя «Дзікая штучка».
**4.00** Камедыя «Каханне ад усіх хвароб».

### ТБЗ

**6.00** М/ф.
**7.20** «Доктар І..».
**7.50, 18.50, 1.50** «Эзэль». Серыял.
**9.40, 3.55** «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
**11.25, 17.50** «Справа Астахава». Дак. серыял.
**12.20, 16.55** «Сакрэты экстрасэнсаў». Дак. серыял.
**13.15, 20.50** «Шпіён». Серыял.
**14.10, 3.30** «Простыя складанасці».
**14.40, 1.05** «Управа». Серыял.
**15.30, 22.45** «Зорныя гісторыі».
**16.25, 5.30** «Нераскрытыя тайны».
**21.50, 0.20** «Шапавалаў». Серыял.
**23.35** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ТБ1000

**6.20, 1.50** Трылер «Дар».
**8.30, 16.15** Трылер «8 міліметраў».
**10.40** Фантастыка «Гатака».
**12.40** Камедыя «А вось і Полі!».
**14.15** Драма «Тайная цяга».
**18.20** Драма «Добрай ночы, Месяц».
**20.00** Фэнтэзі «Цудоўныя стварэнні».
**22.05** Драма «Сховішча».
**0.05** Камедыя «50 першых пацалункаў».
**4.00** Драма «Паляванне».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Драма «Вышыня 89».
**8.25** Драма «Аты-баты, ішлі салдаты...».
**10.05** Драма «Збавенне».
**12.20** М/ф «Тры волаты і Шамаханская царыца».
**13.45** Драма «Балі Балтасара, або Ноч са Сталіным».
**15.20** Камедыя «Лёгкі на ўспамін».
**16.50** Меладрама «На свеце жывуць добрыя і харошыя людзі».
**18.40** Камедыя «Апельсінавы сок».
**20.20** Камедыя «Вясёлая моладзь;)».
**21.55** Прыгоды «Квіток на Vegas».
**23.25** Драма «Брэсцкая крэпасць».
**1.45** Драма «Палёты ў сне і наяве».
**3.20** Меладрама «Улетку я адд даю перавагу вяселлю».
**4.55** Камедыя «З Новым годам, мамы!».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00, 11.40** Мегазаводы.
**6.45, 13.15, 22.30, 2.15, 5.15** Навуковыя недарэчнасці.
**7.10** Зрабі або памры.
**7.55, 10.55** Аўта-SOS.
**9.25, 14.00, 19.30** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**10.10, 14.45, 20.15** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**12.30** Старацелі.
**15.35** Тайны гарыл.
**16.20** Дзікая прырода Расіі.



**17.10, 3.00** Вайна генералаў.
**17.55, 21.00, 0.45, 3.45** Упраўленне натоўпам.
**18.40, 21.45, 1.30, 4.30** Узлом сістэмы.
**23.15** Расследаванні авіякатастроф.
**0.00** Паранармальнае.

### DISCOVERY

**8.00, 10.55, 15.55, 21.20** Як гэта зроблена?
**8.25, 10.30, 15.30, 21.45** Як гэта ўстроена?
**8.50, 11.20** Хуткія і гучныя.
**9.40, 13.50** Геній аўтадызайну.
**12.10, 18.00** Паляўнічыя на рэліквіі.
**13.00, 6.24** Скаваныя.
**14.40, 5.36** Скрыўленне часу.
**16.20, 4.00** Майстэрня «Фантом Уоркс».
**17.10, 23.00, 4.48** Махінатары.
**18.50** Аляска: сям'я з лесу.
**19.40** Зорнае выжыванне.
**20.30** Вострай.
**22.10** Гаражная каманда.
**23.50** З любові да машын.
**0.40, 3.10** Скарбашукальнікі Амерыкі.
**1.30, 7.12** Top Gear.
**2.20** Маланкавыя катастрофы.
**2.45** Сапраўдныя аферысты.

## СЕРАДА, 13 МАЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.35** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.00** «Зона Х».
**9.10, 22.20 Серыял «След».**
**10.55, 20.00 Да 70-годдзя Перамогі. Дэтэктыў «Ваенная разведка. Заходні фронт».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-3».**
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «Маша ў законе!-2». 1-я серыя.**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Дэтэктыў «Добрае імя».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.20** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.05** «За секунду да подзвігу».
**0.55** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.30** Тэлебарометр.
**9.05, 16.35 Дэтэктыў «Метад Фрэйда».**
**10.15** Беларуская кухня.
**10.50 Да 70-годдзя Перамогі. Драма «Святая».**
**12.35** «Зразумець і абясшкодзіць».
**13.05** Я хачу гэта ўбачыць!
**13.40** Рэпарцёр.
**14.25, 18.55 Серыял «Інтэрны».**
**17.55 Серыял «Віртуозы» .**
**20.55** Цела чалавека.
**21.30** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**21.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Паўфінал. Матч у адказ. «Рэал» — «Ювентус».
**23.45 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**
**0.15 Серыял «Быць чалавекам».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.25, 12.10, 19.25, 0.25** Калейдаскоп.
**7.35, 18.35 «Ілюзія паляванння». Серыял.**
**8.25 «Дзяржаўная граніца». «Год сорак першы». 2-я серыя.**
**9.35, 23.30** «Дыя@блог». «Пра прыгожае».
**10.00 «Розныя лёсы». Меладрама.**



**11.40** «Розныя лёсы Таццяны Пілецкай». Дак. фільм.
**12.20 «Аляксандр Неўскі». Маст. фільм.**
**14.05** «Наперад у мінулае».
**14.35 «Беларускі вакзал». Драма.**
**16.10** «Край». Скульптар Аляксандр Лазерка.
**16.35 «Сяброў не выбіраюць». Кінараман.**
**17.40** «Стэфанія Станюта. Маё жыццё...».
**19.35 «Дзяржаўная граніца». «За парогам перамогі». 1-я серыя.**
**20.45** Калыханка.
**21.05** «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
**21.30 «Развітанне». Драма.**
**0.00** «Свято далёкай зоркі». Памяці народнай артысткі СССР Стэфаніі Станюты.

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.00, 0.55** PRO спорт. Навіны.
**7.45** Хакей. Чэмпіянат свету. Нарвегія — Беларусь.
**9.50** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Паўфінал. Матч у адказ. «Баварыя» — «Барселона».
**11.45** Козел пра футбол.
**12.00, 22.00** Тэніс. Турнір ВТА. Рым.
**20.00** Спорт-кадр.
**20.30** Більярдны спорт. Чэмпіянат свету.
**0.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.55** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.05, 16.20** «Час пакажа».
**16.50** «Давай пажэнімся!».
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05** «Вайна машын. «БТ-7. Лятаючы танк».
**21.40 Серыял «Маладая гвардыя».**
**23.40 Серыял «Анёл або дэман».**
**0.35** «Вячэрні Ургант».
**1.10** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Дэвід Каперфільд: каханне, шпіянаж і іншыя фокусы».
**10.10** «Далёкія сваякі».
**10.40, 17.35** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!».
**13.50** «Верны сродак».
**14.45, 23.20 «Водбліскі». Серыял.**
**16.50** «Мінск і мінчане».
**18.30, 1.50 «Мяжа часу». Серыял.**
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Драма «Трусіная нара».**
**22.00** «Глядзець усім!».
**23.00** «Гарачы лёд».
**1.00** «Сакрэтныя тэрыторыі».

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Зроблена ў СССР».
**9.30 Маст. фільм «Журавелька».**
**11.05 Маст. фільм «Залезь на Месяц».**
**13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20, 3.10 Серыял «Прыгажосць на заказ».**
**14.15, 4.05 Серыял «Джамайка».**
**16.25, 0.35** Ток-шоу «Слова за слова».
**17.20 Серыял «Участковы дэтэктыў».**
**19.25 Маст. фільм «Выкрасці Бельмандо».**
**21.30, 23.15 Серыял «Метад Лаўровай».**
**0.25** Навіны (бягучы радок). Галоўная тэма.
**1.30 Маст. фільм «Урокі ваджэння».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35, 17.10** «Геній з «шарашкі». Авіяканструктар Бартыні».
**12.30 Маст. фільм «Маёр «Віхор».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**18.00 Серыял «Апошні янычар».**
**18.55** «Асаблівы выпадак».
**20.55 Серыял «Крымінальная справа».**
**21.55, 23.10 Серыял «Кветка папараці».**
**23.55** «Спецыяльны карэспандэнт».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «Кава з малаком».
**9.00** «Сонечна. Без ападкаў».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара. Новыя серыі».**
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.15** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.15** «Справа густу».
**14.45** «Усё будзе добра!».
**15.40** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.35 Серыял «Ляснік».**
**23.10 Серыял «Другі шанц».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 14.10, 19.45, 21.00, 23.40** «Надвор'е».
**7.05, 16.05** Мультпарад.
**7.45, 19.50 Серыял «Спіраль».**
**8.30, 18.40 Серыял «Цнатлівая».**
**9.30** «Кінаблакнот».
**9.45 Серыял «Мерлін».**
**10.30** «Адшукваецца адпачынак».
**11.00 Камедыя «Вясёлы вялікдзень».**
**12.45 Серыял «Паклічце павітуху».**
**13.55, 15.50, 17.00, 19.30, 20.55** «Хатняя крама».
**14.15 Серыял «Спас пад бярозамі».**
**16.30** «Золата маўчання».
**17.10 Серыял «Крызіс».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05 Драма «Гульні патрыётаў».**
**23.10 Серыял «Байкі са склепа».**

### ВТБ

**6.00, 4.30** «PLAY».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**8.00, 17.30, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30** Серыял «Вароніны».
**9.00, 18.00** Серыял «Два бацькі і два сыны».
**10.00, 20.00** Серыял «Анжаліка 2».
**11.00** Камедыя «Цудоўная чацвёрка».
**12.50** Серыял «Ералаш».
**14.00, 1.00** Серыял «Дочкі-маці».
**15.00, 3.00** «Давай развядзёмся!».
**16.00, 19.00** Серыял «Кахае не кахае».
**17.00** «Лаві момант».
**21.10** Камедыя «Сардэчна запрашаем на поўдзень».
**23.15** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.00, 4.00** «Дурні і дарогі».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.00, 23.00** Навіны культуры.
**10.15** «Наглядальнік».
**11.15** «Новы Гулівер». Маст. фільм.
**12.30** «Аляксандр Птушко». Дак. фільм.
**13.10, 18.15** «Сусветныя скарбы культуры».
**13.30** «Красуйся, горад Пятроў!».
**13.55, 1.55** «Чатыры танкісты і сабака». Маст. фільм.
**15.10** «Міхаіл Булгакаў. Чорны снег».
**15.40** «Выпадковая сустрэча». Маст. фільм.
**16.45** Джозэф Калейя і Нікола Бэнэдэці ў Гала-канцэрце фестывалю «ВВС Proms» у Альберт-холе.
**18.30** Да юбілею Наталлі Івановай. «Барыс Пастэрнак: раскаваны голас». «Сястра мая — жыццё».
**19.15** Галоўная роля.
**19.30** «Абсалютны слых».
**20.10** «Добрай ночы, малыя!».
**20.25** «Правілы жыцця».
**20.50** Улада факта. «Перасяленцы».
**21.35** Ступені цывілізацыі. «Боскае правасуддзе Кромвеля». Дак. фільм. 1-я серыя.
**22.30** «Тыя, з якімі я...». «Аднакласнікі. Леў Додзін». Частка 1-я.
**23.20** «Аголены Ленан». Маст. фільм.
**0.45** Юрый Башмет і Камерны ансамбль «Салісты Масквы». «Прынашэнне Святаславу Рыхтэру».
**1.30** «Мікалай Бурдэнка. Падзенне ўверх». Дак. фільм.

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. 2007 год.
**7.00, 8.45, 9.40, 10.55, 11.35, 12.55, 14.50, 15.40, 16.55, 17.25, 18.35, 19.10, 21.40, 23.45, 0.40, 1.35, 2.25, 2.55, 4.55, 5.45** Музычная настальгія.
**7.25** Маст. фільм «Вернасць».
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.30, 17.20, 2.50** «Прэс-экспрэс». 1994 год.
**12.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім: «Гісторыя рускага рока». В. Цой «Дзеці хвілін». 3-я частка. 2008 год.
**13.20** Дак. фільм «Грамадзянін Сахараў».
**17.40** М/ф «Злосны разбівацель яек».
**18.00** «Эліта краіны Саветаў». Праўдаруб Аляксандр Якаўлеў. 2008 год.
**19.00** М/ф «Справа даручаецца дэтэктыву Тэдзі».
**19.30** Маст. фільм «Дзе ты, Багіра?».
**23.00** «Я сама». Тэма: «Я аддала дзяцей мужу». 1995 год.
**0.00** «Акулы пяра». Леў Лешчанка. 1995 год.
**1.00** «Бітламанія» з Д. Дзібровым. 2008 год.
**2.10** М/ф «Літары са скрыні радыста».
**3.30** Маст. фільм «Кааператыў «Палітбюро», або Будзе доўгім развітанне».
**5.30** М/ф «Як казакі ў хакей гулялі».

### EUROSPORT

**9.30, 13.00, 18.45** Футбол. Чэмпіянат Еўропы для гульцоў (U-17).
**10.30, 12.15, 15.15, 18.30, 23.05, 2.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Італіі.
**20.45** Кампус.
**21.15, 22.55** Выбранае па серадах.
**21.20** Навіны коннага спорту.
**21.25** Конны спорт. Кубак нацый Люмен.
**21.40** Гольф. Тур PGA. The Players Championship.
**22.40** Гольф-клуб.
**22.45** Лепшае за месяц.
**22.50** Парусны спорт. Яхт-клуб.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 17.35, 22.00, 3.10** Серыял «Былыя».
**6.45** Камедыя «Два калядныя сабакі».
**8.25** Камедыя «Трэнер па адносінах?».
**10.45** Камедыя «І не чырванее».
**12.30** Камедыя «А калі гэта каханне?».
**14.00, 14.50, 15.30** «Камедыянты (Шоу)».
**14.25, 15.15, 19.50, 22.50, 0.40, 2.55, 5.35** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Камедыя «Не злоўленыя — не злодзеі».
**18.20** Дэтэктыў «Высокі бландзін у чорным чаравіку».
**20.20** Камедыя «Каханне і іншыя катастрофы».
**23.10** Камедыя «Маленькі свет».
**1.15** Камедыя «Ёлкі 3».
**4.00** Камедыя «Дзікая штучка».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.15** «Доктар І..».
**7.45, 18.45, 1.50** «Эзель». Серыял.
**9.35, 3.55** «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
**11.20, 17.50** «Справа Астахава». Дак. серыял.
**12.15, 16.55** «Сакрэты экстрасэнсаў». Дак. серыял.
**13.10, 20.45** «Шпіён». Серыял.
**14.05, 3.30** «Простыя складанасці».
**14.35, 1.05** «Управа». Серыял.
**15.30, 22.40** «Зорныя гісторыі».
**16.25, 5.30** «Нераскрытыя тайны».
**21.45, 0.20** «Шапавалаў». Серыял.
**23.30** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ТБ1000

**6.10** Камедыя «50 першых пацалункаў».
**8.00** Камедыя «А вось і Полі!».
**9.40** Меладрама «Знесеныя».
**11.20** Фэнтэзі «Залаты компас».
**13.20** Камедыя «Нагледзеўшыся дэтэктываў».
**15.00** Баявік «Агент пад прыкрыццём».
**16.40** Камедыя «Імаджэн».
**18.25, 4.25** Меладрама «Будзь маім хлопцам на пяць хвілін».
**20.00** Меладрама «Да цуду».
**21.55** Фантастыка «Галодныя гульні».
**0.20** Драма «Вялікія надзеі».
**2.30** Драма «Нешта не так з Кевінам».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Драма «Захоўвай мяне, мой талісман».
**7.50** Меладрама «На ростані».
**9.30** Драма «З каханымі не расставайцеся».
**10.55** Трагікамедыя «Зусім не простая гісторыя».
**12.55** Меладрама «Вернасць».
**14.30** Прыгоды «Квіток на Vegas».
**16.05** М/ф «Тры валаты і Шамаханская царыца».
**17.30** Трагікамедыя «Пра жонку, мару і яшчэ адну...».
**18.50** Камедыя «Калачы».
**20.20** Трагікамедыя «Аддаць канцы».
**22.05** Драма «Юда».
**0.00** Фантастыка «Цёмны свет: Раўнавага».
**1.40** Камедыя «Джунглі».
**3.10** Драма «Жанаты халасцяк».
**4.40** Меладрама «Кароткія сустрэчы».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00, 11.40** Мегазаводы.
**6.45, 13.15, 2.15, 5.15** Навуковыя недарэчнасці.
**7.10** Зрабі або памры.
**7.55** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**8.40** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**9.25, 14.00, 19.30** Кіраванне натоўпам.
**10.10, 14.45, 20.15** Узлом сістэмы.
**10.55** Аўта-SOS.
**12.30** Старацелі.
**15.35** Каралева тыграў.
**16.20** Дзікая прырода Расіі.
**17.10, 3.00** Вайна генералаў.
**17.55, 21.00, 0.45, 3.45** Шаша праз пекла.
**18.40, 21.45, 1.30, 4.30** Дзікі тунец.
**22.30** Золата ў халоднай вадзе.
**23.15** Расследаванні авіякатастроф.
**0.00** Паранармальнае.

### DISCOVERY

**8.00, 10.55, 15.55, 21.20** Як гэта зроблена?
**8.25, 10.30, 15.30, 21.45** Як гэта ўстроена?
**8.50, 11.20** Скрыўленне часу.
**9.40, 13.50** Майстэрня «Фантом Уоркс».
**12.10, 18.00** Скарбашукальнікі Амерыкі.
**13.00, 0.40, 6.24** Майстар па стварэнні басейнаў.
**14.40, 5.36** Не спрабуйце паўтарыць.
**16.20, 4.00** Пятая перадача.
**17.10, 20.30, 4.48** Махінатары.
**18.50** З любові да машын.
**19.40** Гаражная каманда.
**22.10** Паляўнічыя на рэліквіі.
**23.00** Экстрэмальныя калекцыянеры.
**23.50** Скарбы з каморкі.
**1.30, 7.12** Top Gear.
**2.20** Маланкавыя катастрофы.
**2.45** Сапраўдныя аферысты.
**3.10** Багажныя войны.

## Гараскоп на



**АВЕН.** Удача будзе неадрыўна ісці за вамі, так што паспрабуйце як мага больш поўна выкарыстаць гэты шанц і не прапусціць магчымасці. Гэта будзе час актыўных дзеянняў. Перамен у асабістым жыцці і на працы не варта баяцца, наадварот, неабходна прыкласці намаганні для таго, каб атрымаць як мага больш ад гэтых перамен. Магчымыя нязначныя праблемы са здароўем, але не сур'ёзныя. Вырашаць грашовыя пытанні ў гэты час не варта.



**ЦЯЛЕЦ.** Наступае найбольш удалы час для таго, каб адправіцца ў падарожжа або заняцца спортам. Калі вы даўно хацелі з'ехаць за мяжу або проста выбрацца на прыроду, то смела зрабіце гэта. Не варта турбавацца за тыя справы, якія засталіся дома: у вас усё пад кантролем. Да таго ж лёс будзе добразычлівым і ў вас з'яўляцца магчымасці змяніць сваё жыццё да лепшага, але толькі ў тым выпадку, калі будзеце прыслухоўвацца да голасу сэрца і інтуіцыі.



**БЛІЗНЯТЫ.** Пачатак тыдня будзе вельмі эмацыйным. Калі вам здаецца, што справы не ладзяцца і ўсё валіцца з рук, то наступіў момант для таго, каб сабрацца і перастаць скардзіцца. Асабліва негатыўна выглядае канец тыдня, калі вас могуць папрасіць пасунуцца з наседжанага і звыклага для вас месца, з-за чаго можа пахіснуцца ваша жыццё. Паспрабуйце цвяроза ацаніць сітуацыю — усё не настолькі жудасна, як вы сабе ўяўляеце, і ўсе праблемы вырашальныя.



**РАК.** Пачатак тыдня для вас выдасца сумным і нецікавым, вам захочацца пайсці ад навакольнага свету далей, засцерагчы сябе ад шуму і мітусні. У першай палове тыдня вам, можа, гэта ўдасца. Да сярэдзіны тыдня ў вас могуць папрасіць у доўг або папрасіць яго аддаць, у гэтым выпадку не варта адмаўляць, калі такая магчымасць маецца. Асаблівая актыўнасць праявіцца бліжэй да канца тыдня. Гэты час добра прысвяціць вырашэнню нескладаных спраў або актыўнаму адпачынку ў прыемнай кампаніі.



**ЛЕЎ.** У панядзелак і аўторак вы можаце адчуць сябе не ў сваёй талерцы і наогул лішнім, бо вас ніхто не будзе слухаць, а падзеі будуць адбывацца незалежным ад вас чынам. І можа быць, было б лепш, калі б вы і не спрабавалі ў іх умешвацца. Да сярэдзіны тыдня магчымыя канфлікты і непаразуменні сярод калег, хоць да сур'ёзнага разладу яны і не давядуць. Асабліва агрэсіўнымі вы можаце быць у канцы тыдня, калі захочаце скінуць з сябе цяжар апошніх дзён і сарвацца на блізкіх.



**ДЗЕВЫ.** Тыдзень будзе вельмі спрыяльным для вас, асабліва ў рамантычнай і сямейнай сферах. У пачатку тыдня адчуеце сябе цалкам задаволеным жыццём, і можа праявіцца цяга да празмернасцяў. Калі вы знаходзіцеся на ростанях, не турбуйцеся і не фарсіруйце падзеі — час і выпадак расставяць усё па сваіх месцах. Канец тыдня абяцае быць насычаным і цікавым, а таксама спрыяльным для зносін са сваякамі.

## СУБОТА, 16 МАЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

6.55 Існасць.
**7.25 Камедыя «Усё і адразу».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Клуб рэдактараў.
**9.45, 0.25 Камедыя «Кухня».**
**10.50** «Пра ежу!».
**11.25** Дача.
**12.10** «Здароўе». Ток-шоу.
**12.50** Кулінарная дыпламатыя.
**13.25** Выйсце ёсць.
**14.00 Серыял «Сямейныя меладрамы-3».**
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.30 Меладрама «Багатая Маша».**
**17.10** Нашы.
**17.25 Меладрама «Крывое люстэрка душы». 1–4-я серыі.**
**21.00** Панарама.
**21.40 Меладрама «Фота на дакументы».**
**0.25** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.55, 13.45, 16.00, 23.55** Калейдаскоп.
**8.05 «Выклікаем агонь на сябе». Драма. 1—4-я серыі.**
**13.15** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**13.55** «Роднай песні ваявода». Дак. фільм.
**14.25** «Русь былінная». Канцэрт казацкага ансамбля «Атаман».
**16.10 «Дванаццаць месяцаў». Казка.**
**18.30 «Візіт дамы». Трагіфарс.**



**20.45** Калыханка.
**21.05** «Раман з лёсам». «Айнебаліт». Жанчыны сяла.
**21.30 «Мая мачаха — іншапланецянка». Фантастыка.**
**23.15** «Подых струн». Музычная праграма. Госць: Наталля Нікіціна.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.05** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**8.00** Беларуская кухня.
**8.30 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**10.30** «Навуковае шоу прафесара Адкрывашкіна».
**11.00, 16.05** Тэлебарометр.
**11.05** Капейка ў капейку.
**11.40** «Бітва экстрасэнсаў. Барацьба кантынентаў».
**13.35** Вось гэта дзіва!
**14.15 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**
**16.15** Хакей. Чэмпіянат свету. Паўфінал.
**18.55** «Comedy woman».
**20.15** Хакей. Чэмпіянат свету. Паўфінал. У перапынку: **21.35** Спартлато 6 з 49, КЕНО.
**22.30** «Перазагрузка». Маладзёжнае ток-шоу.
**23.15 Дэтэктыў «Знак правільнага шляху». 1-я і 2-я серыі.**
**0.50** Ікра.

### БЕЛАРУСЬ 5

**5.35** Баскетбол. НБА. Плэй-оф.
**8.00, 4.35** PRO спорт. Навіны.
**8.15** Селфі.
**8.30** Тэніс. Турнір ВТА. Рым. Чвэрцьфінал.
**10.35** Лёгкая атлетыка. Брыльянтавая ліга. Доха.
**13.10, 21.25** Тэніс. Турнір ВТА. Рым. Паўфінал.
**14.45** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Саўтгемптан» — «Астан Віла».
**16.55** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Шахцёр» (Салігорск) — БАТЭ (Барысаў).
**18.55** Піт-стоп.
**19.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Ліверпуль» — «Крыстал Пэлас».
**23.30, 1.40** Хакей. Чэмпіянат свету. Паўфінал.
**3.45** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
**9.25** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.05** «Ідэальны рамонт».
**12.05** «Разумніцы і разумнікі».
**13.05** «Наталля Багунова. Расколатая душа».
**14.05 Серыял «Ой, мамачкі!».**
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Барахолка».
**17.15** «100 мільёнаў».
**18.10** «Акадэмія талентаў. Курс чацвёрты».
**21.05** «Сёння ўвечары».
**22.40** «Розыгрыш». Лепшае.
**23.40** «Легенды Live». «Joe Cocker».
**0.20 Дэтэктыў «Джэк-Скакун».**

### СТБ

**5.50 Маст. фільм «У маёй смерці прашу вінаваціць Клаву К.».**
**7.05** «Анфас».
**7.20** «Тайны свету».
**8.15 Камедыя «Вар'яцкі заканы».**
**10.00** «Іншая краіна». «Грузінскі акцэнт».
**10.35** «Гэта — мой дом!».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.35 «Салдаты». Серыял.**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40, 0.30 «NEXT 2». Серыял.**
**15.20** «На 10 гадоў маладзейшы».
**15.55** «Вялікі горад».
**16.45** «Наша справа».
**16.55** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**17.35 Трылер «Жанчына-котка».**
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Маст. фільм «Дачка Д'Артаньяна».**
**22.30** «На тым жа месцы ў той жа час».
**23.40** «Масква. Дзень і ноч».

### МІР

**6.15 Маст. фільм «Волга-Волга».**
**8.10** «Саюзнікі».
**8.40** М/ф «Гісторыя аднаго злачынства».
**9.05** «Эксперыментатары».
**9.30** «Ой, мамачкі».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Любімыя акцёры».
**10.45 Маст. фільм «Адзінокім даецца інтэрнат».**
**12.25** М/ф «Брэменскія музыкі».
**12.50 Маст. фільм «Джэйн Эйр».**
**15.15** «Культпрасвет».
**16.15 Серыял «Варанька».**
**23.10 Маст. фільм «Дзікая штучка».**
**1.00 Маст. фільм «Не трэба баяцца кахаць».**
**3.50 Серыял «Маленькія тайны вялікіх людзей».**
**4.45 Маст. фільм «Падкідыш».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Ха». Маленькія камедыі.
**7.35** «Планета сабак».
**8.10, 11.10 Маст. фільм «Мядовае каханне».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.40** «Суботнік».
**12.20 Маст. фільм «Родная кроў».**
**14.15 Маст. фільм «Распла-та за каханне».**
**16.00** «Вызваліцелі». «Артылерысты».
**17.10** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.40 Маст. фільм «Таблетка ад слёз».**
**22.30 Маст. фільм «Дачка за бацьку».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.05, 8.20 Серыял «ППС».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.50** «Урачэбныя тайны плюс».
**9.25** «Справа густу».
**10.20** «Галоўная дарога».
**11.05** «Паедзем, паядзім!».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.20** «Другая сусветная. Вялікая Айчынная». «Зброя адплаты. Прадмет торгу Бормана».
**14.20 Маст. фільм «Таварыш Сталін».**
**16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.05** «Новыя рускія сенсацыі».
**22.05** «Ты не паверыш!».
**23.00 Камедыя «Афрадыты».**
**0.40** «Ахтунг, русіш!».

### 8 КАНАЛ

**9.00, 13.55, 19.00, 21.00, 23.35** «Надвор'е».
**9.05** М/ф.
**10.45 Серыял «Цнатлівая».**
**11.30** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**11.40, 15.45** «Хатняя крама».
**12.00 Камедыя «Назад у будучыню».**
**14.00 Камедыя «Назад у будучыню-2».**
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Камедыя «Прыгоды рабіна Якава».**
**18.15 Серыял «Месца злачынства Маямі».**
**19.05 Драма «Недатыкальныя».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Фэшн is my прафэшн».
**21.15 Трылер «Прамая і яўная пагроза».**
**23.40** «Хобі TV».

### ВТБ

**6.00** «PLAY».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**8.00, 17.00** Серыял «Ералаш».
**9.00** Серыял «Вароніны».
**10.00, 2.00** «Турбаміксер».
**12.00** Камедыя «Горш не бывае».
**13.50, 23.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**14.30** «Хатняя кухня».
**15.00, 5.00** Серыял «Калыска над безданню».
**17.30** «Уральскія пельмені».
**19.00** Серыял «Сямейны бізнес».
**20.30** Трылер «Заганная страсць».
**0.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**0.30, 4.30** «Лаві момант».
**1.00** «Нерэальная гісторыя».
**1.30** Скетчком «Студэнты».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** Біблейскі сюжэт.
**10.35** «Утаймаванне сваволь-най». Маст. фільм.
**12.00** Вялікая сям'я. Сяргей Газараў.
**12.55** Пернікавы домік. «Здымаем капялюш!».
**13.25** Да 100-годдзя пачатку Першай сусветнай вайны «Нефрантавыя нататкі». Дак. серыял.
**13.50** «Астравы». Андрэй Мягкоў і Анастасія Вазнясенская.
**14.30** Наталля Ценякова, Анастасія Вазнясенская, Уладзімір Красноў у спектаклі МХТ імя А.П. Чэхава «Рэтра» ў пастаноўцы Андрэя Мягкова.
**17.00** Да 90-годдзя Андрэя Эшпая. «Рака часоў». Дак. фільм.
**18.10** «Рамантыка раманса». У гонар Андрэя Эшпая!
**19.05** «Юрый Багатыроў». Дак. фільм.
**19.45** «Няскончаная п'еса для механічнага піяніна». Маст. фільм.
**21.25** «Раберта Аланья. Сіцылійская ноч». Канцэрт у Францыі.
**22.20** Калекцыя Пятра Шапашнікава. «Настальгія па Алегу». Дак. фільм.
**23.00** «Палюбоўнік». Маст. фільм.



**0.40** «Радыёхэд». Канцэрт са склепа.
**1.40** «Шут Балакіраў». М/ф для дарослых.
**1.55** «Шукальнікі». «Жалезны кароль Расіі».
**2.40** «Сусветныя скарбы культуры».

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Прэс-экспрэс». 1994 год.
**6.05, 6.50, 8.30, 11.00, 11.35, 12.55, 14.30, 15.40, 17.00, 19.00, 20.05, 21.50, 23.35, 0.35, 1.10, 3.40, 5.45** Музычная настальгія.
**6.40** М/ф «З жыцця птушак».
**7.10** Маст. фільм «Асабліва небяспечныя...».
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.20** М/ф «Як казакі нявест выручалі».
**12.00, 18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1961-ы. 2011 год.
**13.20** Маст. фільм «Асаблівае меркаванне».
**16.00** «Колба часу».
**17.20** «Атланты трымаюць неба». «За лініяй рампы».
**20.00** М/с «Болек і Лёлек».
**21.00** «Быў час». 2009 год.
**22.10** Маст. фільм «Размах крылаў».
**0.00** «Эліта Краіны Саветаў». Праўдаруб Аляксандр Якаўлеў. 2008 год.
**1.00** М/ф «Справа даручаецца дэтэктыву Тэдзі».
**1.30** Маст. фільм «Дзе ты, Багіра?».
**5.00** «Я сама». Тэма: «Я аддала дзяцей мужу». 1995 год.

### EUROSPORT

**9.00, 12.00** Чэмпіянат свету ў класе Турынг.
**9.45, 18.45** Футбол. Чэмпіянат Еўропы для гульцоў (U-17).
**10.30, 14.30, 18.30, 22.15, 0.00, 2.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Італіі.
**20.45, 22.10** Конны спорт.
**22.00** Конны спорт. Скачкі.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 17.35, 22.00, 3.10** Серыял «Былыя».
**6.45** Дэтэктыў «Высокі бландзін у чорным чаравіку».
**8.10, 12.15, 14.00, 22.50, 2.50, 5.30** Скетчком «Паміж намі».
**8.25** Камедыя «Каханне і іншыя катастрофы».
**10.45** Камедыя «Вялікае вяселле».
**12.30** Камедыя «Як ажаніцца і застацца халастым».
**14.25** Камедыя «Осцін Паўэрс: чалавек-загадка міжнароднага маштабу».
**16.00** Камедыя «План Б».
**18.20** Камедыя «Алмазны сабака».
**20.20** Камедыя «12 Калядных жаданняў».
**23.10** Камедыя «Астэрыкс на Алімпійскіх гульнях».
**1.15** Камедыя «Маленькі свет».
**4.00** Камедыя «Не злоўлены — не злодзей».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.25, 5.15** «Нераскрытыя тайны».
**11.20** «Prокіно».
**11.30** «Хронікі маскоўскага побыту».
**12.25** «Гісторыі выратавання».
**13.00, 4.00** «Тайны нашага кіно». «Водпуск за свой кошт».
**13.30, 1.50** Маст. фільм «Водпуск за свой кошт».
**16.00** М/ф «Ранга».
**17.45, 4.30** «Без тэрміну даўнасці».
**18.40** «Зорныя таты». Дак. фільм.
**20.15** Маст. фільм «Знак лёсу».
**22.20** Маст. фільм «Кніга Ілая».
**0.20** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ТБ1000

**5.10** Драма «Знайсці Форэстэра».
**7.40, 3.40** Дэтэктыў «Начны цягнік да Лісабона».
**9.40, 16.10** Трылер «Нябачнік».
**11.40** Баявік «Гісторыя рыцара».
**14.00** Драма «Сховішча».
**18.10** Меладрама «Цяпер самы час».
**20.00** Драма «Паганіні: Скрыпач Д'ябла».
**22.05** Драма «Тэорыя змовы».
**0.00** Драма «7 дзён і начэй з Мэрылін».
**1.45** Драма «8 міля».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Драма «Балі Валтасара, або Ноч са Сталіным».
**8.10** М/ф «Тры волаты і Шамаханская царыца».
**9.50** Драма «Чыстая перамога».



**12.00** Камедыя «Дон Сезар дэ Базан».
**14.40** Драма «Географ глобус прапіў».
**16.50** Драма «Юда».
**18.50** Камедыя «Дублёр».
**20.20** Меладрама «Вы не пакінеце мяне».
**22.25** Камедыя «Вясёлая моладзь;)».
**0.10** Трагікамедыя «Аддаць канцы».
**2.00** Меладрама «Клоўны».
**4.10** Дэтэктыў «Забойства на 100 мільёнаў».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Мегазаводы.
**6.45, 9.25, 17.10** Навуковыя недарэчнасці.
**7.10** Займальная навука.
**7.55** Папулярная навука.
**8.45** Паядынак неперамож-ных.
**12.30** Больш чым фокусы.
**13.15** Космас. Прастора і час.
**14.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**15.35** Дзікая прырода Амерыкі.
**16.20** Паляванне на рачную пачвару.
**20.15** Ізумруд за 400 мільёнаў долараў.
**21.00, 0.45, 4.30** Асушыць акіян.
**22.30, 2.15** Паранармальнае.
**0.00, 3.45** Выратаваць «Тытанік».
**3.00** Неразгаданыя тайны «Лузітаніі».

### DISCOVERY

**8.00, 17.10, 5.36** З любові да машын.
**8.50, 15.30** Гаражная каманда.
**9.40, 16.20, 0.40, 6.24** Махінатары.
**10.30** Рэальныя дальнабойшчыкі.
**11.20** Залатая ліхаманка.
**13.00, 4.00** Скарбы з каморкі.
**13.50, 23.50** Паляўнічыя на рэліквіі.
**14.40** Экстрэмальныя калекцыянеры.
**18.00** Дамы на дрэвах.
**18.50** Ванная пад ключ.
**19.40** Акварыумны бізнес.
**20.30** Фабрыка ўнікальных аўто.
**23.00** Зорнае выжыванне.
**1.30** Востраў.
**2.20** Хуткія і гучныя.
**3.10** Неверагодны хмарачос.
**4.48** Як гэта ўстроена?
**5.12** Як гэта зроблена?
**7.12** Беар Грылс: кадры выратавання.

---

## Слухай сваё

# ГУРТ «АЎРА» ПРЫЗНАЎСЯ Ў ЛЮБОВІ ДА... КОЦІКАЎ

**Сямейны і творчы тандэм прадставіў у інтэрнэце кліп на беларускамоўную песню «Дуся», прысвечаную ўзаемадносінам людзей і хатніх гадаванцаў.**

Здымкі музычна-сацыяльнага відэа адбыліся менавіта ў сусветны дзень кошак, а ўдзел у міні-фільме ахвотна ўзялі вядомыя медыяперсоны — спявачкі Вікторыя Алешка і Іна Афанасьева, тэлевядучыя Марына Грыцук і Люцыя Лушчык, «Міс Супранэшнл-2012» Кацярына Бурая, а таксама 7 катоў, падапечных мінскіх валанцёраў — абаронцаў бяздомных жывёл.

— Асабліва пашанцавала з партнёрам Люцыі Лушчык, — жартуе аўтар песні, прадзюсар гурта «Аўра» Яўген Алейнік. — Кошка па мянушцы Майлі аказалася на рэдкасць артыстычнай і без лішніх слоў разумела, што ёй трэба рабіць у кадры, каб прыцягнуць да сябе ўвагу.

Кампанію іншым дзяўчатам склалі вусатыя ды хвастатыя героі — Касандра і Алёша (ГААЖ «Эгіда»), Олівер, Максімільян, Белачка і Паўлуша (ГААЖ «Кот у Акенцы»). Ім, як і многім іншым беспрытульным катам і сабакам, патрэбен новы дом, які, спадзяюцца артысты, можа знайсціся хутчэй дзякуючы ролiку. А ў эпізодах дзе-ніздзе мільгае рудая мордачка Дусі — гэта котка, якую салістка гурта «Аўра» Юлія Быкава некалі ўзяла з вуліцы. Цяпер гаспадары не ўяўляюць без яе жыцця — што добра адчуваецца і ў песні, дзе спявачка сцвярджае: маўляў, Дуся «такая мі-мі-мі» і «цягнуся з Дусі я».

— Наогул, — расказвае Юлія, — ва ўсіх дзяўчат, якія зняліся ў кліпе, ёсць свойскія жывёліны — каты і сабакі, і не ўсе пародзістыя. Менавіта таму ўдзельніцы з задавальненнем пагадзіліся здымацца: нам хацелася не проста зрабіць сацыяльны ролік пра няшчасных кінутых жывёл, а паказаць і расказаць у пазітыўным ключы, з



Юлія Быкава.

лёгкім гумарам, як яны будуць выглядаць ужо ў вас дома і дарыць вам сваю любоў і пяшчоту... У нашай сям'і ўсяго жыве 5 катоў: адзін у маёй мамы, адзін у нас, і тры — у мамы мужа. Усе яны былі падабраны на вуліцы. І я, шчыра кажучы, не бачу сэнсу выкідваць шалёныя грошы за пародзістага спешчанага ката, калі можна ўзяць бяздомнае кацяня, якое будзе любіць цябе і дзякаваць за гэта ўсё жыццё.

— Фішка кліпа ў тым, што гэта не сумны ролік з заклікам «забярыце жывёлінак, інакш іх усыпяць», а забаўнае відэа, якое ўздымае настрой і выклікае ўсмешку, знята яно на цалкам сучасную R-n-B-песню, толькі з тэкстам пра коцікаў, — дадае Яўген Алейнік. — Мы ўжо заключылі дагаворы з тэлеканаламі аб ратацыі «Дусі» як звычайнага музычнага кліпа. Калі ж з яго дапамогай атрымаецца дапамагчы беспрытульным жывёлам знайсці новых гаспадароў — будзем шчаслівыя.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**



Марына Грыцук.

Гісторыя газеты — гісторыя краіны

# «ВОРАГ РАЗБІТ! ПЕРАМОГА ЗА НАМІ!»


ВОРАГ РАЗБІТ! ПЕРАМОГА ЗА НАМІ!
Звязда
ПАДПІСАННЕ АКТА АБ БЕЗАГАВОРАЧНАЙ КАПІТУЛЯЦЫІ ГЕРМАНСКІХ УЗБРОЕНЫХ СІЛ
Акт аб ваеннай капітуляцыі
З перамогай, тавары

**У год Перамогі Беларусь была ўжо вольнай ад фашысцкіх захопнікаў. Таму матэрыялы пра поспехі Чырвонай Арміі стаялі на старонках «Звязды» ля рэпартажаў пра работу ў аднаўленых калгасах і справаздач аб стане народнай гаспадаркі. Прагартаўшы падшыўку за 1945 год, можна прасачыць, як паступова мір адваёўвае свае пазіцыі. Праца на заводах і фермах, аб'явы пра прыём абітурыентаў у сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны, паведамленні пра сітуацыю ў розных рэгіёнах БССР, Савецкага Саюза і за мяжой і нават інфармацыя пра сеансы ў кінатэатрах — матэрыялы на гэтыя тэмы прысутнічалі амаль у кожным нумары газеты. Граматыка і стылістыка таго часу захавана.**

### «Неабходна забяспечыць хуткі ўздым сельскай гаспадаркі»

У першы дзень 1945 года «Звязда пісала»:

«1945 год савецкі народ сустракае напружанай, самааданай працай, накіраванай на тое, каб дапамагчы нашай Чырвонай Арміі ў выкананні яе апошняй заключнай місіі: «...давяршыць разам з арміямі нашых саюзнікаў справу разгрому нямецка-фашысцкіх армій, дабіць фашысцкага звера ў яго ўласным логаве і ўзняць над Берлінам сцяг перамогі». (Сталін) <...>

Разам з народамі ўсяго Саюза працоўныя нашай рэспублікі куюць перамогу над ворагам. Аднаўленыя фабрыкі і заводы ўжо даюць прадукцыю краіне і фронту. Але ўпераддзе яшчэ многа работы, велізарныя задачы. Дапамагаць фронту, арміі ў выкананні заключнай місіі — гэта значыць працаваць яшчэ больш, яшчэ лепш... Неабходна забяспечыць хуткі ўздым сельскай гаспадаркі, умацаваць у арганізацыйна-гаспадарчых адносінах усе калгасы, аднавіць у бліжэйшы час усе жывёлагадоўчыя фермы, расшырыць пасеўныя плошчы, узнімаць ураджайнасць палёў».

### «Дастаўлена каля 100 тысяч тамоў кніг...»

Надавала ўвагу газета і тэме вяртання ў краіну не культурных і матэрыяльных каштоўнасцей. У нумары за 7 лютага выйшла заметка пад назвай «У Беларусь прыбывае маёмасць, вывезеная нямецкімі акупантамі».

«У рэспубліку пачала паступаць маёмасць, у свой час вывезеная гітлераўскімі бандытамі з прамысловых прадпрыемстваў і культурных устаноў Беларусі, — піша «Звязда». — З Рыгі дастаўлена каля 100 тысяч тамоў кніг, якія належаць бібліятэкам Акадэміі навук, імені Леніна і ЦК КП(б)Б. Прывезена таксама 740 экспанатаў віцебскага краяведчага музея».


ГІСТАРЫЧНАЯ ПЕРАМОГА НАД ВОРАГАМ
СЛОВА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ
ЛІКАВАННЕ НАРОДА
НОЧ У БЕРЛІНЕ
КАНЕЦ ФАШЫСЦКАЙ ГЕРМАНІІ

### Пра «дзейнасць Праваслаўнай царквы» ў дні вайны

Матэрыялы на тэму рэлігіі, прычым, не ў кантэксце барацьбы з ёй, таксама з'яўляліся ў «Звяздзе» 1945 года. Газета за 9 лютага змясціла на сваіх старонках справаздачу ТАСС «Аб Памесным Саборы Рускай праваслаўнай Царквы»:

«Памесны Сабор адкрыўся 31 студзеня г.г. у Васкрэсенскім храме ў Сакольніках малебствам і ўступнай прамовай старшыні Сабора Патрыяршага Месцаблюсціцеля Мітрапаліта Ленінградскага і Ноўгадарскага Алексія. Пасля ўступнай прамовы Старшыні Сабора ад імені Урада Саюза ССР Памесны Сабор вітаў старшыня Савета па справах Рускай праваслаўнай царквы пры Соўнаркоме Саюза ССР Г.Г.Карпаў. <...>

Сабор заслухаў даклад Патрыяршага Месцаблюсціцеля Мітрапаліта Алексія аб дзейнасці Праваслаўнай Рускай Царквы ў дні Вялікай Айчыннай вайны і прыняў адпаведнае рашэнне».

А 10 красавіка «Звязда» надрукавала невялікую інфармацыю пад загалоўкам «Гутарка тав. І.В. Сталіна з Патрыярхам Маскоўскім і ўсея Русі Алексіем». «10 красавіка ў Старшыні Савета Народных Камісараў СССР тав. І.В.Сталіна адбылася гутарка па справах Праваслаўнай царквы з Патрыярхам Маскоўскім і ўсея Русі Алексіем... У гутарцы прыняў удзел Намеснік Старшыні Соўнаркома СССР тав. В.М.Молатаў».

### «Воінская служба — ганаровы абавязак савецкіх грамадзян»

Друкавала газета і матэрыялы ідэалагічнага кірунку. У нумары за 10 красавіка выйшаў артыкул «Аб правах і абавязках савецкіх грамадзян».

«Забяспечваючы самыя дэмакратычныя ў свеце правы, савецкая дзяржава ўскладае на грамадзян і сур'ёзныя абавязкі... — пісала «Звязда». — Самае святое пачуццё чалавека, грамадзяніна — гэта любоў да Радзімы. Патрыятызм працоўнага народа, які стаў у абарону сваёй Айчыны, яе свабоды і незалежнасці, можа тварыць і творыць, як паказала цяперашняя вайна, сапраўдныя цуды. Згодна Савецкай Канстытуцыі воінскі абавязак з'яўляецца законам, воінская служба ў Чырвонай Арміі — ганаровы абавязак савецкіх грамадзян».

### «Гістарычная перамога над ворагам»

Пад такім загалоўкам выйшла падборка матэрыялаў у нумары за 28 красавіка, пасля таго, як войскі Чырвонай Арміі і саюзнікаў злучыліся ў цэнтры Германіі.

«Калі Масква пачала перадаваць загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Савецкага Саюза таварыша Сталіна аб рассячэнні фронта нямецкіх войск і злучэнні войск 1-га Украінскага фронта з войскамі нашых саюзнікаў, натоўпы рабочых завода, дзе дырэктарам тав. Вульман, сабраліся ля рэпрадуктараў. Велізарную радасць выклікала гэтая вестка сярод рабочых завода. Рабочыя абдымалі і віншавалі адзін другога з вялікай перамогай», — пісала «Звязда».

### «Вялікі дзень»

Нумар за 9 мая 1945 года адкрывала інфармацыя пра падпісанне акта аб безагаворачнай капітуляцыі германскіх узброеных сіл. Там жа змяшчаўся і тэкст гэтага дакумента:

«Мы, ніжэйпадпісаўшыяся, дзейнічаючы ад імені Германскага Вярхоўнага Камандавання, згаджаемся на безагаворачную капітуляцыю ўсіх нашых узброеных сіл на сушы, на моры і ў паветры, а таксама ўсіх сіл, якія знаходзяцца ў сучасны момант пад нямецкім камандаваннем, — Вярхоўнаму Галоўнакамандаванню Чырвонай Арміі і адначасова Вярхоўнаму Камандаванню Саюзных экспедыцыйных сіл...»

У гэтым жа нумары быў надрукаваны артыкул пад назвай «Вялікі дзень» Кандрата Крапівы.

«Фашызм разгромлен, але, як напамінак аб ім, асталіся шматлікія сляды яго крывавых злачынстваў і варварскіх разбурэнняў, — піша класік беларускай літаратуры. — Гледзячы на іх, народы свету павінны падумаць аб сваім далейшым лёсе, аб лёсе наступных пакаленняў. Яны павінны паклапаціцца аб тым, каб не даць магчымасці сілам зла і разбурэння аправіцца ад разгрому і падняцца зноў».

**Падшыўку гартала Надзея ЮШКЕВІЧ**

# «ІШОЎ МІЛЫ НА ВАЙНУ, ПАКІДАЎ МЯНЕ АДНУ...»

**Сталыя чытачы «Звязды» памятаюць конкурс прыпевак, які наша газета праводзіла ў аддаленым ужо на два дзесяцігоддзі 1994-м. Сярод тэм, што былі зададзены для агучвання ў песенных чатырохрадкоўях, Дзень Перамогі значыўся асобна. Бо чытачы дасылалі на гэту тэму не толькі ўласныя прыпеўкі, але і прынесеныя народнай памяццю з часоў вайны, пачутыя ад матуль і бабуль. Думаем, варта ўспомніць сёння менавіта гэтыя, гістарычныя, якія сведчаць пра тое, што нават у страшнае ліхалецце нашы людзі знаходзілі ў сабе сілы спяваць і жартаваць.**

Ішоў мілы на вайну,
Пакідаў мяне адну.
Як з ім я расставалася,
Слязамі абрывалася.
*
Я салдаціка любіла,
Пілотачку мерала.
На вайну яго пусціла —
Ў Перамогу верыла.
*
Не спявай мне, шэра птушка,
Жалю мне не паддавай.
Ты не плач, мая дачушка,
Адваюем родны край.
*
Не скрыпіце вы, калёсы,
Бо нядаўна змазаны.
Вы не ліце, бабы, слёзы,
Фрыцы ўсе павязаны.
*
Белую хусціначчку
Не буду завязваць,
Пашлю міламу ў лясок
Раны перавязваць.
*
Партызан як прыйдзе ў хату,
Стаўлю я на стол харчы.
Бо гатова, нібы брату,
Партызану памагчы.
*
Ўсе наперад, партызаны!
Засталося нам адно:
Разбіць фрыцаў пад Гарыўцам,
А таксама пад Сянно.
Віцебск возьмем мы з бамбёжкай,
Бешанковічы — з гармошкай.
*
Вельмі туга немцам стала,
Проста хоць крычы капут.
Толькі ноч на землю пала —
Партызаны тут як тут.
*
Цяжка Гітлеру дыхнуць —
Дыхавіцу спёрла:
Хоча шар зямны глынуць,
Ды не лезе ў горла.
*
На бярозе дзве зязюлі,
На вішаньцы салавей.
Як убачу партызана,
На душы мне весялей.
*
А мой мілы партызан,
А я партызаначка.
Пайшоў мілы на Берлін,
Я ж качала лялечку.
*
Хоць і цяжкая вайна,
А мне адгукнулася:
Ваяваць пайшла адна,
Удваіх вярнулася.
*
Раней муж быў брыгадзір,
Ну а я — даярка.
Цяпер муж мой камандзір,
А я — санітарка.
*
Ах, вайна, вайна, вайна,
Што ж ты нарабіла:
Я карова, я і бык,
Я і баба, і мужык.
*
Дзеванькі, вайна, вайна,
Дзеванькі, Пабеда!
Дзеванькі, хлапцоў няма —
Хапайцеся за дзеда.

***Дасылалі нашы чытачы і сучасныя прыпеўкі, якія склалі самі. Мінула дваццаць гадоў, але словы аб міры ў нас будуць актуальнымі заўсёды.***

Ты ляці, мой галубочак,
Цераз мора-акіян,
Занясі мой галасочак
Супраць войнаў у ААН.
*
Калі Божа дапаможа,
Вера спраўдзіцца адна:
Усё зможам-пераможам,
Абы толькі не вайна!

УНП 101015738
**РУП «Белпочта»**
**ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРЕГОВОРОВ**
**по выбору специализированной подрядной организации для выполнения работ по разработке предпроектной (прединвестиционной) документации по объекту «Установка системы автоматического регулирования отопления в ИТП отделения почтовой связи № 99 по ул. Брестской, 56, к. 1».**
**Процедура переговоров состоится «14» мая 2015 года в 11.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 10.**
Контакты для получения дополнительной информации: отдел капитального строительства РУП «Белпочта» – тел. 293-55-29, 293-55-28.

УНП 101015738
**РУП «Белпочта»**
**ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРЕГОВОРОВ**
**по выбору специализированной подрядной организации для выполнения изыскательских работ на объекте «Детальное обследование технического состояния строительных конструкций административного здания автотранспортного производства РУП «Белпочта» по ул. Лукьяновича, 6/1 в г. Минске».**
**Процедура переговоров состоится «14» мая 2015 года в 10.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 10.**
Контакты для получения дополнительной информации: отдел капитального строительства РУП «Белпочта» – тел.: 293-55-29, 293-55-28.

ИЗВЕЩЕНИЕ
УНП 100071325
**Государственное производственное объединение «Минскстрой»**
**ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ ОБЪЕКТА «Многоквартирные жилые дома №№ 11, 12 по генплану в квартале жилой застройки пр. Дзержинского – ул. Алибегова – пр. Газеты «Правда». *Жилой дом № 12* (по генплану) со встроенными помещениями и подземным гаражом-стоянкой. в г. Минске, опубликованную в газете «Звязда» 23 мая 2014 года:**

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 2-комнатных квартир №№ 184, 185, 188, 189, 192, 193, 197, 200, 204, 205, 208, 212, 213, 216, 217, 276, 280, 284, 288, 292, 296, 300, 308 без учета выполнения внутренних отделочных работ для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий – 1300 долларов США.

Стоимость 1 кв. метра общей площади фиксируется в долларах США и остается неизменной в долларах США до окончания действия договора создания объекта долевого строительства. Оплата производится в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату оплаты денежных средств на специальный и расчетный счет застройщика.

При 100% оплате всей суммы по договору создания объекта долевого строительства в течение 15 (пятнадцати) банковских дней со дня регистрации договора в Мингорисполкоме стоимость 1 кв.м. общей площади уменьшается на сумму, эквивалентную 100 долларам США и составит 1200 долларов США.

Заявления о долевом строительстве квартир будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящих изменений в проектную декларацию в кабинете 105, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ГПО «Минскстрой» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим претендентом.

*Генеральный директор* *Н.В.Милошевский*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Аукцион состоится 09.06.2015 г. в 15.00**
**по адресу: 220030, г. Минск, ул. Кирова, 18, 3-й этаж, пом. 98 (конференц-зал «Дукат»).**
**Организатором аукциона является**

## республиканское унитарное предприятие «Президент-Отель»,

**находящееся по адресу: г. Минск, ул. Кирова, 18.**

На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества:

**ЛОТ № 1.** Помещения №№ 157, 158, 159 арендуемой площадью 63,2 кв.м на втором подвальном этаже в здании по ул. Кирова, 18 (литер А 12/бл) в г. Минске; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 1 896 000 рублей; размер задатка – 189 600 рублей; целевое использование – размещение автомойки; ставка арендной платы за 1 кв.м составляет 3 базовые арендные величины.

**ЛОТ № 2.** Помещение № 48 площадью 31,6 кв.м на пятом этаже в здании по ул. Кирова, 18 (литер А 12/бл) в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, водоснабжением, канализацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 948 000 рублей; размер задатка – 94 800 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м составляет 3 базовые арендные величины.

**Документы на участие в аукционе принимаются с 07.05.2015 по 08.06.2015 с 8.30 до 12.00, с 13.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Кирова 18, к. 602. Документы, поданные после 16.00 08.06.2015 года, не рассматриваются.**

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 «О мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 07 мая 2009 № 238».

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие аукционе:

*- перечисляет задаток на р/с № 3012000011054 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП 192287408, ОКПО 381798305000, государственное предприятие «Президент-Отель»;*

*- подает заявление на участие в аукционе;*

*- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;*

*- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.*

Помимо указанных документов:

***- физическое лицо** предъявляет документ, удостоверяющий личность;*

***- индивидуальный предприниматель** – копию свидетельства о государственной регистрации;*

***- юридическое лицо** (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, в заявлении сообщает о нахождении на территории Республики Беларусь представительства с указанием даты выдачи Министерством иностранных дел Республики Беларусь разрешения на открытие представительства, номера и срока действия разрешения.*

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

**Порядок оформления участия в аукционе:** лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

*При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.*

**Порядок определения победителя аукциона:**

- торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

- аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и(или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством, составляет 10 000 000 рублей.

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участником документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Телефоны для справок: (8-017) 229-70-39, (8-029) 117-56-22.**

---

**Отдел принудительного исполнения Первомайского района г. Витебска**

## РЕАЛИЗУЕТ ПУТЕМ ПРОВЕДЕНИЯ ТОРГОВ ИМУЩЕСТВО,

**принадлежащее Грузневич Ирине Алексеевне, а именно:**

**Лот № 1**. «ПЦ 119370», 1990 г.в. – стоимостью 35 100 000 рублей;
**Лот № 2.** «МАЗ 93802», 1992 г.в. – стоимостью 26 310 000 рублей
**Лот № 3.** «KOEGEL SN24», 1993 г.в. – стоимостью 41 736 000 рублей;
**Лот № 4.** «BLUMHARDT», 1995 г.в. – стоимостью 44 880 000 рублей.

**Данное имущество находится по адресу: г. Витебск, ул. П.Бровки, 4.**

**Торги по продаже данного имущества назначены на 26 мая 2015 года в 10 часов утра, по адресу: ул. Горбачевского, 26, каб. № 8.**

Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:

1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.

2. *Внести залог в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Первомайского района г. Витебска: р/с 3642903000315, УНН 300002505 в ф-л №200 Витебское областное управление ОАО «Беларусбанк» г. Витебск,* **не позднее 25.05.2015 года.**

Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота.

В соответствии с п. 3 ч. 17 Инструкции по исполнительному производству, утвержденной Постановлением Министерства юстиции Республики Беларусь от 20.12.2004 года №40 «Об утверждении Инструкции по исполнительному производству» возмещение затрат на организацию и проведение торгов, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для их проведения, осуществляется покупателем имущества.

Интересующую информацию можно получить в отделе принудительного исполнения Первомайского района г. Витебска каб. № 8 либо по тел. 8 (0212) 60-01-38, 8 (0212) 60-01-39, 8 (0212) 28-76-46, 8 (0212) 37-46-38.

---

**Отдел принудительного исполнения Первомайского района г. Витебска**

## РЕАЛИЗУЕТ ПУТЕМ ПРОВЕДЕНИЯ ТОРГОВ ИМУЩЕСТВО,

**принадлежащее ЧТПУП «Торговый дом К-ПРО», а именно:**

**Лот № 1**. «Мерседес Бенц С180», 2011г.в. – стоимостью 384.417.464 рубля.

**Данное имущество находится на стоянке ВОУП «Автосервиса и торговли» по адресу: г. Витебск, ул. Терешковой, 9.**

**Торги по продаже данного имущества назначены на 29 мая 2015 года в 10 часов утра, по адресу: ул. Горбачевского, 26, каб. № 8.**

Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:

1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.

2. *Внести залог в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Первомайского района г. Витебска: р/с 3642903000315, УНН 300002505 в ф-л №200 Витебское областное управление ОАО «Беларусбанк» г. Витебск,* **не позднее 28.05.2015 года.**

Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота.

В соответствии с п. 3 ч. 17 Инструкции по исполнительному производству, утвержденной Постановлением Министерства юстиции Республики Беларусь от 20.12.2004 года №40 «Об утверждении Инструкции по исполнительному производству» возмещение затрат на организацию и проведение торгов, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для их проведения, осуществляется покупателем имущества.

Интересующую информацию можно получить в отделе принудительного исполнения Первомайского района г. Витебска каб. № 8 либо по тел. 8 (0212) 60-01-38, 8 (0212) 60-01-39, 8 (0212) 28-76-46, 8 (0212) 37-46-38.

---

## ЛОГОЙСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

### сообщает о проведении 10 июня 2015 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Инженерная инфраструктура | Начальная цена, руб. | Расходы по подготовке землеустроительной документации, руб. | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Пархово, У-5, 623284604501000064 | 0,1504 | электричество | 20 803 350 | 6 256 900 | 2 080 350 |
| 2 | д. Пархово, У-6, 623284604501000065 | 0,2014 | электричество | 27 857 650 | 6 256 900 | 2 785 800 |

Земельные участки ограничений в использовании не имеют.

*Задаток в размере 10% от начальной цены земельного участка перечисляется на р/с 3600619101109 в ЦБУ № 611 филиала № 500 Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Логойск, ул. Пролетарская, 1, УНН 600181577, код 04901.*

Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой землеустроительной документации. Все участники могут ознакомиться с земельными участками и документацией на них. Иные обязанности победителя торгов и порядок проведения аукциона оговорены в условиях его проведения.

**Аукцион состоится 10 июня 2015 года в 10.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, 6. Последний день приема заявлений **4 июня 2015 года до 17.00.**

**Контактные телефоны: (801774) 55056, 55473.**

---

**ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ**

## ОАО «Лукомльэнергомонтаж»

***211162, Витебская область, г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8, УНП 300007839***

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 1 ЯНВАРЯ 2015 года

(млн руб.)

| Наименование показателя | Код строки | На начало года | На конец года |
|---|---|---|---|
| **АКТИВ** | | | |
| Долгосрочные активы | 190 | 4254 | 4929 |
| Краткосрочные активы | 290 | 17442 | 14229 |
| БАЛАНС | 300 | 21696 | 19158 |
| **ПАССИВ** | | | |
| Собственный капитал | 490 | 6057 | 10779 |
| Долгосрочные обязательства | 590 | - | - |
| Краткосрочные обязательства | 690 | 15639 | 8379 |
| БАЛАНС | 700 | 21696 | 19158 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ЗА ЯНВАРЬ – ДЕКАБРЬ 2014 г.

| Наименование показателя | Код строки | за январь-декабрь 2014 г. млн руб. | за январь-декабрь 2013 г. млн руб. |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, работ, услуг | 010 | 38204 | 17872 |
| Себестоимость реализованной продукции, работ, услуг | 020 | 28733 | 12882 |
| Валовая прибыль | 030 | 9471 | 4990 |
| Управленческие расходы | 040 | 4054 | 3020 |
| Прибыль от реализации продукции, работ, услуг | 060 | 5417 | 1970 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 2274 | 381 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | 2669 | 555 |
| Прибыль от текущей деятельности | 090 | 5022 | 1796 |
| Прибыль от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | 150 | 832 | 246 |
| Прибыль до налогообложения | 160 | 5854 | 2042 |
| Налог на прибыль | 170 | 1135 | 391 |
| Чистая прибыль | 210 | 4719 | 1651 |
| **4**. Доля государства в уставном фонде эмитента (всего в %) | | 0 | |

**5-6.** Информация о дивидендах и акциях

| Показатель | Единица измерения | С начала года | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 88 | 98 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | - | 1 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | | |
| в том числе: физических лиц | лиц | 88 | 97 |
| из них нерезидентов Республики | лиц | | |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | миллионов рублей | - | 1,5 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | миллионов рублей | - | - |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | - | 112,64 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну акцию (включая налоги) | рублей | - | 0,00 |
| Обеспеченность акции имуществом Общества | тысяч рублей | 971,4 | 470,44 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе Общества | штук | - | 1557 |

**7, 8.** Отдельные финансовые результаты

| Показатель | Единица измерения | С начала года | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | миллионов рублей | 38204 | 17872 |
| Себестоимость реал. продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию | миллионов рублей | 32787 | 15902 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения, всего | миллионов рублей | 5854 | 2042 |
| в том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | миллионов рублей | 5417 | 1970 |
| в том числе: прочие доходы и расходы по текущей деятельности | миллионов рублей | -395 | -174 |
| в том числе: прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | миллионов рублей | 832 | 246 |
| Налог на прибыль: изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | миллионов рублей | 1135 | 391 |
| Чистая прибыль (убыток) | миллионов рублей | 4719 | 1651 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | миллионов рублей | 4719 | 1651 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | миллионов рублей | 0,00 | - |
| Долгосрочные обязательства | миллионов рублей | | |
| Среднесписочная численность работающих | человек | 97 | 90 |

**9.** Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг: строительно-монтажные работы – 99,9.

**12.** Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой баланс за отчетный год: 24 апреля 2015 года

**15.** О применении эмитентом свода правил корпоративного поведения: частично применяются в процессе деятельности органом управления Обществом.

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ НА ПРАВО ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ.

## ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА – ВОЛЧИНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

| № лота | Местоположение земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Целевое назначение земельного участка | Назначение земельных участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества | Характеристика расположенных на участке строений, инженерных коммуникаций | Начальная цена объекта, руб. | Сумма задатка, руб. | Сумма подлежащих возмещению затрат на оформление и регистрацию участка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Брестская обл., Каменецкий район, д. Мельники, 2Б | 124081705601000008 | 0,2498 | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома), (код 10902) | Земельный участок с наличием инженерной и транспортной инфраструктуры. Ограничение в использовании на площади 0,2498 га в водоохранной зоне р. Пульва | 2975867 | 595200 | 7228074 Кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ |
| 2 | Брестская обл., Каменецкий район, д. Мельники, 2В | 124081705601000009 | 0,2499 | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома), (код 10902) | Земельный участок с наличием инженерной и транспортной инфраструктуры. Ограничение в использовании на площади 0,2490 га в водоохранной зоне р. Пульва | 2977059 | 595400 | 7159884 Кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ |

1. Аукцион состоится **12.06.2015 г. в 11.00** в здании Волчинского сельского исполнительного комитета (зал заседаний) по адресу: Брестская обл., Каменецкий район, д. Волчин, ул. Ленина, д. 34.

2. Для участия в аукционе гражданин, юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые они желают приобрести в частную собственность, а также документ, подтверждающий внесение суммы задатка. Сумма задатка для участия в аукционе перечисляется в срок **до 11.06.2015 г.** на расчетный счет Волчинского сельского исполнительного комитета 3604219050016, филиал ОАО «Белагропромбанк» — Брестского областного управления, МФО 150501401, УНП 200057022, ОКПО 04420288.

Для участия в аукционе представляются:

гражданином — копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина — нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица — доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц — документ, удостоверяющий личность.

3. Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельных участков для проведения аукциона:

3.1 по продаже земельных участков в частную собственность:

- внесение победителем аукциона платы за земельный участок;

- возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе государственной регистрации в отношении создания земельного участка;

- осуществление победителем аукциона в двухмесячный срок после принятия решения исполнительного комитета о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок;

- получение победителем аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительства жилого дома;

- занятие (освоение) земельного участка не позднее 1 (одного) года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации права на него.

4. Заявление на участие в аукционе принимаются с момента размещения извещения о проведении аукциона в СМИ в рабочие дни с 8.00 до 17.00 по адресу: Брестская обл., Каменецкий район, д. Волчин, ул. Ленина, д. 34. Прием заявлений заканчивается **11.06.2015 г. в 17.00.** Контактный телефон: (801631) 43123, тел./ факс: (801631) 43135.

5. В течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона победитель аукциона обязан оплатить стоимость объекта продажи, возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в том числе затраты, связанные с изготовлением и предоставлением участникам необходимой документации.

6. Аукцион проводится при наличии не менее двух участников.

7. Всем желающим предоставляется возможность предварительного осмотра земельных участков.

Контактные телефоны: **(801631) 43135, 43123.**

70 1945 2015 гадоў Вялікай Перамогі

# ПРА ВАЙНУ І МІР АД ДОЎГАЖЫХАРОЎ

**102 гадовы ветэран вайны і 100 гадовая ветэранка працы «прыадкрылі таямніцу» таго, як пражыць больш за стагоддзе і не быць абузай для блізкіх. Нашы героі — жыхары Полацкага раёна. Усяго тут сем чалавек, якім ужо за 100 гадоў.**

## «ЛАВІЎ» САМАЛЁТЫ ПРАЖЭКТАРАМІ

Яфім Якаўлевіч Рыжычэнка жыве разам з дачкой, унукам і жонкай унука ў вёсцы Захарнічы. Адукацыя ў сувязмоўцы — тры класы. А галоўнай «школай» стала само жыццё.

— Нарадзіўся 22 сакавіка 1913 года. Тутэйшы я. Бацька і маці, дзед і прадзеды працавалі на чыгунцы. Разам са мной у бацькоў было дзевяць дзяцей, — дакладна адказвае на пытанні ветэран. — Да 1933 года жылі сваёй гаспадаркай, потым у калгас уступілі. А ў 1935 годзе забралі мяне ў салдаты. Служыў у Гомелі. Вучылі пражэктарамі свяціць у неба, каб самалёты «лавіць» (у кіно паказваюць, як на нямецкія самалёты нашы наводзяць прамяні. — **Аўт.**). У 1937 годзе дэмабілізаваўся. А праз год зноў забралі, і служыў я да 1940 года ў Полацку, — працягвае Яфім Рыжычэнка.

Прыкладна за 1,5 месяца да пачатку Вялікай Айчыннай яго зноў прызвалі ў армію, каб адправіць у Манголію.

— А вайна ж пачалася. Я тады ў Віцебску служыў. Так атрымалася, што ў хуткім часе ўзялі мяне ў палон, але ўдалося збегчы. Праз балоты ўцёк, а са мной яшчэ 12 чалавек... Казалі, што з сабакамі немцы кінуцца за намі. Ды ніхто так і не гнаўся, бо мітусня вялікая была. Ворагі былі на шашы, якая вяла на Смаленск. Яны збіраліся туды наступаць. Прыйшоў да нашых, а ротны пытае, ці падрыхтавалі пражэктар для перавозкі. Не паспелі. Расказаў яму пра тое, што ў палон трапіў. Ён мне: нічога нікому не кажы. Так і зрабіў, — здзіўляе падрабязнасцямі ветэран. Ён памятае імёны і прозвішчы, воінскія званні, назвы вёсак, даты...

Яфім Якаўлевіч ваяваў у Бранску, браў Арол, Прыбалтыку вызваляў. Перад Перамогай у адпачынак адпусцілі. Пабыў дома 15 дзён. Пасля капітуляцыі фашыстаў служыў да кастрычніка 1945 года. Узнагароджаны медалямі: «За баявыя заслугі», «За Перамогу» і іншымі.

## І ПЕРШЫМ У ВЁСЦЫ КУПІЎ ТЭЛЕВІЗАР

— Тата шмат чаго можа расказаць пра вайну. І мне вельмі падабаецца яго слухаць. Цікава распавядае і пра пасляваенныя гады. Асабліва пра тое, як з мамай маёй ажаніўся. Настасся Захараўна памерла 1,5 года таму. Пражыла 94, — распавядае Раіса Яфімаўна, дачка ветэрана. Яна нарадзілася ў 1947 годзе.

Як пазнаёміўся з будучай жонкай?

У адной вёсцы жылі, з яе братамі сябраваў. Я са сваімі бацькамі параіўся — яны не былі супраць, каб ажаніўся. Сказалі, што сціплая дзяўчына... Вяселле невялікае зрабілі. І пачалі жыць, — дадае Яфім Якаўлевіч.

Наваспечаны муж, як бы цяпер сказалі, з нуля пачаў будаваць сямейнае гняздо. У небагаты пасляваенны час гэта было складана. Добра, што Яфім Якаўлевіч — чалавек з «залатымі рукамі».

— У ваенным гарадку — на будоўлі, потым — у калгасе — шафёрам. І цесляром быў... Працаваў з раніцы да позняга вечара, таму і прыйшоў час, калі пачалі грошы «вадзіцца», — працягвае ён.



Яфім Якаўлевіч Рыжычэнка з унукам і дачкой.



Фота Яфіма Якаўлевіча і яго жонкі ў маладосці.

— Мяне і малодшага брата гадавалі бацькі. І мы нябедна жылі, а ўсё дзякуючы тату. Я ж яшчэ і сяброўак падкормлівала. У нас і белая мука заўсёды была, і іншае, — дзеліцца Раіса Яфімаўна.

Яна добра памятае: калі яшчэ малая была, у вялікай бацькавай хаце на святы збіраліся аднавяскоўцы. Хто капусты міску прынясе, хто — ячніо... Весяліліся, песні спявалі, але ніхто не быў п'яны і не біўся.

Ветэран з гонарам расказваў пра тое, што першы ў вёсцы купіў тэлевізар, газавую плітку ўсталяваў у хаце. А ўсё таму, што зарабляў, грошы на спіртное не траціў. Ды і гаспадарка свая была моцная.

## ПРОСІЦЬ, КАБ ПРЫ ІМ САЛА ПАСМАЖЫЛІ

Я ўсё цікавіўся, як адчувае сябе чалавек у такім узросце, як харчаваўся, пра дрэнныя звычкі. Спрабаваў даведацца сакрэт доўгажыхарства.

Яфім Якаўлевіч дрэнна бачыць, і тое толькі адным вокам. Але з задавальненнем слухае тэлевізар.

У маладосці не злоўжываў алкаголем. Калі бачыў аднавяскоўца нападпітку, перажываў. І не столькі за тое, што той грошы прапіў, а хваляваўся: як заўтра ўстане? Курыць пачаў у арміі, але кінуў, калі цыгарэты падаражэлі, — расказвае унук ветэрана Алег Іванавіч.

І цяпер Яфім Якаўлевіч часта просіць скварку. Ды зубы не дазваляюць шмат яе з'есці. Але ж просіць, каб пры ім сала пасмажылі. Сядуць за стол, а ён і паспявае: «Враги сожгли родную хату», «Катюшу» і іншыя песні пра вайну...

На развітанне дамовіліся, што ў наступным годзе зноў прыеду ў госці. Каб павіншаваць ветэрана з чарговым днём нараджэння, запісаць больш яго ўспамінаў.

## НЕ ЛЕНАВАЦЦА І ШМАТ ПРАЦАВАЦЬ

Разам са старшынёй Гаранскага сельвыканкама Мікалаем Васільевічам Карасёвым у Новых Гаранах наведалі доўгажыхарку Настассю Аляксандраўну Маўчанаву. Яна нарадзілася 1 сакавіка 1915 года.



Настасся Аляксандраўна і старшыня Гаранскага сельвыканкама Мікалай Карасёў.

— Я расла ў шматдзетнай сям'і, была старэйшым дзіцем. У жывых засталася сястра родная. Яна жыве ў Мінску, ёй 90 гадоў. Усё жыццё я пражыла ў вёсцы Гаравыя, 55 гадоў працавала ў калгасе, — распавяла бабуля.

— Летам яна адна жыве ў сваім доме. Сама па ваду ходзіць, кухарыць. Колькі яе не пераконвалі, што з намі было б лепш, кажа, што сама справіцца, — дадае яе ўнучка Ірына Віктараўна. Падчас размовы яна трымала на руках дзіця — праўнука бабулі, 11-месячнага Захара (усяго ў доўгажыхаркі два сыны, 11 унукаў, 14 праўнукаў.)

У сельвыканкаме расказалі, што Настасся Аляксандраўна — добры прыклад для пераймання. Узорная вясковая жанчына і на працы была ў передавіках, і суседзям на гаспадарцы дапамагала. Каму — бульбу садзіць, каму — капаць і г.д. Нават калі яе не прасілі, сама прыходзіла на дапамогу.

Сакрэт доўгага жыцця пенсіянерка тлумачыць проста: трэба не ленавацца і шмат працаваць. Наконт ежы: што ўсе елі, тое і яна. Цяпер у асноўным малочныя прадукты, а раней і сала, і ўсё астатняе. Вось і вер пасля гэтага медыкам наконт шкоднасці сала з-за халестэрыну...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.**

*Полацкі раён — Віцебск.*

Аукцион состоится **25.05.2015 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.05.2015 до 16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.**

И З В Е Щ Е Н И Е

**Государственное производственное объединение**

## «Минскстрой»

**ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ ОБЪЕКТА «Многоквартирные жилые дома №№ 11, 12 по генплану в квартале жилой застройки пр. Дзержинского – ул. Алибегова – пр. Газеты «Правда». Жилой дом № 12 (по генплану) со встроенными помещениями и подземным гаражом-стоянкой в г. Минске, опубликованную в газете «Звязда» 23 мая 2014 года:**

УНП 100071325

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 2-комнатных квартир №№ 220, 221, 222, 223, 225, 226, 227, 228, 230, 231, 232, 233, 235, 238, 240, 241, 242, 243, 245, 246, 248, 250, 251, 253, 255, 256, 257, 258, 260, 261, 262, 263, 265, 266, 267, 270, 271, 272, 273, 274, 278, 282, 290, 294, 298, 302, 306 без учета выполнения внутренних отделочных работ для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий – 1200 долларов США с рассрочкой платежей до 1 ноября 2015 года.

Стоимость 1 кв. метра общей площади фиксируется в долларах США и остается неизменной в долларах США до окончания действия договора создания объекта долевого строительства. Оплата производится в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату оплаты денежных средств на специальный и расчетный счет застройщика.

При 100% оплате всей суммы по договору создания объекта долевого строительства в течение 15 (пятнадцати) банковских дней со дня регистрации договора в Мингорисполкоме стоимость 1 кв.м. общей площади уменьшается на сумму, эквивалентную 100 долларам США и составит 1100 долларов США.

Заявления о долевом строительстве квартир будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящих изменений в проектную декларацию в кабинете 105, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ГПО «Минскстрой» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим претендентом.

*Генеральный директор Н.В.Милошевский*

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОНОВ НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

**Организатор аукционов: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, тел. (0212) 42-61-62.**

| **Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, срок аренды.** |
|---|
| Лот №1. Право заключения договора аренды сроком на 5 лет земельного участка с кадастровым №240100000003008225, площадью 0,0037 га, расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, по улице 39-й Армии, у дома №20 для установки торгового павильона (1 16 03 размещение объектов розничной торговли). Ограничения: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения. **Начальная цена** права заключения договора аренды: 3 627 580 бел. руб. **Размер задатка:** 362 000 бел. руб. |
| Дата, время и место проведения аукциона: **09.06.2015 в 16.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатка и приема документов: с 08.05.2015 с 8.30 по 08.06.2015 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в рабочие дни с 8.30 до 17.30. в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3642302000280 в ф-ле № 200 Витебское обл.управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300200386, получатель платежа: Витебский горисполком. **Условия аукциона:** заключить с Витебским горисполкомом договор аренды зем.участка; в течение 2 месяцев со дня подписания договора аренды зем. участка, но не позднее 3 месяцев со дня принятия решения о предоставлении зем. участка в аренду обратиться за гос. регистрацией этого зем. участка, прав, ограничений (обременений) прав на него в РУП «Витебское агентство по гос. регистрации и зем. кадастру»; получить разрешение на проведение проектно-изыскательных работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 3 месяца. |

| **Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, срок аренды.** |
|---|
| Лот №1. Право заключения договора аренды сроком на 15 лет земельного участка с кадастровым №224455300001001862, площадью 0,0349 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Сенненский р-н, г.п. Богушевск, ул. Ленина, 13 под установку торгового павильона (1 16 03 размещение объектов розничной торговли). Ограничений в использовании нет. **Начальная цена** права заключения договора аренды: 8 872 120 бел. руб. **Размер задатка:** 887 000 бел. руб. |
| Дата, время и место проведения аукциона: **10.06.2015 в 14.00** по адресу: Витебская обл., Сенненский р-н, г. Сенно, ул. К. Маркса, 2 в Сенненском райисполкоме. Срок внесения задатка и приема документов: с 08.05.2015 с 8.30 по 09.06.2015 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в рабочие дни с 8.30 до 17.30 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3642326000918 в ЦБУ № 218 ф-ла № 200 Витебское обл.управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300027582, код платежа 04002, получатель платежа: Сенненский райисполком. **Условия аукциона:** в течение 2 месяцев после утверждения протокола о результатах аукциона, либо после признания аукциона несостоявшимся заключить с Сенненским райисполкомом договор аренды зем. участка и обратиться за гос. регистрацией прав на него в территориальную организацию по гос. регистрации и зем. кадастру; получить АПЗ и ТУ для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение райисполкома на проведение проектно-изыскательных работ и разработку строительного проекта под установку торгового павильона в установленные сроки; приступить к занятию зем. участка (строительству объекта) в течение 6 месяцев со дня утверждения ПСД на строительство объекта. |

Аукционы проводятся в порядке, установленном Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. **Победитель аукциона (единственный участник несостоявшегося аукциона) обязан (условия аукциона):** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за право заключения договора аренды зем. участка и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием зем. участка, гос. регистрацией создания зем. участка); осуществить строительство объекта в сроки, определенные ПСД. Инженерные коммуникации и сооружения на зем. участках отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Для участия в аукционах приглашаются гражданине, индивидуальные предприниматели. юр. лица. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более граждан, индивидуальных предпринимателей, юр. лиц. Для участия в аукционе граждане, индивидуальные предприниматели, консолидированные участники и юр. лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный срок подают заявление на участие в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; представителем иностранного юр. лица – легализованные копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык, легализованные доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о фин. состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. Консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов предъявляется документ, удостоверяющий личность, уполномоченным лицом (представителем) – доверенность, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица. Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности земельного участка. **Контактные тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.**

П Р И Г Л А Ш Е Н И Е

**Волковысское ОАО «Беллакт» приглашает**

## ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ПЕРЕГОВОРАХ

**по выбору подрядчика по выполнению текущего ремонта полов по объекту: производственный корпус (ЦМЦ, пом. 27, 29, 43, 51 (холодильные камеры))», расположенного по адресу: г. Волковыск, ул. Октябрьская, 133.**

Документация для переговоров предоставляется участникам на основании письменной заявки, направленной по e-mail: juristy@bellakt.com, по факсу (+375 15 12) 75048 или по почте на адрес: 231900, Республика Беларусь, Гродненская область, г. Волковыск, ул. Октябрьская, д. 133.

Срок предоставления предложений с 08.00 8 мая 2015 г. до 12.00 15 мая 2015 г.

Контактные телефоны: (+375 15 12) 75036, 75048.

УНП 500043093

П Р И Г Л А Ш Е Н И Е

**Волковысское ОАО «Беллакт» приглашает**

## ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ПЕРЕГОВОРАХ

**по выбору подрядчика для выполнения текущего ремонта по объекту: здание столовой (музей), расположенного по адресу: г. Волковыск, ул. Октябрьская, 133.**

Документация для переговоров предоставляется участникам на основании письменной заявки, направленной по e-mail: juristy@bellakt.com, по факсу (+375 15 12) 75048 или по почте на адрес: 231900, Республика Беларусь, Гродненская область, г. Волковыск, ул. Октябрьская, д. 133.

Срок предоставления предложений с 08.00 08 мая 2015 г. до 12.00 15 мая 2015 г.

Контактные телефоны: (+375 15 12) 75036, 75048.

УНП 500043093

**08.06.2015 в 15.00**

**в здании Пуховичского районного исполнительного комитета (зал заседаний) по адресу: г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47**

## СОСТОИТСЯ АУКЦИОН ПО ПРЕДОСТАВЛЕНИЮ В АРЕНДУ ОХОТНИЧЬИХ УГОДИЙ ФОНДА ЗАПАСА ПУХОВИЧСКОГО РАЙОНА, ДВУХ ОБОСОБЛЕННЫХ УЧАСТКОВ НА СРОК 10 ЛЕТ.

*Аукцион будет проходить в порядке, определенном пунктом 17 Положения о порядке проведения торгов по предоставлению в аренду охотничьих угодий фонда запаса.*

**Участок №1 общей площадью 24 806 га** (лесных 13 572 га, полевых 9 069 га, водно-болотных 2 165 га) в границах:

на севере – от пересечения административной границы Узденского района с северной границей квартала № 22 Валерьянского лесничества ГЛХУ «Узденский лесхоз», далее на юг до дороги Рыбоковщина – Дудичи (западная просека квартала № 3 Сергеевичского лесничества ГЛХУ «Пуховичский лесхоз»), далее по этой дороге на северо-восток через дер. Дудичи до р. Птичь;

на востоке – по р. Птичь на юг вниз по течению до юго-восточного угла квартала № 58 Шацкого лесничества ГЛХУ «Пуховичский лесхоз»;

на юге – от пересечения автомобильной дороги Р-68 Пуховичи–Узда–Негорелое с административной границей между Пуховичским и Узденским районами на восток по указанной дороге до дер. Старинки, далее на северной стороне кварталов № 21, 22 Шацкого лесничества ГЛХУ «Пуховичский лесхоз» до русла р. Птичь, далее по руслу р. Птичь до юго-восточного угла квартала № 58 Шацкого лесничества ГЛХУ «Пуховичский лесхоз»;

на западе – от пересечения автомобильной дороги Р-68 Пуховичи–Узда–Негорелое с административной границей между Пуховичским и Узденским районами на север по указанной административной границе до северной границы квартала № 22 Валерьянского лесничества ГЛХУ «Узденский лесхоз».

Начальная цена объекта торгов участок № 1 – 88 454 700 (восемьдесят восемь миллионов четыреста пятьдесят четыре тысячи семьсот) белорусских рублей.

Задаток вносится в размере 20% начальной цены объекта аукциона и составляет 17 690 940 (семнадцать миллионов шестьсот девяносто тысяч девятьсот сорок) белорусских рублей.

**Участок № 2 общей площадью 36 719 га** (лесных 25 157 га, полевых 9 881 га, водно-болотных 1 681 га) в границах:

на севере – от пересечения автомобильной дороги Р-68 Пуховичи–Узда–Негорелое с административной границей между Пуховичским и Узденским районами на восток по указанной дороге до дер. Старинки, далее по северной стороне кварталов № 21, 22 Шацкого лесничества ГЛХУ «Пуховичский лесхоз» до русла р. Птичь, далее по руслу р. Птичь до юго-восточного угла квартала № 58 Шацкого лесничества ГЛХУ «Пуховичский лесхоз»;

на востоке – от юго-восточного квартала № 58 Шацкого лесничества ГЛХУ «Пуховичский лесхоз» по дороге на дер. Омельно через дер. Песчанка и дер. Липники до квартала № 32 Омельнянского лесничества ГЛХУ «Пуховичский лесхоз», далее на юг по восточной просеке кварталов № 32,42,53,62,73,78 Омельнянского лесничества ГЛХУ «Пуховичский лесхоз», далее через р. Птичь (дер. Выемка) до административной границы Стародорожского района;

на юге – по административной границе Стародорожского района на юго-запад до административной границы Слуцкого района, далее на северо-запад по административной границе Слуцкого района до административной границы Узденского района;

на западе – по административной границе между Пуховичским и Узденскими районами на север до пересечения с автомобильной дорогой Р-68 Пуховичи–Узда–Негорелое.

Начальная цена объекта торгов участок № 2 –151 456 500 (сто пятьдесят один миллион четыреста пятьдесят шесть тысяч пятьсот) белорусских рублей.

Задаток вносится в размере 20% начальной цены объекта аукциона и составляет 30 291 300 (тридцать миллионов двести девяносто одна тысяча триста) белорусских рублей.

Для участия, в аукционе юридическое лицо представляет следующие документы:

- заявление о предоставлении охотничьих угодий в аренду, к которому прилагаются карта (схема), материалы с описанием границ, указанием общей площади и площади по категориям охотничьих угодий, испрашиваемых в аренду, биолого-экономическое обоснование охотничьих угодий, оформленные с учетом требований законодательства;
- копию учредительных документов.
- заверенная банком копия платежного поручения, подтверждающего внесение суммы задатка на расчетный счет ГУ МФ Республики Беларусь по Минской области, УНП 600537220, расчетный счет 3600625000021, филиал № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк г. Минск», код 601, назначение платежа 04002.

Участник, выигравший аукцион, в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола комиссии возмещает затраты на организацию и проведение аукциона:

сумму оплаты за работу по определению площадей охотничьих угодий фонда запаса Пуховичского района;

сумму оплаты за публикацию в печатном средстве массовой информации извещения о проводимых торгах.

Участникам, не выигравшим аукцион, задаток возвращается в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона.

Претенденты на участие в аукционе с объектом аукциона знакомятся самостоятельно.

**Документы для участия в торгах принимаются в Пуховичском районном исполнительном комитете по адресу: г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, каб. 112, тел. 8 (01713) 35865.**

**Окончательный срок приема документов – 02.06.2015.**

Минский областной исполнительный комитет заключает с победителем аукциона договор на условиях, определенных в договоре аренды охотничьих угодий, сроком на 10 лет после принятия в соответствии с пунктом 18 Правил ведения охотничьего хозяйства и охоты, утвержденных Указом Президента Республики Беларусь от 8 декабря 2005 г. № 580 «О некоторых мерах по повышению эффективности ведения охотничьего хозяйства и рыбохозяйственной деятельности, совершенствованию государственного управления ими» решения Минского областного исполнительного комитета и оплаты победителем аукциона цены продажи объекта аукциона, возмещения победителем аукциона затрат на организацию и проведение аукциона.

С проектом договора аренды охотничьих угодий можно ознакомиться на официальном сайте Пуховичского районного исполнительного комитета **http://pukhovichi.minsk-region.by.**

Победитель аукциона принимает обязательства по обеспечению преимущественного права на охоту дееспособным гражданам Республики Беларусь, достигшим 18 лет, а также дееспособным иностранным гражданам и лицам без гражданства, постоянно проживающим на территории Республики Беларусь и имеющим вид на жительство, имеющим действительное государственное удостоверение на право охоты, и зарегистрированным по месту жительства в населенных пунктах, расположенных в границах охотничьих угодий.

**Контактный телефон 8 (01713) 35865.**

# ЧАРОЎНАЕ СВЯТЛО СТЭФАНІІ



**Як жа я ўдзячная лёсу за тое, што мне пашанцавала стаць хоць кропелькай у жыцці гэтай вялікай актрысы!.. Са Стэфаніяй Міхайлаўнай Станютай мы пазнаёміліся ў Віцебску, летам 1990 года, калі Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы прыехаў з гастролямі ў наш абласны цэнтр. Тут яна радавала мясцовых тэатралаў выкананнем ролі Мод у спектаклі «Гаральд і Мод», пастаўленым тады яшчэ зусім маладым рэжысёрам Мікалаем Пінігіным.**

Я НЕ тэатральны крытык і не магу вось так «па костачках» разабраць спектакль. Я проста глядачка, звычайная глядачка. Эмацыянальная і даверлівая, якая прагне даведацца нешта новае, акунуцца ў свет мастацтва, сустрэцца з чужым жыццём. Можа, нават яго пражыць, калі да гэтага вымусіць майстэрская ігра сапраўдных мастакоў. Я плачу з імі і смяюся, пакутую і радуюся. Выбіраю сабе героя ці гераіню, якія імпануюць мне, і іду з імі да канца спектакля.

Так было і на гэты раз. Я выбрала Мод, графіню Мадлен. Узнёслую і такую зямную, дапытлівую і пяшчотную, са сваім успрыманнем падзей, што адбываюцца вакол яе, жартаўлівую і сур'ёзную, самазабыўную і самаахвярную. Яна вяла мяне разам з Гаральдам у свет сваіх захапленняў, чароўны свет паэзіі і музыкі, кахання і сапраўднага сяброўства, дабрыні і любові да ўсяго, што ёсць на зямлі, вучыла не зважаць на нейкія часовыя цяжкасці, што бываюць у жыцці кожнага чалавека, не схіляць галаў пад ударамі лёсу, забіваць у сабе раба. Яна ператварыла Гаральда з бяздумнага васемнаццацігадовага юнака з яго недарэчнымі жартамі (накшталт вытанчаных псеўдасамазабойстваў) у высокаадухоўленую асобу, здольную нават кахаць. Так! Да сустрэчы з Мод гэтае пачуццё яму было невядома; нявесты, якіх сыну «паставіла» маці, не цікавілі яго. А вось Мод... Гэтая 80-гадовая жанчына — язык не паварочваецца сказаць «бабуля» — зачаравала Гаральда. Ён прапануе ёй руку і сэрца. Але... позна. Позна таму, што Мод даўно вырашыла ў дзень свайго 80-годдзя памерці. І гэтае рашэнне яна выконвае: за некалькі хвілін да прыходу Гаральда прымае атрутныя таблеткі. Гора юнака невымернае. Ён так пакутуе, што сэрца разрываецца, бачачы яго пакуты.

І тады ў мяне ўзнікае падазрэнне, што Мод не такая добрая, як здаецца да апошніх хвілін спектакля. Яна не мела права пакідаць Гаральда на гэтым свеце аднаго-аднюткага, акружанага натоўпам людзей, якія яго не разумеюць. Ды і не хочуць разумець. Звыкшыся з яго «жартамі», яны не звяртаюць на юнака ўвагі.

Пранізала думка: Мод здрадзіла Гаральду, здрадзіла сваёй смерцю. Прыручыла яго і пакінула. Узгадалася фраза з казкі Антуана дэ Сент-Экзюперы «Маленькі прынц»: «Ты назаўсёды ў адказе за тых, каго прыручыў». Захацелася тут жа высветліць гэтае пытанне ў выканаўцы галоўнай ролі. І пасля спектакля разам з заслужанай артысткай БССР, актрысай тэатра імя Я. Коласа Людмілай Іванаўнай Пісаравай (на жаль, і яе ўжо няма сярод нас) мы зайшлі ў грымёрку да народнай артысткі СССР Стэфаніі Міхайлаўны Станюты. Я бачыла яе ў многіх кінафільмах, а ў спектаклях чамусьці не надаралася. І вось сустрэча! Вядома, актрыса была стомленая, таму размову мы адклалі.

А НАЗАЎТРА ў невялікім гасцінічным нумары я расказала Стэфаніі Міхайлаўне пра свае сумненні наконт Мод. Яе вельмі здзівіла мая думка. Яна сказала, што такое чуе ўпершыню і не зусім са мною згодна. Мод не памерла, яна проста перайшла ў іншы стан, у іншае вымярэнне; яна заўсёды будзе побач з Гаральдам: ён гэтага ніколі не заўважыць, але ўсё тое, што Мод дала яму за час кароткіх сустрэч, застанецца з ім назаўсёды. «А як жа каханне?!» — не згаджаюся я. Стэфанія Міхайлаўна пераконвае мяне ў тым, што маладыя вельмі хутка захапляюцца, але і хутка перастаюць кахаць. Так што ў Гаральда гэта пройдзе. "Дай Бог", — думаю я.

А размова перакінулася ўжо на іншае. Гаворым пра сучаснае мастацтва, тэатр, кіно. Згаджаемся, што ў кіно, ды і на сцэне, шмат натуралізму. Нават інтымнае, што магчыма толькі паміж дваімі, толькі для дваіх, выносіцца на ўсеагульны агляд. Сцэны гвалту, зубадрабільных боек, сексу — якое ж гэта мастацтва? Стэфанія Міхайлаўна кажа, што, можа, яна старамодная, але не разумее сённяшні кірунак мастацтва і такім яго не ўспрымае.

— А як вы сябе адчуваеце сярод маладых акцёраў, актрыс у тэатры імя Янкі Купалы? — пытаюся я.

— Такой жа, як яны. Нароўні. У мяне і думкі не ўзнікае, што я старэйшая за іх. Проста мы адзін калектыў, і нам разам працаваць. Усе разам і вырашаем, як лепш рабіць спектаклі.

— Вось вы, чалавек з велізарным не толькі жыццёвым, а і акцёрскім вопытам, сваю ролю іграеце, як бачыце яе, як адчуваеце? Ці цалкам падпарадкоўваецеся рэжысёру?

**І тады ў мяне ўзнікае падазрэнне, што Мод не такая добрая, як здаецца да апошніх хвілін спектакля. Яна не мела права пакідаць Гаральда на гэтым свеце аднаго-аднюткага, акружанага натоўпам людзей, якія яго не разумеюць.**

— Талент акцёра ў тым, каб сыграць так, як патрабуе гэтага ад яго рэжысёр. Рэжысёр бярэцца ставіць спектакль пасля таго, як прачытае п'есу, расставіць акцэнты, убачыць у думках цэласны спектакль, вызначыць акцёраў, якія здольны ўвасобіць яго задуму. Рэжысёр — гэта дырыжор, пад кіраўніцтвам якога п'еса набудзе закончанасць. А акцёры — музыканты, якія выконваюць сваю ролю на сваім інструменце. У выніку атрымліваецца зладжаны ансамбль, які з задавальненнем глядзяць і слухаюць. А што было б, калі б кожны іграў па-свойску ў аркестры? Бязглуздзіца!



Фота Анатолія КЛЕШЧУКА.

Стэфанія Міхайлаўна вядзе мяне да акна, паказвае раскладзеныя на шырокім падаконніку зробленыя яе рукамі пацеркі, кулоны, бранзалеты. Я стараюся ўгадаць, з чаго ж такая прыгажосць. І... памыляюся. Аказваецца, усё з прыроднага матэрыялу. Вось гэтыя пацеркі — з насення жоўтай акацыі і кавалачкаў шышак ліванскага кедра, гэтыя — з насення белай акацыі. Кулон — з матузка карычневай замшы і распіланага ўпоперак маньчжурскага арэха, пакрытага лакам. Бранзалет — з ачышчаных костачак фінікаў. І ўсё такое неардынарнае, прывабнае, што імгненна ахоплівае думка навучыцца рабіць такія ўпрыгажэнні і насіць самой, дарыць сябрам, як Стэфанія Міхайлаўна (і ў мяне захоўваецца яе падарунак.)

Потым мы разам доўга хадзілі па Віцебску. Стэфанію Міхайлаўну пазнавалі. Яна бянтэжылася, калі яе спынялі і гаварылі кампліменты. А адзін паклоннік на праспекце Фрунзэ кінуўся да Стэфаніі Міхайлаўны, схапіў яе за рукі і пачаў іх цалаваць, са слязьмі на вачах гаворачы словы падзякі, расказваючы пра сябе, запрашаючы яе дадому. Потым, не маючы пад рукою кветак, каб аддзячыць актрысе за тую асалоду, якую яна яму заўсёды прыносіць, выцягнуў з кішэні пакецік кавы ў зярнятах і спрабаваў перадаць ёй. Я разумела яго, разумела яго і Стэфанія Міхайлаўна, але ад кавы адмаўлялася. Я ўгаварыла яе ўзяць. Чалавеку трэба было нешта зрабіць у тую хвіліну для свайго куміра. Іншага ў яго не было, іншага ён не прыдумаў.

ВІЦЕБСК — горад і Стэфаніі Міхайлаўны. Маладзенькай актрысай пасля заканчэння Беларускай драматычнай студыі ў Маскве пад кіраўніцтвам В. Смышляева і С. Гіяцынтавай яна разам з выпускнікамі ўсяго курса ў 1926 годзе прыехала сюды — у Беларускі драматычны тэатр, які тады называлі БДТ-2. Наогул, успамінала Стэфанія Міхайлаўна, тады ў Віцебску вірвала культурнае жыццё. У той час тут стварала цэлая плеяда выдатных мастакоў. Людзі мастацтва згуртоўваліся, сустракаліся, перадавалі адзін аднаму часцінку свайго светаўспрымання. Хутка віцябляне ўбачылі на сцэне тэатра першыя спектаклі — народную драму «Цар Максімільян» у апрацоўцы Рэмізава і Міцкевіча, «Эрас і Псіхея» Жулаўскага, «Вакханкі» Эўрыпіда. Працавалі акцёры з поўнай аддачай сіл, захоплена і апантана. Гэта быў першы іх тэатр, месца, дзе яны маглі самавыявіцца. Адным словам, гэта было іх жыццё. Стэфанія Міхайлаўна памятала свае першыя ролі, не-не ды заспявае песню з «Цара Максімільяна» (там яна іграла Венеру), раскажа, як працавала над ролямі Псіхеі, Агавы з «Вакханак». Казала, што ўсё быццам учора было.

Выйшаўшы замуж, актрыса вымушана была паехаць з Віцебска ў горад свайго дзяцінства Мінск. Тут яна нарадзілася, хадзіла ў царкоўна-прыходскую школу, потым у гімназію, тут жылі яе родныя. Тата Міхаіл Пятровіч першым заўважыў у дачушкі талент пераўвасабляцца. Ды і наогул Стэфа была пластычная, з выдатным музыкальным слыхам, вельмі любіла танцаваць. Ужо ў 1919-м (а тады ёй было 14 гадоў) яна выйшла на сцэну ў Першым беларускім таварыстве драмы і камедыі Ф. Ждановіча. І таму бацька без ваганняў дазволіў ёй ехаць вучыцца ў Маскву на актрысу. З цеплынёй і павагай Стэфанія Міхайлаўна ўспаміала бацьку. Гэта напісаны ім «Партрэт дачкі» (які, дарэчы, захоўваецца ў мастацкім музеі Беларусі) па задуме Мікалая Пінігіна «ўдзельнічаў» у спектаклі «Гаральд і Мод». Цяга да прыгожага ў Стэфаніі ад бацькі. Дзякуючы свайму прыроднаму таленту і яго падтрымцы стала яна актрысай.

Прыехаўшы ў Мінск, Стэфанія Міхайлаўна ўладкавалася ў БДТ-1 — цяперашні Беларускі дзяржаўны драматычны тэатр імя Янкі Купалы — і з 1931 года і да канца жыцця (а пакінула нас легенда беларускай сцэны ў лістападзе 2000-га ва ўзросце 95 гадоў) не расставалася з ім. Колькі роляў сыграла — не палічыць! Зацыкленасці на нейкім амплуа ніколі не было. Рэжысёры дазвалялі ёй паказваць сябе з розных бакоў. Каго толькі яна ні іграла! Характарныя, камедыйныя, драматычныя ролі — усё было пад сілу таленту. Яе гераіні шчодрыя і чалавечныя, мудрыя і душэўныя. Ярка камедыйныя, востра сатырычныя вобразы ў выкананні Стэфаніі Станюты спалучаліся з высокім драматызмам, глыбокім псіхалагізмам, набылі закончанасць



дзякуючы яе эмацыянальнасці, выразнасці жэста, мімікі, слова, уменню карыстацца іроніяй, гратэскам. А хто не памятае фільмаў з яе удзелам! Нагадаю толькі некаторыя — «Белыя Росы», «Мама, я жывы!», «Трывожны месяц верасень», «Цешча», «Атланты і карыятыды», «Мы — хлопцы жывучыя», «Час выбраў нас», «Развітанне з Мацёрай» і многія-многія іншыя...

МЫ доўга гулялі па Віцебску. Мне прыемна было побач з Актрысай, слухаць яе. Ніводзін знаёмы мне чалавек не ведаў столькі, колькі ведала яна. Вечарам у яе быў спектакль, трэба было адпачыць. Ды і костачка на назе назалела ў яе вельмі зручным абутку. Мы купілі палавіну вялікага кавуна і пайшлі да яе ў гасцініцу «баляваць». Стэфанія Міхайлаўна прасіла прабачэння за тое, што няма чым мяне частаваць.

— Ведаеш, — казала яна мне, — якія я ў дзяцінстве прысмакі ела! Шакалад з рознай начынкай, вельмі смачны, прыгожа аформлены. Рознае печыва. Пальчыкі абліжаш! Праўда, гэта яшчэ да рэвалюцыі было. Дзе ўсё падзелася? Вось бы нам гэта на стол! Пачаставала б цябе як мае быць!

Але дарэвалюцыйных прысмакаў няма, і мы рэжам кавун. Ён крэкча пад нажом, распырскваючы чорныя зярняты.

— Я навучу цябе бабчынай прымаўцы, якую яна мне заўсёды паўтарала тры разы перад тым, як пакаштаваць нешта першы раз у сезон, — у вачах Стэфаніі Міхайлаўны загарэліся смяшлівыя агеньчыкі. — «Навіна ў рот, здароўе — у жывот, мядзведжая сіла, зайцоў паварот». Скажы тры разы — і ўсё будзе так.

Мы смяяліся, ласуючыся «навіной», потым размова перайшла на сур'ёзнае. Чаму людзі перасталі хадзіць у тэатр? Дзе, на якім этапе тэатр страціў гледача? Іграюць жа акцёры выдатна, і п'есы добрыя ставяць. 85-гадовая актрыса думала больш не пра сябе, а пра сваіх маладых калег. Як ім будзе працаваць у такой сітуацыі? Ды і наогул цяжэй становіцца. За свой зароблены рубель амаль нічога не купіш, даводзіцца «даставаць»... Дарэчы, назаўтра мы пайшлі з ёю «даставаць» белвестаўскія боты. Яны тады былі па талонах. Народную артыстку СССР загадчыца магазіна ўважыла, толькі папрасіла напісаць заяву з просьбай прадаць ёй абутак. Боты аказаліся вельмі зграбнымі і зручнымі. Стэфанія Міхайлаўна заўсёды дзякавала мне, казала, што ногі ў іх «як спяць», і костачку не намульваюць.

Потым, калі я была ў яе ў гасцях у сціплай кватэрцы, застаўленай кветкамі, па вуліцы Карастаянавай у Мінску, актрыса казала:

— Пашанцавала мне вельмі, як быццам для мяне напісалі п'есу французскія драматургі Хігінс і Кар'ер. Мод — мой агеньчык у канцы тунэля. Не ведаю, ці будзе ў мяне падобная роля. Роля, пры выкананні якой я здолела б так самавыявіцца. Гэта як іграць саму сябе. Разумееш? — і вочы яе зноў загарэліся.

РАЗУМЕЮ, яшчэ як разумею. Ад знаёмства, нават сяброўства са Стэфаніяй Міхайлаўнай засталося ў мяне адчуванне, быццам чысцюткай вадой умылася з той крыніцы, да якой яна мяне падвяла. Як яе Мод падвяла Гаральда да чыстага, светлага кахання.

**Таццяна КУЗЬМІЧ**, *г. Віцебск.*

■ Інфарм-укол

# Каб не нажыць праблем...

**З пачатку вясны ў краіне ўжо зарэгістравана каля 200 выпадкаў укусаў кляшчоў, а такія ўкусы пагражаюць клешчавымі інфекцыямі (барэліёзам і вірусным энцэфалітам). У краіне штогод выяўляецца звыш тысячы выпадкаў хваробы Лайма (клешчавы барэліёз) і звыш ста выпадкаў клешчавога энцэфаліту.**




Звычайна клешч чапляецца да адзення або цела чалавека і пачынае шукаць месца для ўкусу. Кляшча можна «прыхапіць» на палявых ці лясных кветках, галінках або іх прынясе на сабе любімы сабака. Заразіцца клешчавым энцэфалітам можна не толькі праз укус, але і праз ужыванне сырога казінага малака, нагадвае **энтамолаг Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Святлана ЯШКАВА.**

## ЯК АБАРАНІЦЦА?

**1.** Правільная апранацца, калі ідзеш у лес.

Куртка павінна быць з капюшонам, каўнер кашулі — бліжэй да цела, кашуля — запраўленая ў штаны і з доўгімі рукавамі. Штаны запраўляюць у боты, галаву і шыю закрываюць хусткай або кепкай. Адзенне павінна быць светлым, аднатонным.

**2.** Праз кожныя 1-2 гадзіны трэба аглядаць усё адзенне. Па вяртанні з лесу абавязкова трэба яшчэ раз агледзець адзенне і цела.

**3.** Не варта пасвіць коз у лясной зоне, абавязкова трэба аглядаць жывёлу ў пошуку кляшчоў. Малако ўжываць толькі гатаванае (2-3 хвіліны гатавання забіваюць вірус у малацэ).

**4.** Стаянкі ў лесе неабходна ладзіць на ўчастках без травы, на сухіх, добра прагрэтых сонцам палянах.

**5.** Варта карыстацца рэпелентамі — апрацоўваць гэтымі сродкамі адкрытыя ўчасткі цела, адзенне.

**6.** Для прафілактыкі клешчавага энцэфаліту існуе вакцына. Прышчапіцца могуць усе, хто працуе ў месцы прыродных ачагоў інфекцыі (напрыклад, у Нацыянальным парку «Белавежская пушча»), а таксама тыя, хто выязджае ў эндэмічныя па клешчавым энцэфаліце раёны Расіі (Прыўралле, Сібір, Далёкі Усход) і іншых краін. Супраць хваробы Лайма вакцына не распрацавана.

## ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ ЎКУСІЎ КЛЕШЧ?

Па-першае, як мага хутчэй выдаліць яго. Чым даўжэй клешч знаходзіцца ў вашым целе, тым вышэйшая верагоднасць заражэння. Можна звярнуцца па дапамогу ў траўматалагічны або хірургічны кабінет паліклінікі. Калі такой магчымасці няма, значыць, трэба дзейнічаць самастойна.

Можна ўзяць баваўняную нітку і завязваць у вузел як мага бліжэй да хабатка. Закручваючы канцы ніткі з дапамогай кругавога руху, вымаюць кляшча, пакрысе падцягваючы яго ўгору. Рэзкія рухі недапушчальныя.

Можна ўзяць пінцэт, прыхапіць ім кляшча бліжэй да хабатка і акуратна пачаць вымаць, варочаючы вакол восі ў зручны бок. Звычайна праз 1-3 абароты клешч выцягваецца цалкам. Нельга рабіць гэта рэзка.

Пасля выдалення скуру трэба апрацаваць настойкай ёду або 70-працэнтным спіртам і абавязкова звярнуцца да тэрапеўта, педыятра або інфекцыяніста па месцы жыхарства для атрымання прафілактычнага лячэння і ажыццяўлення медыцынскага назірання.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.21 | 20.53 | 15.32 |
| Віцебск — | 5.05 | 20.48 | 15.43 |
| Магілёў — | 5.11 | 20.43 | 15.32 |
| Гомель — | 5.13 | 20.33 | 15.20 |
| Гродна — | 5.37 | 21.07 | 15.30 |
| Брэст — | 5.43 | 21.02 | 15.19 |

## Месяц

*Апошняя квадра 11 мая. Месяц у сузор'і Казярога.*

## Імяніны

*Пр. Марка, Сяргея. К. Лізы, Віктара, Міхала, Пятра, Станіслава.*



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі — **8 МАЯ**

*Сусветны дзень Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца. Адзначаецца з 1953 г. па рашэнні Міжнароднай канферэнцыі Чырвонага Крыжа ў дзень нараджэння Анры Дзюнана (1828-1910), швейцарскага грамадскага дзеяча, ініцыятара стварэння Міжнароднага руху Чырвонага Крыжа (1863).*

*8-9 мая — Дні памяці і прымірэння, прысвечаныя памяці ахвяр Другой сусветнай вайны. Абвешчаны па рашэнні 59-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН 22 лістапада 2004 года па ініцыятыве краін СНД у сувязі 60-годдзем заканчэння Другой сусветнай вайны, якое адзначалася ў 2005 годзе.*

**1906** год — нарадзіўся Раберта Раселіні, італьянскі кінарэжысёр. У 1945 годзе ён зняў свой самы славуты фільм «Рым — адкрыты горад», за які быў уганараваны прэміяй Міжнароднага кінафестывалю ў Канах у 1946 годзе. Менавіта гэтая карціна стала маніфестам напрамку неарэалізму ў кіно. У 1946-м зняў карціну «Пайза», якая атрымала прэмію ў Венецыі. У 1949-м пачынае працаваць над фільмам «Страмболі» з Інгрыд Бергман у галоўнай ролі. Гэты раман паміж рэжысёрам і вялікай шведскай актрысай на працягу 10 гадоў бударажыў розумы еўрапейскай публікі. У Раселіні і Бергман нарадзіліся дзве дачкі і сын, прычым і рэжысёр, і актрыса знаходзіліся ў законных шлюбах з іншымі людзьмі. У 1958-м знята стужка «Індыя.1958», а ў наступным годзе — «Генерал «Дэла Раверэ», якая атрымала прэмію Венецыянскага кінафестывалю. У 1960-м рэжысёр атрымлівае прэмію фестывалю ў Карлавых Варах за карціну «У Рыме была ноч». З 1960-х гадоў Раселіні працуе ў асноўным на тэлебачанні, дзе ставіць фільмы пра вялікіх людзей — «Сакрат», «Блез Паскаль», «Дэкарт» і іншыя.



**1945** год — 70 гадоў таму ў Карлсхорсце (прыгарад Берліна) адбылося падпісанне акта аб безумоўнай капітуляцыі германскіх войскаў. Па маскоўскім часе гэта адбылося ўжо 9 мая ў 0:43. Але гістарычна гэты акт аб капітуляцыі не быў першым. Калі савецкія войскі акружылі Берлін, перад ваенным кіраўніцтвам Трэцяга рэйха паўстала пытанне аб захаванні рэштак Германіі. Гэта было магчымым, толькі пазбегнуўшы безумоўнай капітуляцыі. Тады было прынята рашэнне капітуляваць толькі перад англа-амерыканскімі войскамі, але працягваць баявыя дзеянні супраць Чырвонай Арміі. Немцы паслалі прадстаўнікоў да саюзнікаў для афіцыйнага пацвярджэння капітуляцыі. У ноч на 7 мая ў французскім горадзе Рэймсе быў заключаны акт аб капітуляцыі Германіі, згодна з якім з 23 гадзін 8 мая баявыя дзеянні спыняліся на ўсіх франтах. У пратаколе агаворвалася, што ён не з'яўляецца ўсёабдымным дагаворам аб капітуляцыі Германіі і яе ўзброеных сіл. Аднак Савецкі Саюз запатрабаваў безумоўнай капітуляцыі як адзінай умовы заканчэння вайны. Сталін лічыў падпісанне акта ў Рэймсе толькі папярэднім пратаколам і быў незадаволены, што акт аб капітуляцыі Германіі быў падпісаны ў Францыі, а не ў сталіцы дзяржавы-агрэсара. Тым больш што баявыя дзеянні на савецка-германскім фронце ўсё яшчэ працягваліся. Па патрабаванні кіраўніцтва СССР прадстаўнікі саюзнікаў паўторна сабраліся ўжо ў прыгарадзе Берліна і сумесна з савецкім бокам 8 мая 1945 года падпісалі яшчэ адзін акт аб капітуляцыі Германіі. Бакі дамовіліся, што першы акт будзе называцца папярэднім, а другі — канчатковым.

**1965** год — 50 гадоў таму званне Героя Савецкага Саюза пасмяротна прысвоена Уладзіміру Сцяпанавічу Амельянюку, ураджэнцу пасёлка Дно (Пскоўская вобласць), аднаму з арганізатараў і кіраўнікоў Мінскага падполля. У пачатку вайны апынуўся на акупаванай тэрыторыі ў Брэсце. Прабраўшыся ў Мінск, у 1941 годзе ўвайшоў у склад падпольнай групы, быў адным з рэдактараў першага нумара падпольнай газеты «Звязда» (май 1942 года), удзельнічаў у стварэнні падпольнай друкарні. Загінуў у 1942 годзе.

**Было сказана**

**Якуб КОЛАС, народны паэт Беларусі:**

*«Для смелых людзей няма бездарожжа».*

Продаю дешево пчелосемьи, пчелопакеты, ульи.
**Тел. 8 (044) 736-20-62, 8 (029) 303-21-19.**

Сёлетняя вясна прынесла Генеральнаму дырэктару ААТ «Белавежскі» Юрыю Дзмітрыевічу МАРОЗУ адначасова двайное свята — прысваенне звання «Чалавек года», а таксама юбілейны Дзень Перамогі — 9 Мая.
Віншую з гэтай урачыстай падзеяй.
Моцнага здароўя і ранейшага энтузіязму Вам у імя будучых працоўных перамог!
*З павагай, Аляксандр Іванавіч ПАЛАВОЙ, дырэктар сумеснага беларуска-расійскага Адкрытага Акцыянернага Таварыства «Белавежскія сыры».*
УНП 200193576

Віншуем нашых ветэранаў, а таксама ўсіх хлебаробаў **з юбілеем Перамогі,**
а шаноўнага Васіля Іванавіча ТАМІЛЬЧЫКА з прызначэннем на пасаду кіраўніка нашага сельгаспрадпрыемства.
Даўгалецця і шчасця вам усім!
***Дырэкцыя і прафкам КУСП «Маладая гвардыя» Брэсцкага раёна***
УНП 200034719

**У сувязі са святам наступны нумар газеты «Звязда» выйдзе ў панядзелак, 11 мая.**

Раковская птицефабрика РЕАЛИЗУЕТ НАСЕЛЕНИЮ
**ИНДЮШАТ** Биг-6 (Польша),
**ИНДЮКОВ** (90 дней),
**ЦЫПЛЯТ КУР НЕСУШЕК** (Хайсекс),
**КУР НЕСУШЕК** (Хайсекс) 360 дней.
МТС (8029) 573 36 22, Velcom (8029) 152 03 53. УНП 190593421

## УСМІХНЕМСЯ

Падыходзіць да рабочага загадчык склада і кажа:

— Ты ўжо тры месяцы ў нас працуеш і не можаш адрозніць першы гатунак ад другога!

— Але затое я зараз ведаю, што тона важыць 700 кілаграмаў!

**Аварыя на заводзе па вытворчасці суперклею. 25 чалавек пераведзены на кругласутачны пажыццёвы рэжым працы.**

Адэса, Прывоз:

— Нешта ў вас рыба нейкая непрыгожая, бледная...

— А што вы хочаце, мадам? Устала ў моры сёння рана, не паспела нафарбавацца.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.007. Індэкс 63850. Зак. № 1726.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 7 мая 2015 года.